ГАЛЕРЭЯ ЧАЛАВЕЧАЙ ДУМКІ

ЭДМУНД ГУСЭРЛЬ

# ФІЛАСОФІЯ ЯК ДАКЛАДНАЯ НАВУКА



ЭНЦЫКЛАПЕДЫКС

Галерэя чалавечай думкі

*Эдмунд Гусэрль*

# ФІЛАСОФІЯ ЯК ДАКЛАДНАЯ НАВУКА

Edmund Husserl

# Philosophie als strenge Wissenschaft

Tübingen
Verlag von F. C. B. Mohr
1911

Эдмунд Гусэрль

# Філасофія як дакладная навука

Пераклад з нямецкай
Лявона Баршчэўскага

Мінск
УП «Энцыклапедыкс»
2023

УДК 123
ББК 87.5(4Гем)
Г96

Серыя заснаваная ў 2001 годзе

Пераклад выкананы паводле крыніцы:
Edmund Husserl. *Philosophie als strenge Wissenschaft.* Mit einer Einleitung hrsg. von Eduard Marbach. Vittorio Klostermann GmbH, Frankfurt am Main, 1965.

*На вокладцы выкарыстана гравюра-пародыя Андрэя Фядорчанкі на карціну Ходлера «Дрывасек» (2017).*

**ISBN 978-985-7247-63-9**
©Баршчэўскі Л. П., пераклад на беларускую мову, 2023
©Афармленне. УП «Энцыклапедыкс», 2023

# ФІЛАСОФІЯ ЯК ДАКЛАДНАЯ НАВУКА

З самага моманту свайго ўзнікнення філасофія прэтэндавала на тое, каб быць дакладнаю навукай, і прычым навукай, якая б задавальняла самыя высокія тэарэтычным патрэбы, а з этычна-рэлігійнага гледзішча рабіла б магчымым жыццё, якое б магло рэгулявацца выключна рацыянальнымі нормамі. Гэтая прэтэнзія выяўляла сябе то з большым, то з меншым імпэтам, але ніколі не знікала. Не знікала нават і ў тыя часы, калі інтарэсы й здольнасці да чыстай тэорыі былі пад пагрозаю знікнення або калі рэлігійныя сілы абмяжоўвалі свабоду навукова-тэарэтычных даследаванняў.

Гэтыя прэтэнзіі на тое, каб быць дакладнаю навукай, філасофія не магла задаволіць ні ў адну эпоху свайго развіцця. Так яно ёсць і з апошняй эпохаю, якая, праходзячы, пры ўсёй разнастайнасці і процілегласці філасофскіх напрамкаў, у істотных рысах паслядоўны працэс развіцця, доўжыцца ад Адраджэння да цяперашняга часу. Што праўда, дамінантнаю рысай новай філасофіі ёсць менавіта тое, што замест таго, каб наіўна падпарадкоўвацца спакусе філасофствавання, яна праз пасярэдніцтва крытычнай рэфлексіі ды праз няспыннае паглыбленне даследаванняў пра метад, хутчэй, імкнецца сцвердзіць сябе ў якасці дакладнай навукі. Але адзіным сапраўдным плёнам гэтых намаганняў было абгрунтаванне і сцвярджэнне самастойнасці дакладных навук аб прыродзе і духу, таксама як і новых, чыста матэматычных дысцыплін. Сама ж філасофія нават у сваім

асаблівым сэнсе, які выкрышталізоўваецца толькі цяпер, была пазбаўленая, як і раней, характару дакладнай навукі. Нават сам сэнс гэтай адметнасці застаўся без надзейнага навуковага вызначэння...

Такім чынам філасофія, згодна са сваёй гістарычнай задумаю, ёсць найвышэйшаю і найдакладнейшаю навукай; увасабляючы спрадвечнае памкненне чалавецтва да чыстага і абсалютнага пазнання (і — што знаходзіцца з гэтым у непарыўнай сувязі — да чыстага і абсалютнага вызначэння Вартасці і Жадання), яна так і не можа сфарміравацца як сапраўдная навука. Прызнаная настаўніца ў вечнай справе гуманнасці, яна, як высвятляецца, наогул не мае здольнасці навучаць — навучаць аб'ектыўна рэлевантным чынам. Кант любіў выказвацца наконт таго, што можна навучыцца не філасофіі, а толькі філасофстваванню. Тады што гэта такое, як не прызнанне ненавуковасці філасофіі? Наколькі пашыраецца абсяг навукі, сапраўднай навукі, настолькі ж можна навучаць і вучыцца, і ўсюды ў аднолькавым сэнсе. Бо нідзе засваенне навукі не ёсць пасіўным успрыманнем чужога духу матэрыялу — яно ўсюды грунтуецца на самастойнасці, на ўнутраным раскрыцці рацыянальных высноў, зробленых з дапамогай творчага духу, паводле прычынна-выніковых сувязяў. Філасофіі нельга вучыцца з тае прычыны, што ў ёй няма такіх аб'ектыўна ўсвядомленых і абгрунтаваных ідэй, і таму — а гэта адно і тое самае, — што ёй яшчэ бракуе лагічна трывала вызначаных і, паводле свайго сэнсу, цалкам вырашаных праблем, метадаў ды тэорый.

Я не кажу, што філасофія — недасканалая навука, я проста кажу, што яна яшчэ не навука, што яна яшчэ не пачалася як навука, і я бяру ў якасці крытэру фрагмент, хоць і невялікі, аб'ектыўна абгрунтаванага тэарэтычнага зместу

аднаго курса. Усе навукі недасканалыя, нават прыватныя навукі, якія вельмі шануюцца. З аднаго боку, яны няпоўныя, з іх бясконцым гарызонтам адкрытых праблем, якія ніколі не даюць супакою імкненню да пазнання; з другога боку, у іх ёсць розныя хібы ў змесце навучання, які ўжо быў распрацаваны; ёсць рэшткі неадназначнасці або недасканаласці ў сістэматычным парадку доказаў і тэорый. Але, як прынята, ёсць пэўны тэарэтычны змест, які пастаянна пашыраецца і разгаліноўваецца. Ніводзін разумны чалавек не будзе сумнявацца ў аб'ектыўнай праўдзівасці або аб'ектыўна апраўданай верагоднасці выдатных тэорый матэматыкі і прыродазнаўчых навук. Тут — па вялікім рахунку — няма месца прыватным «меркаванням», «поглядам», «пунктам погляду». У той ступені, у якой гэткія рэчы недзе яшчэ існуюць у дэталях, навука яшчэ не стала завершанаю, але такою становіцца і ў цэлым паўсюдна ацэньваецца як такая[1].

[1] Зразумела, я не маю на ўвазе філасофска-матэматычную і натурфіласофскую праблематыку, якая пры больш пільным разглядзе датычыцца не толькі асобных момантаў зместу навучання, але «сэнсу» ўсёй навуковай каштоўнасці гэтых дысцыплін. Яны могуць і павінны заставацца адрознымі ад саміх дысцыплін, бо дастаткова абыякавыя да большасці іх прадстаўнікоў. Магчыма, слова «філасофія» ў сувязі з назвамі ўсіх навук азначае пэўны род даследаванняў, якія надаюць ім нейкае новае вымярэнне і, такім чынам, канчатковую дасканаласць. Але слова «вымярэнне» паказвае адначасова, што: дакладная (*streng*) навука застаецца навукай, змест навучання застаецца зместам навучання, нават калі пераход да гэтага новага вымярэння яшчэ не адбыўся. — *Заўв. аўтара.*

Недасканаласць філасофіі карэнным чынам адрозніваецца ад недасканаласці ўсіх толькі што апісаных навук. Яна не мае адно няпоўную і толькі ў дэталях недасканалую тэарэтычную сістэму — а не валодае зусім ніякай. У ёй спрэчнае ўсё і ўсялякае, кожнае сцверджанне — справа індывідуальнага пераканання, адпаведнага паасобнай школе погляду, «гледзішча».

Тое, што навуковая сусветная філасофская літаратура старых і новых часоў прапануе нам у выглядзе накідаў (Entwürfe), можа грунтавацца на сур'ёзнай, нават велізарнай інтэлектуальнай працы; мала таго, гэта можа пракласці шлях да будучага ўсталявання навукова дакладных тэарэтычных сістэм — але пакуль нішто ў іх не можа быць прызнана асновай філасофскай навукі, і няма ніякай перспектывы хоць бы нажніцамі крытыкі неяк сям ці там выкраіць кавалак філасофскай тэорыі.

Гэтае перакананне яшчэ раз павінна быць выказана жорстка і шчыра, і менавіта ў гэтым месцы, на пачатку *Логасу*, які хоча засведчыць істотны пераварот у філасофіі і падрыхтаваць глебу пад будучую «сістэму» філасофіі.

Бо разам з рэзкім акцэнтаваннем ненавуковага характару ўсёй папярэдняй філасофіі адразу ўзнікае пытанне, ці хоча філасофія па-ранейшаму захоўваць мэту быць дакладнай навукай, ці можа і павінна яна гэтага жадаць. Што для нас павінен азначаць новы «пераварот»? Адыход ад ідэі дакладнай навукі? І што для нас павінна значыць «сістэма», якой мы прагнем, якая павінна ззяць перад намі як ідэал у нізінах нашай даследчай працы? Філасофская «сістэма» ў традыцыйным разуменні, падобная да поўнай і ўзброенай Мінервы, якая выскоквае з галавы творчага генія, — каб у наступныя часы захоўвацца побач з іншымі гэткімі Мінер-

вамі ў ціхім музеі гісторыі? Або філасофская тэарэтычная сістэма, якая пасля велізарнай папярэдняй працы пакаленняў сапраўды пачынаецца знізу, з несумненнага падмурку і, як любая салідная структура, расце ўгару, гэтак як цаглінка за цаглінкаю дадаецца адна да адной як цвёрдая форма да цвёрдага ў кірунку, падказаным разважаннямі? На гэтым пытанні розумы й шляхі акурат павінны разысціся.

«Перавароты», вырашальныя для прагрэсу філасофіі, — гэта тыя, у якіх прэтэнзіі папярэдніх філасофій на навуку разбураюцца праз крытыку іх нібыта навуковага метаду (Verfahren); і цяпер тою сілай, якая кіруе і вызначае парадак працы, робіцца цалкам свядомая воля да радыкальнай перабудовы філасофіі ў сэнсе дакладнай навукі. Уся інтэлектуальная энергія спачатку сканцэнтраваная на тым, каб праз сістэматычны разгляд давесці да вырашальнай яснасці ўмовы існавання дакладнай навукі, якія дагэтуль наіўна ігнараваліся або няслушна разумеліся папярэдняй філасофіяй, каб потым паспрабаваць ад самага пачатку ўзвесці новую тэарэтычна-філасофскую пабудову. Такая цалкам свядомая воля да стварэння дакладнай навукі дамінуе ў сакратаўска-платонаўскім перавароце ў філасофіі, а таксама ў навуковых рэакцыях супраць схаластыкі, што ўзнікалі на пачатку Новага часу, — асабліва ў картэзіянскім перавароце. Яго імпульс распаўсюдзіўся на вялікія філасофскія вучэнні XVII і XVIII стагоддзяў, ён з самай радыкальнай моцай аднавіўся ў кантаўскай крытыцы розуму і яшчэ дамінаваў у філасофстваванні Фіхтэ. Даследаванне заўсёды нанова скіроўваецца да сапраўдных пачаткаў, рашучай пастаноўкі праблем, слушнага метаду.

Толькі ў рамантычнай філасофіі адбываецца змена. Хоць Гегель таксама настойвае на абсалютнай абгрунтаванасці

свайго метаду і вучэння, яго сістэме не хапае філасофска-навуковай прыроды крытыкі розуму, якая ў першую чаргу робіць магчымай навуковасць філасофіі. Аднак у сувязі з гэтым праўдай ёсць тое, што гэтая філасофія, як і рамантычная філасофія наогул, дзейнічала ў сэнсе або *аслаблення*, або *фальсіфікацыі* імкнення да стварэння дакладнай філасофскай навукі.

Што да апошняй, г. зн. схільнасці да фальсіфікацыі, то, як вядома, з узмацненнем прыватных навук гегельянства выклікала рэакцыю, у выніку якой *натуралізм* XVIII ст. праз свой скептыцызм, які адмовіўся ад усялякай абсалютнай ідэальнасці й аб'ектыўнасці вартасці (Geltung), дамінантным чынам вызначыў светапогляд і філасофію найноўшага часу.

З іншага боку, у сэнсе аслаблення імкнення да філасофскага навуковага пазнання гегелеўская філасофія мела наступствы праз сваю дактрыну адноснага апраўдання кожнай філасофіі для свайго часу — дактрыну, якая, што праўда, у межах сістэмы, што прэтэндавала на абсалютную сапраўднасць, мела зусім іншы сэнс, чым гістарыцыстычная, прынятая пакаленнямі, якія разам з верай у гегелеўскую філасофію таксама цалкам страцілі веру ў абсалютную філасофію. Вось жа, пераход гегелеўскай метафізічнай філасофіі гісторыі ў скептычны гістарыцызм істотным чынам абумоўлівае з'яўленне новай «філасофіі светапогляду», якая, відаць, хутка распаўсюджваецца ў наш час і, больш за тое, сама з яе пераважна антынатуралістычнай, а зрэдку нават антыгістарычнай, палемікай зусім не хоча быць скептычнай. Аднак, паколькі ў ёй больш не дамінуе — прынамсі, з гледзішча ўсёй сваёй задумы й працэдуры — тая радыкальная воля да стварэння навуковай тэорыі, што складала моцна

адметныя рысы сучаснай філасофіі аж да Канта, то ўсё сказанае вышэй пра аслабленне імкнення да філасофскага навуковага пазнання датычылася ў першую чаргу яе.

Наступныя тлумачэнні грунтуюцца на меркаванні, што найвышэйшыя інтарэсы чалавечай культуры патрабуюць развіцця дакладна навуковай філасофіі; што, калі філасофскі пераварот будзе ў наш час легітымным, ён у кожным выпадку павінен быць натхнёны намерамаднавіць абгрунтаванне філасофіі ў сэнсе дакладнай навукі. Гэты намер, прынамсі, не чужы сучаснасці. Ён цалкам жывы менавіта ў натуралізме, які пануе. Ад самага пачатку ён з усёй рашучасцю прытрымліваўся ідэі дакладна навуковай рэформы філасофіі й нават увесь час меркаваў, што ён ужо рэалізаваў яе як сваімі ранейшымі, так і сучаснымі здзяйсненнямі. Але ўсё гэта адбываецца, у прынцыпе, у форме, якая ў сваёй сутнасці хібная з гледзішча тэорыі, а прытым таксама на практыцы ўяўляе сабою ўсё большую небяспеку для нашай культуры. Стварэнне радыкальнай крытыкі натуралістычнай філасофіі сёння ёсць важнай справаю. У адрозненне ад чыста дэструктыўнай крытыкі наступстваў, патрэбная пазітыўная крытыка прынцыпаў і метадаў. Гэта адзіны спосаб захаваць непарушную ўпэўненасць у магчымасці навуковай філасофіі, якой пагражае прызнанне абсурдных наступстваў натуралізму, заснаванага на дакладнай эмпірычнай навуцы. Тлумачэнні першай часткі гэтай працы якраз служаць такой пазітыўнай крытыцы.

Але што да ўжо неаднаразова заўважанага перавароту нашай эпохі, то ён — і гэта яго права — па сутнасці, скіраваны антынатуралістычна, аднак пад уплывам гістарыцызму, здаецца, хоча адвесці нас ад лініі навуковай філасофіі і прывесці да простай светапогляднай філасофіі. Другая

частка будзе прысвечаная фундаментальнаму абмеркаванню розніцы паміж гэтымі дзвюма філасофіямі і разгляду іх адноснай слушнасці.

*Натуралістычная філасофія*

Натуралізм — гэта наступства адкрыцця прыроды, прыроды ў сэнсе адзінства прасторава-часавага быцця паводле канкрэтных прыродных законаў. З паступовым ажыццяўленнем гэтай ідэі ўва ўсё новых прыродазнаўчых навуках, заснаваных на праземернасці дакладных высноў, усё больш пашыраўся і натуралізм. Падобным чынам гістарызм пазней вырас як наступства «адкрыцця гісторыі» й заснавання ўсё новых гуманітарных навук. У адпаведнасці з дамінантнымі звычкамі ўспрымання прыродазнаўца схільны разглядаць усё як прыроду, гуманіст — як дух, як гістарычныя ўтварэнні ды, адпаведна, няслушна інтэрпрэтаваць тое, што гэтак разглядаць нельга. Такім чынам, натураліст, звяртаючыся да яго цяпер, у прыватнасці, не бачыць нічога іншага, акрамя прыроды, і найперш прыроды фізічнай. Усё, што існуе, або само фізічнае і належыць да маналітнай фізічнай прыроды, або гэта сапраўды псіхічнае, але тады гэта — проста залежная пераменная фізічнага, у найлепшым выпадку другасны «паралельны спадарожны факт». Усё бытнае мае псіхафізічную прыроду, выразна дэтэрмінаванае паводле нязменных законаў. Нічога істотнага для нас не мяняецца ў гэтай канцэпцыі, калі ў сэнсе пазітывізму (ці то абапіраючыся на натуралістычна інтэрпрэтаванага Канта, ці то абнаўляючы і паслядоўна развіваючы Х'юма) фізічная прырода сэнсуалістычна раскладаецца на комплексы адчуванняў, на колеры, тоны,

націскі і г. д., але таксама і так званае псіхічнае — на дапаўняльныя комплексы тых самых або яшчэ й іншых «адчуванняў».

Тое, што характарызуе ўсе формы скрайняга і паслядоўнага натуралізму, пачынаючы ад папулярнага матэрыялізму і сканчваючы найноўшым манізмам успрымання і энергетызмам, з аднаго боку, гэта — *апрыроджванне свядомасці*, што ўключае ўсе інтэнцыянальна-іманентныя свядомыя дадзенасці; з другога боку — *апрыроджванне ідэй* і, такім чынам, усіх абсалютных ідэалаў і нормаў.

З апошняга гледзішча ён, сам таго не ўсведамляючы, скасоўвае сябе. Калі за ўзорны паказчык любой ідэальнасці ўзяць фармальную логіку, то, як вядома, фармальна-лагічныя прынцыпы, так званыя мысленчыя законы, трактуюцца натуралізмам як законы прыроды мыслення. Тое, што гэта мае наступствам недарэчнасць, якая характарызуе кожную тэорыю, якая ёсць у поўным сэнсе скептычнаю, было намі падрабязна паказана ў іншым месцы[1]. Радыкальнай крытыцы гэткага кшталту можна таксама паддаць натуралістычную аксіялогію ды практычную ўжытковасць (Praktik), у тым ліку этыку, як і саму натуралістычную практыку (naturalistische Praxis), бо за тэарэтычнымі недарэчнасцямі непазбежна ідуць недарэчнасці (відавочныя неадпаведнасці) у актуальных тэарэтычных, аксіялагічных, этычных паводзінах. Агулам кажучы, натураліст у сваіх паводзінах — ідэаліст і аб'ектывіст. Ён напоўнены імкненнем навукова, гэта значыць абавязковым чынам для кожнага разумнага чалавека, давесці да ведама, што ёсць рэальная

[1] Гл. мае «Лагічныя даследаванні», т. 1 у выданні 1900 г. — *Заўв. аўтара.*

праўда, што існуе праўдзіва прыгожае і добрае паўсюды, як гэта можна вызначыць паводле яго агульнай прыроды, з дапамогай якога метаду гэта можна здабыць у індывідуальных выпадках. Ён мяркуе, што галоўная мэта была дасягнутая праз прыродазнаўчую навуку і прыродазнаўча-навуковую філасофію, і з усім імпэтам, які сілкуе гэта ўсведамленне, цяпер ён у якасці настаўніка і практычнага рэфарматара выступае за тое, што ёсць «прыродазнаўча-навукова» праўдзівым, добрым і прыгожым. Але ён ідэаліст, які фармулюе і нібыта абгрунтоўвае тэорыі, у якіх адмаўляецца якраз тое, што ён мае на ўвазе ў сваіх ідэалістычных паводзінах, калі выбудоўвае свае тэорыі — ці то адначасова апраўдваючы і рэкамендуючы пэўныя каштоўнасці або практычныя нормы як самыя прыгожыя і найлепшыя. Ён менавіта мае на ўвазе праз тое, што ён увогуле тэарэтызуе, што ён увогуле аб'ектыўна прызнае каштоўнасці, якім павінна адпавядаць каштоўнасная ацэнка, а таксама агульныя практычныя правілы, у адпаведнасці з якімі кожны павінен хацець і дзейнічаць. Натураліст вучыць, прапаведуе, маралізуе, рэфармуе[1]. Але ён адмаўляе тое, што́ мае на ўвазе паводле свайго сэнсу кожная казань, кожнае патрабаванне як такое. Ён проста не прапаведуе, гэтак як старажытны скептыцызм, *expressis verbis*: адзіна разумным ёсць адмаўляць розум — як тэарэтычны, так і аксіялагічны ды практычны розум. Больш за тое, ён нават рашуча адмовіўся б прыняць сцверджанні гэткага кшталту. Супярэчнасць здароваму сэнсу (Widersinn) у ім не адкрытая для яго, а схаваная ад яго менавіта ў тым, што ён здзяйсняе апрыроджванне розуму.

---

[1] Гекель і Оствальд могуць служыць прыкладамі выдатных прадстаўнікоў гэтага напрамку. — *Заўв. аўтара.*

У гэтым плане спрэчка сутнасна вырашаная, нават калі прыліўная хваля пазітывізму і прагматызму, які пераўвышае апошні ў рэлятывізме, уздымаецца ўсё вышэй і вышэй. Безумоўна, менавіта гэтая акалічнасць паказвае, наколькі малая практычна дзейсная сіла аргументаў з наступстваў. Забабоны вядуць да слепаты, і той, хто бачыць толькі эмпірычныя факты й прымае эмпірычную навуку як знутры сапраўдную, не будзе моцна турбавацца недарэчнымі наступствамі, якія нельга паказаць праз досвед як супярэчныя фактам прыроды. Ён адсуне іх убок як «схаластыку». Але аргументацыя, заснаваная на наступствах, можа лёгка займець фальшывае ўздзеянне на іншы бок, а менавіта на тых, хто ўспрымальны да яе ўдарнай сілы. У сувязі з тым, што натуралізм уяўляецца цалкам дыскрэдытаваным, а менавіта той, які хацеў сфарміраваць філасофію на падставе дакладнай навукі і ў якасці дакладнай навукі, яго метадычная мэта цяпер таксама выглядае як дыскрэдытаваная, і гэта тым больш, што існуе таксама шырока распаўсюджаная тэндэнцыя з гэтага боку, каб мець схільнасць думаць пра прыватную навуку толькі як пра пазітыўную навуку, а пра навуковую філасофію — толькі як пра заснаваную на такой навуцы. Аднак гэта таксама не больш як перадузятасць, і таму было б дарэшты няслушным жадаць адысці ад лініі дакладнай навукі. Менавіта ў той энергіі, з якой натуралізм імкнецца рэалізаваць прынцып дакладных навуковых метадаў ува ўсіх сферах прыроды і духу, у тэорыі і на практыцы, і з якой ён імкнецца навукова, на яго думку, «менавіта навукова», вырашаць філасофскія праблемы — у гэтай энергіі палягае яго заслуга і, у той жа час, знаходзіцца найбольшая частка яго сілы. Магчыма, ува ўсім сучасным жыцці няма больш магут-

най, больш скіраванай у сваім руху наперад ідэі, чым ідэя навукі. Яе трыумфальнаму шэсцю не перашкодзіць нішто. Яна сапраўды ўсёабдымная ў сваіх законных мэтах. Калі мысліць яе ў ідэальнай дасканаласці, гэта быў бы сам розум, які больш не мог бы мець аніякага аўтарытэту ані побач, ані над сабою. Вось жа, усе тэарэтычныя, аксіялагічныя і практычныя ідэалы, якія натуралізм фальсіфікуе шляхам эмпірычнага пераасэнсавання, таксама належаць да сферы дакладнай навукі!

Аднак агульныя перакананні мала што значаць, калі іх не апраўдваць, спадзяванні на навуку мала што значаць, калі не бачыць шляху да яе мэтаў. Такім чынам, каб ідэя філасофіі, як дакладнай навукі аб апісаных і ўсіх звязаных з імі праблемах, не заставалася бясплённай, мы павінны мець на ўвазе выразныя магчымасці яе рэалізацыі; праз высвятленне праблем, праз заглыбленне ў іх чысты сэнс, яны павінны навязаць нам адэкватныя метады, бо гэтага патрабуе сама іх сутнасць. Гэта тое, што мы мусім зрабіць і, такім чынам, заваяваць актыўны давер да навукі й адначасова стварыць яе сапраўдны пачатак. У гэтым аспекце ў прынцыпе карыснае і незаменнае (unentbehrlich) абвяржэнне натуралізму з наступстваў робіць для нас вельмі мала. Зусім інакш, калі мы крытыкуем яе асновы, яе метады й яе дасягненні, ужываючы неабходную пазітыўную і прытым заўсёды прынцыповую аргументацыю. Праводзячы падзелы й высвятляючы, прымушаючы нас шукаць сапраўдны сэнс філасофскіх матываў, якія як праблемы звычайна фармулююцца ў такой расплывістай і двухсэнсоўнай форме, крытыка здольная абудзіць уяўленні пра лепшыя мэты ды шляхі й пазітыўна прасоўваць нашу задуму. Маючы гэта на ўвазе, мы абмяркуем больш падрабязна характар філасофіі,

супраць якой мы змагаемся і на якой мы акцэнтавалі ўвагу вышэй, а менавіта — *апрыроджванне свядомасці*. Больш глыбокія сувязі з закранутымі скептычнымі наступствамі ўзнікнуць самі сабою ў далейшым, і тады стане зразумелым і апраўданым увесь абсяг (Weite) нашага другога папроку, датычнага апрыроджвання ідэй.

Зразумела, мы не звязваем наш крытычны аналіз з больш папулярнымі рэфлексіямі філасофствавання даследчыкаў прыроды, але маем дачыненне з вучонай (gelehrt) філасофіяй, якая выступае ў сапраўды навуковым рыштунку. У прыватнасці, аднак, нас цікавяць метад і дысцыпліна, дзякуючы якім, у сваім уяўленні яна нарэшце дасягнула рангу прыватнай навукі. Яна мае гэтулькі ўпэўненасці ў сабе, што паглядае на кожны іншы спосаб філасофствавання з паблажлівасцю. Гэткае філасофстваванне, на яе думку, стасуецца з яе ўласным канкрэтным навуковым філасофстваваннем гэтак жа сама, як змрочная філасофія прыроды эпохі Адраджэння — з поўнай маладой энергіі фундаментальнай (exakt) механікай Галілея або як алхімія — з фундаментальнай хіміяй Лавуазье. Вось жа, калі мы цяпер пытаемся аб прыватнай філасофіі — нават калі яна яшчэ абмежавана развітая, — якая ёсць аналагам фундаментальнай механікі, то мы спасылаемся на псіхафізічную, а асабліва *эксперыментальную псіхалогію*, якой ніхто не можа адмовіць у рангу дакладнай навукі. Гэта нібыта і ёсць спецыяльна-навуковая псіхалогія, якую так доўга шукалі й якая нарэшце стала рэальнасцю. Дзякуючы ім, маўляў, логіка і гнасеалогія, эстэтыка, этыка і педагогіка канчаткова атрымалі сваё навуковае абгрунтаванне і ўжо знаходзяцца ў працэсе трансфармацыі ў эксперыментальныя

дысцыпліны. Акрамя таго, дакладная псіхалогія, само сабою зразумела, мусіла б быць асновай усіх гуманітарных навук, і не ў меншай ступені — метафізікі. У дачыненні да апошняй, вядома, гаворыцца, што гэта не найважнейшая аснова, бо фізічная навука таксама ў такой жа ступені ўдзельнічае ў стварэнні гэтага самага агульнага вучэння аб рэчаіснасці.

Вось жа, прывядзем нашы пярэчанні наконт гэтага: перш за ўсё, як паказвае кароткае разважанне, відавочна, што псіхалогія ў цэлым, як навука пра факты, не прыдатная для стварэння падмурку для тых філасофскіх дысцыплін, якія маюць дачыненне з чыстымі прынцыпамі ўсяго ўнармавання, а гэта значыць — для чыстай логікі, чыстай аксіялогіі ды практычных ведаў. Мы можам пазбавіць сябе больш падрабязнага тлумачэння: гэта, відавочна, верне нас да тых недарэчнасцяў скептыцызму, пра якія ўжо вялася гаворка. Але што да тэорыі пазнання, якую мы аддзяляем ад чыстай логікі ў сэнсе чыстай *mathesis universalis*[1] (як такая яна не мае нічога агульнага з пазнаннем), то можна прывесці шмат аргументаў супраць эпістэмалагічнага псіхалагізму і фізіцызму; паасобныя з якіх будуць тут выкладзеныя ніжэй.

Уся прыродазнаўчая навука наіўная з гледзішча сваіх зыходных пунктаў. Прырода, якую яна хоча даследаваць, проста для яе існуе. Само сабою зразумела, што *існуюць* рэчы відавочныя, нерухомыя і рухомыя, якія змяняюцца ў бясконцай прасторы і, як часавыя рэчы, — у бясконцым часе. Мы іх успрымаем, апісваем, выкарыстоўваючы простыя эмпірычныя суджэнні. Распазнаць гэтыя самавідавочныя факты аб'ектыўна абгрунтаваным, дакладна

---

1 Універсальная матэматыка (*лац.*).

навуковым шляхам — вось мэта прыродазнаўчай навукі. Тое ж датычыцца і прыроды ў шырокім, псіхафізічным сэнсе, або тых навук, якія яе даследуюць, г. зн., у першую чаргу, псіхалогіі. Псіхічнае не ёсць светам само па сабе, яно даецца як «я» або пэўнае «я» як перажыванне (дарэчы, у зусім іншым сэнсе), і такія рэчы паказаныя, згодна з досведам, звязанымі з пэўнымі фізічнымі рэчамі, якія называюцца целамі. Гэта таксама дадзенасць. Задача псіхалогіі — навукова даследаваць гэтую псіхіку ў той псіхафізічнай цэласнасці прыроды, у якой яна натуральна існуе, вызначыць яе аб'ектыўна і абгрунтавана, выявіць заканамернасці яе самастанаўлення і саматрансфармацыі, яе ўзнікнення і сыходу. Любое псіхалагічнае вызначэнне ёсць eo ipso псіхафізічным, а менавіта ў тым самым шырокім сэнсе (якога мы будзем прытрымлівацца з гэтага моманту), што яна мае пабочнае значэнне, якое ніколі не бывае адсутным. Нават там, дзе псіхалогія — эмпірычная навука — мае на мэце вызначэнне простых з'яў свядомасці, а не псіхафізічных залежнасцяў у звыклым больш вузкім сэнсе, гэтыя з'явы ўсё яшчэ ўспрымаюцца як з'явы прыроды, г. зн. тыя, што належаць да свядомасці чалавека або жывёлы, якая, у сваю чаргу, мае самавідавочнае і ўспрыманае разам з ёю далучэнне да цела чалавека або жывёлы. Выключэнне дачынення з прыродай пазбавіла б псіхіку характару натуральнага факту, які можна аб'ектыўна і часава вызначыць, карацей кажучы, факту псіхалагічнага. Такім чынам, давайце прымем як вызначанае: кожнае псіхалагічнае суджэнне ўключае ў сябе экзістэнцыяльнае прызнанне наяўнасці фізічнай прыроды, відавочнае або не.

У гэтым святле праўдападобна выглядае наступнае: калі б былі вырашальныя аргументы, на падставе якіх фізічнае

прыродазнаўства не можа быць філасофіяй у спецыфічным сэнсе, яно ніколі не можа служыць падставаю для філасофіі й можа атрымаць філасофскае выкарыстанне толькі ў метафізічных мэтах як аснова папярэдняй філасофіі — тады ўсе такія аргументы павінны былі б знайсці непасрэдны ўжытак у псіхалогіі.

Цяпер жа такіх аргументаў зусім не бракуе.

Дастаткова прыгадаць тую «наіўнасць», з якой, паводле сказанага вышэй, прыродазнаўства прымае прыроду як дадзенасць, наіўнасць, так бы мовіць, неўміручую ў ёй і якая, напр., паўтараецца ў кожным пункце сваёй працэдуры, дзе яна адсылае да простага досведу — і ўрэшце, *любыя* эмпірычна-навуковыя метады прыводзяць да досведу. Прыродазнаўства, аднак, *па-свойму* вельмі крытычнае. Просты ізаляваны, нават калі й нагрувашчаны (gehäuft), досвед для яго значыць вельмі мала. У метадычным упарадкаванні й інтэграванні досведу, ува ўзаемадзеянні паміж пазнаваннем і мысленнем, якое мае свае лагічна фіксаваныя правілы, вылучаюцца сапраўдны й несапраўдны досвед, прытым кожны досвед атрымлівае сваю градуяваную вартасць сапраўднасці, і аб'ектыўна выпрацоўваецца сапраўднае пазнанне, пазнанне прыроды. Але наколькі б такая крытыка досведу ні задавальняла нас, пакуль мы застаемся *ў* прыродазнаўчай навуцы й мыслім у межах яе погляду, усё ж магчымая і неабходная цалкам іншая крытыка досведу — крытыка, якая ставіць пад сумнеў увесь досвед увогуле і адначасова эмпірычна-навуковае мысленне.

Тое, якім чынам досвед як свядомасць можа паказваць пэўны аб'ект або трапна цаляць у яго, якім чынам розныя досведы могуць узаемна сябе апраўдваць або папраўляць, а не толькі суб'ектыўна сябе ліквідаваць або суб'ектыўна

ўзмацняць; якім чынам кіраваная логікай досведу гульня свядомасці павінна сказаць нешта аб'ектыўна сапраўднае, што дзейнічае для рэчаў, якія існуюць самі па сабе і для сябе, чаму правілы гульні свядомасці не абыякавыя для рэчаў, як можа прыродазнаўства ўва ўсіх сваіх частках стаць зразумелым, як толькі яно на кожным кроку адмаўляецца меркаваць і пазнаваць прыроду, якая існуе ў сабе, у параўнанні з суб'ектыўнай плынню свядомасці — усё гэта робіцца загадкай, калі рэфлексія сур'ёзна звяртае ўвагу на гэтыя пытанні. Добра вядома, што тэорыя пазнання — гэта дысцыпліна, якая імкнецца адказаць на такога кшталту пытанні, і дагэтуль, нягледзячы на ўсю інтэлектуальную працу, якую ўклалі ў яе найвялікшыя даследчыкі, яна не дала выразнага, адназначнага, вычарпальнага навуковага адказу.

Патрабуецца толькі дакладная паслядоўнасць у падтрыманні ўзроўню гэтай праблематыкі (паслядоўнасць, якой, што праўда, не хапала ўва *ўсіх* папярэдніх тэорыях пазнання), каб убачыць *недарэчнасць* «навуковай тэорыі пазнання», а значыць і любой псіхалагічнай. Калі, агулам кажучы, пэўныя загадкі прынцыпова іманентныя прыродазнаўству, то іх разгадкі, вядома, прынцыпова трансцэндэнтныя з гледзішча пастулатаў і вынікаў. Чакаць, што вырашэнне кожнай праблемы, уласцівай прыродазнаўчай навуцы *як такой*,— інакш кажучы, уласцівай навуцы суцэльна, ад пачатку да канца, — будзе зыходзіць ад самой навукі, або нават толькі думаць, што яна можа стварыць хоць якія *перадумовы* дзеля вырашэння такой праблемы, то значыць недарэчна рухацца ў замкнёным коле.

Робіцца таксама відавочным, што як кожны навуковы, гэтак і кожны данавуковы падыход да прыроды ў тэорыі

пазнання, якая павінна захаваць свой адназначны сэнс, а таксама *ўсе* выказванні, якія імплікуюць *тэтычную*[1] экзістэнцыяльную рэчавасць з іх прасторай, часам, прычыннасцю і г. д., павінны быць выключаныя ў прынцыпе. Відавочна, што гэта таксама пашыраецца на ўсе экзістэнцыяльныя ўстаноўкі, што датычацца тут-быцця даследчыка, яго псіхічных здольнасцяў і да т. п.

Далей. Калі тэорыя пазнання ўсё ж збіраецца даследаваць праблемы стасункаў паміж свядомасцю і быццём, яна можа мець на ўвазе толькі быццё як карэлят свядомасці, як «каштоўнасна ацэненае» ў свядомасці: як успрынятае, узгаданае, чаканае, вобразна выяўленае, створанае фантазіяй, ідэнтыфікаванае, адрозненае, прынятае на веру, меркаванае, каштоўнасна ацэненае і г. д. Тады мы бачым, што даследаванне павінна быць скіраванае на навуковае пазнанне сутнасці свядомасці, на тое, чым «ёсць» сама свядомасць ува ўсіх яе адрозных выяўленнях, у адпаведнасці са сваёй сутнасцю, але, у той жа час, скіраванае на тое, што гэта «значыць», а таксама на розныя спосабы, якімі яна — у адпаведнасці з прыродай гэтых выяўленняў — то выразна, то незразумела, то самавыяўляючыся або ўяўляючы сабе, то сігнітыўна або вобразна, то беспасярэдне, то апасродкавана ў думцы, то ў кожным атэнцыянальным модусе, то ў незлічоных іншых формах — азначае штосьці прадметнае і, відавочна, «даказвае» гэта як «сапраўднае», «рэальна» бытнае.

Кожная разнавіднасць прадмета, які павінен быць аб'ектам рацыянальнага дыскурсу, данавуковага, а потым

1 Гэта значыць акты, якія змяшчаюць тэзу, датычную экзістэнцыі. — *Заўв. перакладчыка.*

і навуковага пазнання, мусіць выяўляць сябе ў ведах, гэта значыць у самой свядомасці, і, у адпаведнасці з сэнсам усіх ведаў, дазваляць сабе быць *дадзенасцю*. Усе тыпы свядомасці, калі яны класіфікуюцца тэлеалагічна, так бы мовіць, пад назвай пазнання і, канкрэтней, групуюцца ў адпаведнасці з рознымі катэгорыямі аб'ектаў — як групы кагнітыўных функцый, што ім адпавядаюць, — павінны быць даступныя да вывучэння ў іх сутнасным кантэксце і ў іх зваротным дачыненні да адпаведных ім формаў свядомасці дадзенасці. Такім чынам, неабходна дарэшты высвеціць сэнс праўнага пытання, якое трэба паставіць перад усімі актам пазнання, сутнасць добра абгрунтаванага выказвання правамоцнасці й ідэальнай магчымасці абгрунтавання або сапраўднасці, і гэта датычыць усіх узроўняў пазнання, а найбольш — пазнання навуковага.

Сэнс таго, што прадметнасць *ёсць* і што яна кагнітыўна ідэнтыфікуецца як існае ды існае гэткім чынам, павінен быць відавочным з самой свядомасці і, такім чынам, цалкам зразумелым. А дзеля гэтага патрабуецца вывучэнне ўсёй свядомасці, бо яна ўступае ў магчымыя кагнітыўныя функцыі паводле *ўсіх* сваіх утварэнняў. Але паколькі кожная свядомасць ёсць «свядомасцю адносна», вывучэнне сутнасці свядомасці таксама ўключае ў сябе вывучэнне значэння свядомасці й прадметнасці свядомасці як такой. Вывучаць любую разнавіднасць прадметнасці ў адпаведнасці з яе агульнай сутнасцю (даследаванне, якое можа пераследаваць інтарэсы, далёкія ад тэорыі пазнання і даследавання свядомасці) — гэта значыць шукаць яе модусы дадзенасці і вычэрпваць яе сутнасць у звязаных з ёю працэсах «высвятлення». Нават калі тут у цэнтры ўвагі не спосабы свядомасці ды іх сутнаснае даследаванне, метад

высвятлення тым не менш азначае, што нават пры гэтым нельга абысціся без разважанняў над спосабамі звычайнасці й дадзенасці. У кожным разе, наадварот, высвятленне ўсіх асноўных тыпаў прадметнасці неабходнае для сутнаснага аналізу свядомасці і, такім чынам, уключанае ў яго — але найперш у эпістэмалагічным аналізе, які бачыць сваю задачу ў даследаванні карэляцый. Адпаведна, мы разглядаем усе такія даследаванні, хоць і адносна асобныя, пад назвай *фенаменалагічных*.

Такім чынам, мы сутыкаемся з навукай — пра яе велізарны абсяг сучаснікі яшчэ не маюць уяўлення, — якая сапраўды з'яўляецца навукай аб свядомасці, а не псіхалогіяй, фенаменалогіяй свядомасці — у адрозненне ад *прыродазнаўчай навукі аб свядомасці*. Паколькі мы тут не маем дачынення з выпадковым супадзеннем назваў, варта загадзя чакаць, што фенаменалогія і псіхалогія павінны быць вельмі шчыльна звязанымі, бо абедзве маюць дачыненне са свядомасцю, хоць і рознымі спосабамі й пры розных «трактаваннях» (Einstellungen); што́ мы можам выказаць, дык гэта сцвердзіць наступнае: псіхалогія мае дачыненне з «эмпірычнай свядомасцю», са свядомасцю ў досведным трактаванні як тут-быцця ў кантэксце прыроды; а з другога боку, фенаменалогія павінна дачыняцца з «чыстай» свядомасцю, г. зн. як свядомасць у фенаменалагічным трактаванні.

Калі гэта слушна, нам можа падацца, што нягледзячы на відавочную рэч, што псіхалогія не ёсць і не можа быць філасофіяй, як і фізічнае прыродазнаўства, то з істотных прычын яна павінна быць бліжэйшай да філасофіі — а менавіта праз пасярэдніцтва фенаменалогіі — і павінна заставацца шчыльна пераплеценай з ёю ў сваім лёсе.

Урэшце, можна было б загадзя прадбачыць, што кожная псіхалагічная тэорыя пазнання павінна паўстаць таму, што, ігнаруючы сапраўднае значэнне эпістэмалагічнай праблематыкі, яна трапляе, як мяркуецца, ў відавочную блытаніну паміж чыстай і эмпірычнай свядомасцю, або (што азначае тое самае) што чыстая свядомасць «натуралізуецца».

Такое, папраўдзе, маё меркаванне, і гэта будзе тэмай майго далейшага шукання пэўных тлумачэнняў.

Тое, што толькі што было прамоўлена ў агульных рысах, і, у прыватнасці, тое, што было сказана адносна блізкага сваяцтва псіхалогіі ды філасофіі, вельмі мала адпавядае *сучаснай прыватнай псіхалогіі*, якая нагэтульки чужая філасофіі, наколькі гэта магчыма. Але незалежна ад таго, наколькі гэтая псіхалогія можа лічыць сябе адзіна навуковай дзеля эксперыментальнага метаду і можа пагардліва глядзець на «псіхалогію за пісьмовым сталом», я павінен заявіць, што меркаванне, нібыта гэта і ёсць псіхалогія, псіхалагічная навука ў поўным сэнсе гэтага слова, памылковае і цягне за сабою сур'ёзныя наступствы. Асноўная рыса, уласцівая гэтай псіхалогіі, — гэта адхіленне любога непасрэднага і чыстага аналізу свядомасці — а менавіта, сістэматычнага «аналізу» і «апісання» фактаў, якія адкрываюцца ў розных магчымых кірунках іманентнага сузірання — на карысць усіх тых ускосных фіксацый псіхалагічных або псіхалагічна рэлевантных фактаў, якія маюць хоць бы вонкава зразумелы сэнс без такога аналізу свядомасці. Дзеля эксперыментальнага вызначэння сваіх псіхафізічных заканамернасцяў ёй дастаткова груба акрэсленых паняццяў, такіх як успрыманне, уяўнае сузіранне, канстатацыя, злічэнне і пералічэнне, ацэнка велічыні, распазнаванне, чаканне,

захоўванне, забыццё і г. д.; як, вядома, і наадварот, запас такіх паняццяў, якімі яна апераруе, абмяжоўвае яе пастаноўку пытанняў і даступныя ёй сцверджанні.

Можна, відаць, сказаць, што эксперыментальная псіхалогія звязаная з арыгінальнай псіхалогіяй гэтак жа сама, як сацыяльная статыстыка звязаная з арыгінальнай сацыяльнай навукай. Такая статыстыка збірае каштоўныя факты, выяўляе ў іх каштоўныя заканамернасці, але тыя, што маюць вельмі ўскосны характар. У той самы час іх інтэрпрэтацыйнае разуменне, іх рэальнае тлумачэнне можа быць здзейсненае толькі арыгінальнай сацыяльнай навукай, г. зн. тою сацыяльнай навукай, якая разглядае сацыялагічныя феномены як наўпроставую дадзенасць і вывучае іх сутнасць. Падобным чынам, эксперыментальная псіхалогія — гэта метад выяўлення відавочна каштоўных псіхафізічных фактаў і правілаў, які, аднак, не мае магчымасці дасягнуць больш глыбокага разумення і мець паўнавартаснае навуковае значэнне без сістэматычнай навукі аб свядомасці, якая іманентна даследуе псіхічнае.

Тое, што тут мы натыкаемся на вялікую хібу ў яе метадзе, не даходзіць да свядомасці прыватнай псіхалогіі, не даходзіць тым болей, чым больш актыўна яна змагаецца супраць метаду саманазірання і чым больш энергіі ўкладае ў тое, каб пераадолець хібы *апошняга* з дапамогай эксперыментальнага метаду; але гэта значыць: пераадолець хібы таго метаду, які, як гэта можна давесці, зусім не належыць да таго, што тут трэба рабіць. Ціск рэчаў, што маюць менавіта псіхічную прыроду, выяўляецца, аднак, занадта моцным дзеля таго, каб аналіз свядомасці ўсё ж хоць бы дзе-небудзь не праслізнуў у даследаванне. Толькі яны ў гэтым выпадку звычайна вылучаюцца такой фенаменалагічнай

наіўнасцю, што знаходзіцца ў дзіўным кантрасце з той бясспрэчнай сур'ёзнасцю, з якой гэтая псіхалогія імкнецца да канкрэтнасці і ў пэўных сферах (пры памяркоўнасці сваіх вызначаных мэтаў) дасягае яе. Гэта здараецца там, дзе эксперыментальна ўсталяваныя вызначэнні датычацца суб'ектыўных пачуццёвых з'яў, апісанне і характарыстыка якіх павінна быць выкананая цалкам гэтак жа сама, як пры з'явах «аб'ектыўных», а менавіта без якога б там ні было ужывання паняццяў і вытлумачэнняў, што пераносяць нас уласна ў сферу свядомасці; далей, аднак, там, дзе гэтыя вызначэнні адносяцца да груба пазначаных класаў уласна псіхічнага, якія ад самага пачатку маюцца ў наяўнасці ў дастаткова вялікай колькасці і без глыбейшага аналізу свядомасці, у той меры, у якой мы адмаўляемся ад таго, каб пільна адсочваць уласна псіхалагічны сэнс гэтых вызначэнняў. Прычына ж немагчымасці ўлавіць усё радыкальна-псіхалагічнае ў выпадковых аналізах палягае ў тым, што толькі ў чыстай і сістэматычнай фенаменалогіі выразна праглядаецца сэнс і метад працы, якая павінна быць тут выкананая, гэтаксама як і велізарнае багацце разнавіднасцяў свядомасці, што без усялякіх адрозненняў перамешваюцца для метадычна неспрактыкаванага чалавека адна з адной. Такім чынам, сучасная прыватная псіхалогія менавіта таму, што лічыць сябе ўжо метадычна завершанай і дакладна навуковай, апынаецца *de facto* ненавуковай там, дзе яна жадае адсочваць сэнс таго псіхічнага, якое падпарадкоўваецца псіхафізічным заканамернасцям, г. зн. там, дзе яна хоча дамагчыся сапраўды псіхалагічнага разумення; гэтаксама як, наадварот, ува ўсіх тых выпадках, дзе хібы нявысветленых уяўленняў пра псіхічнае таксама прыводзяць, пры імкненні да глыбейшых пазнанняў, да не-

выразнай пастаноўкі праблем і тым самым да чыста ўяўных высноў. Эксперыментальны метад, як і ўсюды, недапушчальны і там, дзе ідзецца пра фіксаванне міжсуб'ектных сувязяў фактаў. Ён ужо мае на ўвазе тое, чаго не можа здзейсніць ніякі эксперымент, а менавіта аналіз самой свядомасці.

Тыя нешматлікія псіхолагі, якія, падобна да Штумпфа, Ліпса і навукоўцаў, блізкіх да іх, зразумеўшы гэтую хібу эксперыментальнай псіхалогіі, здолелі ацаніць сапраўды эпахальны штуршок, які зрабіў Брэнтана датычна псіхалагічнага даследавання, і таму намагаліся даць працяг пачаткам аналітычна-апісальных даследаванняў інтэнцыйных перажыванняў, што зыходзілі ад яго, або не атрымалі ніякай увагі з боку фанатыкаў эксперыментальнага метаду, або — у выпадках, калі яны займаліся эксперыментам — шанаваліся імі толькі з аднаго гэтага гледзішча. І вось, па-ранейшаму з імі ўсімі ідзе няспыннае змаганне як са схаластыкамі. Будучыя пакаленні будуць мець дастатковую нагоду дзівіцца той акалічнасці, што першыя новыя спробы сур'ёзна даследаваць іманентнае, і прытым даследаваць адзіна магчымым спосабам іманентнага (або, скажам лепш, сутнаснага) аналізу, маглі быць заклеймаваныя як схаластычныя, а потым адкінутыя ўбок. Гэта адбываецца толькі таму, што натуральным зыходным пунктам такога кшталту даследаванняў ёсць звычайныя ў мове вызначэнні псіхічнага, а пасля, пры адаптаванні (Einleben) да іх значэння, ставяцца пытанні да тых феноменаў, да якіх падобныя пазначэнні маюць напачатку цьмяныя і неадназначныя дачыненні. Вядома, схаластычны онталагізм таксама кіруецца мовай (праз гэта я не сцвярджаю, нібыта любое схаластычнае даследаванне было онталагічным), але яго па-

мылковасць палягае ў тым, што ён выводзіць са значэнняў слоў аналітычныя суджэнні ў перакананні, што гэтым способам дасягае ведання фактаў. Але ці павінна быць *з гэтай прычыны* пакладзена таўро схаластыка таксама і на фенаменалагічнага аналітыка, які з выказаных словам паняццяў не выводзіць наогул аніякіх суджэнняў, а толькі сузіральна пранікае ў тыя феномены, якія мова пазначае адпаведнымі словамі, або заглыбляецца ў тыя феномены, што ўяўляюць сабою цалкам навочную рэалізацыю паняццяў досведу, матэматычных паняццяў і г. д.?

Варта падумаць над тым, што ўсё псіхічнае, наколькі яно бярэцца ў той поўнай канкрэтнасці, у якой яно павінна быць першым аб'ектам даследавання для псіхалогіі, гэтаксама як і для фенаменалогіі, мае характар больш-менш складанага «ўсведамлення чагосьці»; што гэтае «ўсведамленне чагосьці» мае мноства формаў, якое бянтэжыць, што ўсе выразы, якія б маглі ў пачатку даследавання быць карыснымі для самаразумення і аб'ектыўнага апісання, зменлівыя і шматзначныя, і што, разам з тым, першым пачаткам можа, зразумела, быць не што іншае, як высвятленне галоўным чынам найгрубейшых двухсэнсоўнасцяў, якія кідаюцца ў вочы. Канчатковае фіксаванне навуковай мовы мае на ўвазе завершаны аналіз феноменаў, — мэта, якая ляжыць у імглістай далечы, — а пакуль гэта не зроблена, прагрэс даследавання, калі разглядаць яго з вонкавага боку, у істотнай ступені адбываецца у выглядзе выяўлення новых шматзначнасцяў, якія толькі цяпер робяцца заўважнымі — і прытым у форме выяўлення іх у паняццях, толькі ўяўна фіксаваных яшчэ ў папярэдніх даследаваннях. Гэта, відавочна, непазбежна, бо яно вынікае з самой прыроды рэчаў. Такім чынам тлумачыцца глыбіня разумення і грэблівая ацэнка, з якімі

запісныя ахоўнікі канкрэтнасці ды навуковасці псіхалогіі разважаюць пра «чыста вербальныя», чыста «граматычныя» і «схаластычныя» аналізы.

У эпоху жывога рэагавання супраць схаластыкі баявым воклічам было: далоў пустыя аналізы слоў. Мы павінны пытацца ў саміх рэчаў. Назад да досведу, да сузірання, якое адно толькі і можа надаць нашым словам сэнс і разумнае абгрунтаванне. Проста цудоўна! Але што такое тыя рэчы й што гэта за досвед, да якіх мы павінны звяртацца ў псіхалогіі? Хіба тымі рэчамі ёсць выказванні, якія мы атрымліваем ад паддоследных асоб падчас эксперыменту? І ці ёсць тлумачэнне іх выказванняў «досведам» адносна псіхічнага? Эксперыменталісты самі скажуць, што гэта толькі другасны досвед — першасны мае месца ў саміх паддоследных, а ў псіхолагаў, якія эксперыментуюць і інтэрпрэтуюць, яны фарміруюцца ў іх уласных ранейшых унутраных самаўспрыманнях, якія з істотных прычын не ёсць і не могуць быць саманазіраннямі. Эксперыменталісты ў немалой ступені ганарацца тым, што яны, як запісныя крытыкі саманазірання і — як яны кажуць — заснаванай выключна на саманазіранні «псіхалогіі пісьмовага стала», распрацавалі эксперыментальны метад такім чынам, што ён карыстаецца непасрэдным досведам толькі ў форме «выпадковых, нечаканых, не наўмысна прыцягнутых досведаў»[1] і цалкам выключае дыскрэдытаванае саманазіранне. Калі ў *адным* кірунку тут, нягледзячы на вялікія перабольшванні, і узнікае штосьці несумненна добрае, то, з іншага боку, варта прыняць да ўвагі адну, як мне падаецца, прынцыповую хібу гэтай псіхалогіі — а менавіта тое, што апошняя

[1] Гл.: Wundt. Logik II. 2a. Ausgabe. S. 170.

ставіць аналіз, які палягае ў апоры на разуменне чужых досведаў, а таксама і аналіз на аснове ўласных, у свой час не назіраных, перажыванняў нароўні з аналізам досведу (хоць бы нават і пасярэдняга) у фізічным прыродазнаўстве і дзякуючы гэтаму сапраўды мяркуе быць эмпірычнай навукай аб псіхічным у прынцыпова такім самым сэнсе, у якім фізічнае прыродазнаўства ёсць эмпірычнай навукай аб фізічным. Яна не заўважае спецыфічнай своеасаблівасці пэўных аналізаў свядомасці, якія трэба здзейсніць дзеля таго, каб ад наіўных досведаў — усё адно, прысвечаныя яны назіранню або не прысвечаныя, ці то ажыццяўляюцца ў межах актуальнай прысутнасці свядомасці, ці то ў межах успаміну або пранікнення адчуваннем (die Einfühlung) — маглі атрымацца досведы ў навуковым сэнсе. Паспрабуем высветліць гэта.

Псіхолагі мяркуюць, што ўсім сваім псіхалагічным пазнаннем яны абавязаныя досведу, г. зн. тым наіўным успамінам або пранікненням адчуваннем ува ўспаміны, якія з дапамогай метадычных сродкаў эксперыменту павінны зрабіцца асноўнымі для эмпірычных высноў. Аднак апісанне дадзенасцяў наіўнага досведу і спадарожныя ім іманентны аналіз ды лагічнае зразуменне здзяйсняюцца пры дапамозе пэўнага фонду паняццяў, навуковая каштоўнасць якіх мае вырашальнае значэнне для ўсіх далейшых метадычных крокаў. Гэтыя паняцці, як нам лёгка даводзяць пэўныя разважанні, паводле ўжо самой прыроды эксперыментальнай пастаноўкі пытання і метаду застаюцца зусім не кранутымі ў працэсе далейшых даследаванняў і разам з тым пераходзяць у канчатковыя вынікі, г. зн. у тыя навуковыя эмпірычныя суджэнні, што якраз і былі мэтай даследавання. Іх навуковая каштоўнасць не можа, з іншага боку,

быць у наяўнасці ад самага пачатку, яна не можа таксама ўзнікнуць з досведаў паддоследных асоб, не можа быць лагічна ўсталяваная эмпірычнымі палажэннямі: якраз тут і ёсць месца фенаменалагічнага сутнаснага аналізу, які не ёсць і не можа быць эмпірычным аналізам, як бы нязвыкла ды несімпатычна ні гучала гэта для натуралістычнага псіхолага.

З часоў Лока і дагэтуль перакананне, вынесенае з гісторыі развіцця эмпірычнай свядомасці (якое ўжо, такім чынам, прадугледжвае псіхалогію) пра тое, што любое паняццевае ўяўленне «паходзіць» з больш ранніх досведаў, змешваецца з зусім іншым перакананнем — а менавіта пра тое, што любое паняцце атрымлівае правы на сваё магчымае ўжыванне, напрыклад, у апісальных суджэннях, з досведу; а гэта значыць, што толькі *ў дачыненні* да таго, што даюць *сапраўдныя* ўспрыманні або ўспаміны, могуць быць знойдзеныя праўныя падставы для ацэнкі значнасці паняцця, для яго істотнасці або неістотнасці, а як вынік — і для яго ўжывальнасці ў дадзеным асобным выпадку. Апісваючы, мы ўжываем такія словы, як успрыманне, успамін, фантастычнае ўяўленне, выказванне і г. д. Якая маса іманентных складнікаў утрымліваецца ў адным такім слове — складнікаў, якія мы ўкладаем у тое, што апісваецца, асэнсоўваючы яго, хоць папярэдне аналітычна іх не знайшоўшы у ім. Ці дастаткова ўжываць гэтыя словы ў папулярным, цьмяным, зусім хаатычным сэнсе, які яны здабылі сабе невядомым чынам у «гісторыі» свядомасці? А калі б нават мы гэта і ведалі, то ўсё ж якую карысць магла б нам прынесці гэтая гісторыя, што́ магла б яна змяніць у той акалічнасці, што цьмяныя паняцці — менавіта цьмяныя і з прычыны гэтага ўласцівага ім характару цьмянасці — відавочна, нена-

вуковыя? Пакуль у нас няма лепшых паняццяў, мы можам ужываць і гэтыя, маючы на ўвазе тое, што ў іх заключаныя грубыя адрозненні, дастатковыя, аднак, для практычных мэтаў жыцця. Але ці можа выказваць прэтэнзіі на «дакладнасць» тая псіхалогія, якая пакідае без навуковага фіксавання, без метадычнай апрацоўкі тыя паняцці, што *вызначаюць* яе аб'екты? Вядома, яна здольная да гэтага ў такой жа малой ступені, як і тая фізіка, якая задавальнялася б звычайнымі паняццямі кшталту цяжару, цяпла, масы і г. д. Сучасная псіхалогія больш не хоча быць навукай аб «душы», але імкнецца стаць навукай аб «псіхічных феноменах». Калі яна гэтага жадае, то яна павінна апісаць і вызначыць гэтыя феномены з усёй лагічнай канкрэтнасцю. Яна павінна засвоіць у метадычнай працы неабходныя канкрэтныя паняцці. Дзе ж у «фундаментальнай» псіхалогіі гэтая метадычная праца выкананая? Мы марна шукаем яе ў велізарнай літаратуры.

Пытанне, якім чынам натуральны, «паблытаны» досвед можа зрабіцца досведам навуковым, якім чынам можна прыйсці да ўсталявання аб'ектыўна-значных эмпірычных суджэнняў, ёсць галоўным метадычным пытаннем любой эмпірычнай навукі. Яго не трэба ставіць і даваць на яго адказ *in abstracto* — і асабліва ў яго філасофскай чысціні, бо гістарычна яно знаходзіць ужо свой фактычны адказ, і менавіта наступным чынам: геніі, якія пракладаюць шляхі эмпірычнай навуцы *in concreto* ды інтуітыўна ўлоўліваюць сэнс неабходнага эмпірычнага метаду і, дзякуючы яго чыстаму ўжыванню у даступнай сферы досведу, выпрацоўваюць пэўную частку аб'ектыўна-значнага эмпірычнага вызначэння, ствараючы тым самым пачатак навукі. Матывамі сваёй дзейнасці яны абавязаныя не якому-небудзь адкрыццю,

а заглыбленню ў *сэнс* саміх досведаў, гэта значыць у сэнс дадзенага ў іх «быцця». Бо, нягледзячы на тое, што яно ёсць «дадзеным», яно ёсць «цьмяным» дадзеным у «нявызначаным» досведзе, з прычыны чаго настойліва напрошваецца пытанне: якім чынам яно існуе сапраўды, як яго можна вызначыць з аб'ектыўнай значнасцю; як — гэта значыць пры дапамозе якіх лепшых «досведаў», пры дапамозе якога метаду? Дзеля пазнання вонкавай прыроды першы рашучы крок ад наіўнага досведу да навуковага, ад цьмяных штодзённых паняццяў да навуковых паняццяў быў, як вядома, зроблены з поўнай дакладнасцю толькі Галілеем. Што да пазнання псіхічнага, сферы свядомасці, то, хоць мы і маем «канкрэтна-эксперыментальную» псіхалогію, якая з поўным перакананнем у сваім праве ставіць сябе нароўні з фундаментальным прыродазнаўствам, тым не менш, яна, зусім не ўсведамляючы гэтага, жыве галоўным чынам у дагалілееўскай эпосе.

Можа падацца дзіўным, што яна гэтага не ўсведамляе. Мы разумеем, што наіўнаму прыродазнаўству да ўзнікнення навукі натуральны досвед не здаваўся дастатковым ні ў чым такім, што б не магло быць спасцігнутым у межах самага натуральнага досведу, пры дапамозе натуральна-наіўных эмпірычных паняццяў. Яно не падазравала ў сваёй наіўнасці, што рэчы маюць прыроду і што гэтая прырода можа быць вызначана пры дапамозе вядомых канкрэтных паняццяў у доследна-лагічным працэсе. Але псіхалогія, з яе інстытутамі і дакладнымі апаратамі, з яе ўмела прыдуманымі метадамі, мае права адчуваць сваю вышэйшасць над узроўнем наіўных ведаў пра душу ранейшага часу. Да таго ж, яна не адчувала недахопу ў няспынных грунтоўных метадалагічных разважаннях. Як жа магло вымкнуць з-пад

яе ўвагі прынцыпова самае істотнае? Як яна магла недагледзець, што сваім чыста псіхалагічным паняццям, без якіх яна ніяк не можа абысціся, яна неабходным чынам надае змест, не ўзяты проста з сапраўды дадзенага ў досведзе, а прыкладзены да яго? Што яна непазбежна, паколькі падыходзіць бліжэй да сэнсу псіхічнага, здзяйсняе аналізы гэтых зместаў паняццяў і прызнае значнымі адпаведныя фенаменалагічныя сувязі, якія яна ўжывае датычна досведу і якія апрыёрныя ў дачыненні да досведу? Як яна магла недагледзець, што перадумовы эксперыментальнага метаду, наколькі яна сапраўды жадае стварыць псіхалагічныя веды, не могуць быць абгрунтаваныя ёй самою і што яе праца карэнным чынам адрозніваецца ад працы фізікі, паколькі гэтая апошняя менавіта прынцыпова выключае фенаменальнае, каб шукаць прыроду, што выяўляе сябе ў ёй, у той час як псіхалогія хоча быць менавіта навукай аб саміх феноменах?

Усё гэта магло і павінна было, аднак, вымкнуць з-пад яе ўвагі пры яе натуралістычнай скіраванасці ды пры яе схільнасці імкнуцца ўслед за натуральнымі навукамі й бачыць самае галоўнае ў эксперыментальнай працэдуры. У сваіх карпатлівых, часта вельмі дасціпных, разважаннях што да магчымасцяў псіхафізічнага эксперыменту, у стварэнні інструкцый для правядзення доследаў, у канструяванні найдасканалейшых апаратаў, у прасочванні магчымых крыніц памылак і г. д. яна, аднак, не паклапацілася пра тое, каб глыбей засяродзіцца на пытанні пра тое, якім чынам, пры дапамозе якога метаду могуць быць пераведзеныя са стану заблытанасці ў стан яснасці і аб'ектыўнай значнасці тыя паняцці, што маюць істотнае значэнне для псіхалагічных судженняў. Яна не паклапацілася пра

ацэнку таго, наколькі псіхічнае мае яму аднаму ўласцівую «сутнасць», якая павінна быць з поўнай адэкватнасцю даследаваная датычна любой псіхафізікі, замест каб быць выяўленнем пэўнай прыроды. Яна не высветліла таго, у чым палягае «сэнс» псіхалагічнага досведу і якія «патрабаванні» да метаду выстаўляе быццё ў сэнсе псіхічнага *само ад сябе*.

Тым, што ўвесь час уводзіла ў зман эмпірычную псіхалогію з часу яе зараджэння ў XVIII стагоддзі, было няпраўдзівае ўяўленне пра прыродазнаўчы метад на ўзор метаду фізічна-хімічнага. Пануе перакананне, што метад усіх эмпірычных навук, які разглядаецца ў яго прынцыповай ўсеагульнасці, адзін і той жа — і ў псіхалогіі, такім чынам, такі самы, што і ў навуцы аб фізічнай прыродзе. Доўгі час метафізіка пакутавала ад няслушнага пераймання то геаметрычнага, то фізічнага метаду; цяпер тое самае паўтараецца і ў псіхалогіі. Не пазбаўлены значэння той факт, што бацькі эксперыментальна-фундаментальнай псіхалогіі былі фізіёлагамі і фізікамі. Праўдзівы метад вынікае, аднак, з прыроды прадметаў, якія падлягаюць даследаванню, а не з нашых забабонаў ды прынятых намі ўзораў. Прыродазнаўства з нявызначанай суб'ектыўнасці рэчаў, дадзеных у наіўнай пачуццёвасці, выпрацоўвае аб'ектыўныя рэчы з канкрэтнымі аб'ектыўнымі ўласцівасцямі. А таму, кажуць, псіхалогія павінна прывесці псіхалагічную нявызначанасць наіўнага спазнання да аб'ектыўна-істотнага вызначэння, што і робіць аб'ектыўны метад, які, само сабой зразумела, ёсць не чым іншым, як тым эксперыментальным метадам, што ў рэальнасці бліскуча выявіў сябе незлічонымі здабыткамі ў прыродазнаўчай навуцы.

Між тым, спосаб, якім эмпірычныя звесткі прыводзяцца да аб'ектыўнага вызначэння, сэнс, які могуць мець паняцці «аб'ектыўнасць» і «вызначэнне аб'ектыўнасці», роля, якую можа ўзяць на сябе эксперыментальны метад, — усё гэта залежыць ад асаблівага сэнсу адпаведных звестак, ад таго, так бы мовіць, сэнсу, які ім надае паводле сваёй сутнасці адпаведны выгляд эмпірычнай свядомасці (як мысленне такога, а не іншага выгляду бытнага). Браць жа *ўзор* з прыродазнаўчых навук — значыць амаль непазбежна арэчаўляць свядомасць, што з самага пачатку ўводзіць нас у супярэчнасці, з якіх увесь час узнікае схільнасць да супярэчлівых пастановак праблем, да фальшывых напрамкаў даследаванняў. Разгледзім гэта бліжэй.

Прасторава-часавы цялесны свет адно толькі і ёсць прыродаю ў сапраўдным сэнсе гэтага слова. Любое іншае індывідуальна існае, псіхічнае тут-быццё ёсць прыродай у іншым, ужо не ўласным, сэнсе, і гэта вызначае ключавыя адрозненні прыродазнаўчага і псіхалагічнага метаду. Прынцыпова толькі цялеснае тут-быццё пазнаецца як індывідуальна тоеснае ў мностве непасрэдных досведаў, гэта значыць успрыманняў. Таму толькі яно адно можа пазнавацца шматлікімі суб'ектамі як індывідуальна тоеснае і апісвацца як інтэрсуб'ектыўна тое ж самае, у той час як успрыманні мысляцца як падзеленыя паміж рознымі «суб'ектамі», яны ўва ўсіх нас перад вачыма і могуць быць намі вызначаныя ў сваёй прыродзе. А прырода іх азначае наступнае: уяўляючыся ў досведзе ў шматстайна зменлівых «суб'ектыўных» з'явах, яны застаюцца, тым не менш, часавымі адзінствамі уласцівасцяў, якія доўжацца, або яны змяняюцца, застаюцца ўключанымі ў адну ўсёабдымную, якая іх *усе* аб'ядноўвае, сувязь Аднаго цялеснага свету з Адной прасторай,

Адным часам. Яны ёсць тым, *чым* яны ёсць, толькі ў гэтым адзінстве, толькі ў каўзальных узаемадачыненнях або лучнасці адно з адным яны захоўваюць сваю індывідуальную тоеснасць (субстанцыю) — захоўваюць яе як носьбітку рэальных уласцівасцяў. Усе рэальныя ўласцівасці — каўзальныя. Любая цялесна існая рэч падлягае законам магчымых змен, а гэтыя законы маюць на ўвазе тоеснае, рэч не саму па сабе, а рэч у прасякнутай адзінствам сапраўднай або магчымай сувязі адзінай прыроды. Кожная рэч мае *сваю* прыроду (як сукупнасць таго, чым яна ёсць, яна ёсць тым, што тоеснае) дзякуючы таму, што яна ёсць цэнтрам аб'яднання каўзальнасці ўнутры адзінай усёабдымнай прыроды. Рэальныя ўласцівасці (рэчава-рэальныя, цялесныя) — гэта назва паказаных у каўзальных законах магчымасцяў змены нечага тоеснага, што, такім чынам, вызначанае ў дачыненні да таго, чым яно ёсць, толькі праз выкарыстанне гэтых законаў. Аднак рэчавасці дадзеныя ў якасці адзінства непасрэднага досведу, у якасці адзінства разнастайных пачуццёвых з'яў. Пачуццёва ўспрыманыя нязменнасці, змены і залежнасці паміж зменамі паўсюдна даюць указанні пазнанню і функцыянуюць для яго як бы ў якасці «цьмянага» асяроддзя, у якім выяўляецца сапраўдная, аб'ектыўная фізічная прырода і з дапамогай якога мысленне (як навуковае эмпірычнае мысленне) здабывае для сябе і выбудоўвае з сябе праўдзівае[1].

[1] Варта прыняць пры гэтым пад ўвагу, што гэта — асяроддзе фенаменальнасці, у якім увесь час рухаецца прыродазнаўчае сузіранне і мысленне, само не ператвараецца ім у навуковую тэму. Над ёй працуюць новыя навукі: псіхалогія (да якой належыць ладная частка фізіялогіі) і фенаменалогія. — *Заўв. аўтара.*

Усё гэта не ёсць чымсьці дададзеным выдумкай да рэчаў досведу і да досведу рэчаў, але нечым, неад'емна прыналежным да іх сутнасці такім чынам, што любое інтуітыўнае і паслядоўнае даследаванне таго, чым *у сапраўднасці* ёсць рэч — вось гэтая дадзеная рэч, якая, пазнаная ў досведзе, заўсёды з'яўляецца як нешта, як бытнае, як штосьці вызначанае і, у той жа час, як тое, што паддаецца вызначэнню, але якая ў зменлівасці сваіх праяў і абставінаў, што ўзнікаюць, з'яўляецца кожны раз як нешта інакш бытнае, — неабходным чынам прыводзіць да каўзальных сувязяў і заканчваецца ў вызначэнні адпаведных аб'ектыўных уласцівасцяў як заканамерных. Таму прыродазнаўства толькі няўхільна ідзе за сэнсам таго, чым, так бы мовіць, дамагаецца быць сама рэч як спазнаная досведам, і яно называе гэта досыць цьмяна «выключэннем другасных якасцяў», «выключэннем чыста суб'ектыўнага ў з'яве» пры «ўтрыманні астатніх, першасных якасцяў». Але гэта нешта большае, чым цьмяны выраз — гэта кепская тэорыя для атрымання добрага метаду даследавання.

Звернемся зараз да «свету» «псіхічнага» і абмяжуймася «псіхічнымі феноменамі», якія новая псіхалогія разглядае ў якасці сферы сваіх аб'ектаў: гэта значыць пакінем у баку праблемы, якія адносяцца да душы і «я» і якія могуць завесці нас занадта далёка. Такім чынам, запытаемся мы ў сябе, ці закладзеная ў кожным успрыманні псіхічнага ўласцівая прыродзе аб'ектыўнасць («Natur»objektivität) падобная да таго, як гэта мае месца ў сэнсе кожнага фізічнага досведу і кожнага ўспрымання рэчавага. Мы адразу ж убачым, што стасункі ў сферы псіхічнага зусім іншыя, чым у сферы фізічнага. Псіхічнае размеркаванае — ужываючы параўнанне і не надаючы словам метафізічнага сэнсу —

паміж манадамі, якія не маюць вокнаў і маюць зносіны адна з адною толькі дзякуючы пранікненню адчуваннем. Псіхічнае быццё, быццё як «феномен» прынцыпова не ёсць адзінствам, якое б пазнавалася індывідуальна-тоесным у шматлікіх асобных успрыманнях — няхай гэта будуць нават успрыманні аднаго і таго самага суб'екта. У псіхічнай сферы, інакш кажучы, няма ніякага адрознення паміж з'явай і быццём, і калі прырода ёсць тут-быццём, якое выяўляецца ў з'явах, то самі з'явы (якія псіхолаг прыпісвае да псіхічнага) не ёсць, у сваю чаргу, быццём, якое б выяўляла сябе ў з'явах, як паказвае любая рэфлексія над успрыманнем якой-кольвечы з'явы. Такім чынам становіцца зразумелым: ёсць толькі адна прырода, якая выяўляецца ў з'явах рэчаў. Усё, што мы ў самым шырокім сэнсе псіхалогіі называем псіхічным феноменам, выступаючы само па сабе, ёсць менавіта феноменам, а *не* прыродаю.

Феномен не ёсць, такім чынам, нейкім «субстанцыянальным» адзінствам, ён не мае ніякіх «рэальных уласцівасцяў», ён не ведае ніякіх рэальных частак, ніякіх рэальных зменаў і ніякай каўзальнасці, калі разумець усе гэтыя словы ў прыродазнаўчым сэнсе. Прыпісваць феноменам прыроду, шукаць іх рэальныя часткі, якія падлягаюць вызначэнню, іх каўзальныя сувязі — гэта чыстая бязглуздзіца, не лепшая за тую, якая б атрымалася, калі б хто-небудзь хацеў запытацца пра каўзальныя ўласцівасці, сувязі і да т. п. лікаў. Гэта — бязглуздзіца, якая палягае ў натуралізацыі таго, сутнасць чаго выключае быццё ў сэнсе прыроды. Рэч ёсць тым, чым яна ёсць, і застаецца назаўжды ў сваёй тоеснасці: прырода — вечная. Тое, якія ж уласцівасці і мадыфікацыі ўласцівасцяў у сапраўднасці прыналежныя пэўнай рэчы, — рэчы прыроды, а не пачуццёвай рэчы практычнага жыц-

ця — рэчы «як яна пачуццёва з'яўляецца», можа быць вызначанае з аб'ектыўнай значнасцю, якая пацвярджаецца і выпраўляецца ўва ўсё новых і новых досведах. Наадварот, псіхічнае, «феномен» прыходзіць і сыходзіць, не захоўваючы ніякага тоеснага быцця, якое застаецца і якое было б вызначана аб'ектыўна ў прыродазнаўчым сэнсе: напрыклад, як аб'ектыўна падзельнае на складнікі, як тое, якое «паддаецца аналізу» ўва ўласным сэнсе слова.

Наконт таго, што «ёсць» псіхічным быццём, досвед не можа распавесці нам у тым жа самым сэнсе, які існуе ў дачыненні да фізічнага. Псіхічнае не ёсць пазнавальным у досведзе як тое, што з'яўляецца: яно ёсць «перажываннем», прытым перажываннем, бачаным у рэфлексіі; яно з'яўляецца як тое, што выяўляецца само праз сябе, у абсалютнай плыні, як тое, што ёсць цяпер і якое ўжо адміраe ды, навочна ўспрымальнае, няспынна адпадае ў былое. Псіхічнае можа быць таксама ўзгаданым і такім чынам, у вядомым мадыфікаваным сэнсе, спазнаным праз досвед; а ўва «ўзгаданым» змяшчаецца ужо «штосьці, што было ўспрынятым»; і яно можа быць «паўторна» ўзгаданым, ува ўспамінах, якія ствараюць адзінства свядомасці, якая, у сваю чаргу, сама ўсведамляе ўспаміны зноў-такі як штосьці ўзгаданае або як пакуль яшчэ захаванае ў свядомасці. У такой сувязі й толькі ў ёй, тоеснае ў такіх «паўторах», псіхічнае можа *a priori* эмпірычна пазнавацца як бытнае і атаесамляцца. Усё псіхічнае, якое ёсць *гэтак* пазнаным, мае потым месца — і гэта мы можам сказаць таксама з відавочнасцю — у пэўнай аб'ёмнай сувязі, у «манадычным» адзінстве свядомасці — адзінстве, якое не мае нічога агульнага з прыродай, з прасторай і часам, субстанцыянальнасцю і каўзальнасцю, але якое мае свае зусім

асаблівыя «формы». Псіхічнае ёсць з двух бакоў неабмежаванай плынню феноменаў, з адзінай інтэнцыйнай лініяй, якая праходзіць праз яго і з'яўляецца як бы паказнікам усёпранікальнай еднасці, а менавіта лініяй пазбаўленага пачатку і канца іманентнага «часу» — часу, які не вымяраюць хранометры.

Адсочваючы плынь феноменаў у іманентным сузіранні, мы пераходзім ад аднаго феномена да другога (кожны з якіх ёсць адзінствам у плыні й сам спасцігнуты ў плыннасці) і ніколі не прыходзім ні да чога, акрамя феноменаў. Толькі калі іманентнае сузіранне і рэчавы досвед лучацца ў сінтэзе, тады ўступаюць у вядомыя дачыненні феномен, які быў аб'ектам сузірання, і спазнаная ў досведзе рэч. Праз пасярэдніцтва досведу рэчаў і такога досведу дачыненняў узнікае пранікненне адчуваннем як разнавіднасць апасродкаванага сузірання псіхічнага, якое характарызуе сябе як сузіральнае пранікненне ў другую манадычную сувязь.

Як далёка можа, аднак, зайсці ў гэтай сферы разумнае даследаванне, наколькі тут магчымыя значныя выказванні? Наколькі дазволеныя таксама і такія выказванні, якія мы толькі што падалі, у якасці найбольш грубых апісанняў (якія замоўчваюць цэлы шэраг вымярэнняў)? Само сабою зразумела, даследаванне тут будзе мець сэнс, толькі калі яно цалкам будзе кіравацца сэнсам «досведаў», якія прапануюць сябе як дасведчанае спазнанне «псіхічнага», і калі яно прытым будзе браць і імкнуцца вызначыць «псіхічнае» як тое менавіта, дзеля чаго яно, якое гэткім чынам сузіраецца, як бы «патрабуе», каб яго прымалі і вызначалі. Гэта значыць, перш за ўсё, у тым выпадку, калі не дапускаюцца бессэнсоўныя натуралізацыі. Варта, як гаварылася, браць феномены такімі, якімі яны даюцца, гэта значыць, як вось

гэтае плыннае ўсведамленне сябе (fließendes Bewußthaben), выказванне меркаванняў (Meinen), з'яўленне, якімі яны ёсць у якасці вось гэтага ўсведамлення сябе на пярэднім і заднім плане (Vordergrundbewußthaben und Hintergrundbewußthaben); у якасці вось гэтага ўсведамлення чаго-небудзь як існага цяпер і як існага перад тым; як выдуманага або сігнітыўнага, або адлюстраванага; як навочна або ненавочна выяўленага і г. д.; і пры гэтым браць усё гэта-як нешта такое, што, так ці іначай, утвараецца і што пераўтвараецца ў змене тых ці іншых стаўленняў, тых або іншых атэнцыянальных модусаў. Усё гэта мае назву: «ўсведамленне чагосьці», якое «мае» «сэнс», і «мысліць» «прадметнае», прычым апошняе — няхай з якога-небудзь пункту погляду яно называецца «фікцыяй» або «сапраўднасцю» — можа быць апісанае як «іманентна прадметнае», «уяўнае як такое», а менавіта: уяўнае ў тым або іншым модусе ўяўнасці.

Цалкам відавочна, што мы маем тут магчымасць даследаваць, сцвярджаць, рабіць выказванні з відавочнасцю, падпарадкоўваючыся сэнсу гэтай сферы «досведу». Само выкананне згаданага патрабавання, вядома, уяўляе сабою не абы-якую цяжкасць. Узгодненасць або супярэчлівасць даследаванняў, якія неабходна выканаць, залежыць выключна ад паслядоўнасці й чысціні «фенаменалагічнага» погляду. Нам цяжка вызваліцца ад нашай першароднай завядзёнкі жыць і думаць у натуралістычных звычках і, такім чынам, натуралістычна фальшаваць псіхічнае. Шмат што залежыць, акрамя таго, ад зразумення таго, што ў сапраўднасці магчымае «чыста іманентнае» даследаванне псіхічнага (беручы тут фенаменальнае, як такое, у самым шырокім сэнсе слова) — даследаванне, толькі што ахарактарызаванае наогул, і процілеглае яму псіхафізічнае даследаванне, якое

мы да гэтага часу не прымалі пад увагу і якое, натуральна, таксама мае сваё права на існаванне.

Але як што іманентна псіхічнае само па сабе не ёсць прыродаю, а як бы яе антыподам (Gegenwurf), то што ж тады ў ім мы даследуем у якасці «быцця»? І, паколькі яно не даступнае вызначэнню ў сваёй «аб'ектыўнай» ідэнтычнасці як субстанцыйнае адзінства рэальных уласцівасцяў, якія дапускаюць паўторнае назіранне і навукова-эмпірычнае вызначэнне ды пацверджанне, паколькі яго немагчыма вырваць з адвечнай плыні й надаць яму аб'ектыўнасці інтэрсуб'ектыўнага значэння, тады што ж мы здольныя ўлавіць у ім, канкрэтна выказаць датычна яго і сцвярджаць як аб'ектыўнае адзінства? Пры гэтым не трэба забывацца, што мы знаходзімся ў чыста фенаменалагічнай сферы й не бяром пад увагу дачыненне да ўспрыманага досведам як рэч цела і да прыроды. Адказам служыць наступнае: паколькі феномены як такія не маюць *прыроды*, то яны маюць *сутнасць*, якая засвойваецца ў непасрэдным сузіранні; любое сцвярджэнне, якое апісвае іх пры дапамозе адэкватных паняццяў, робіць гэта, пакуль жадае заставацца значным, у паняццях сутнасці, г. зн. у такіх слоўных паняццевых значэннях, якія могуць быць уключаныя ў сузіранне сутнасці.

Трэба належным чынам спасцігнуць гэты апошні падмурак усіх псіхалагічных метадаў. Праклён натуралістычных забабонаў, які навісае над намі ўсімі й пазбаўляе нас здольнасці адмовіцца ад прыроды ды зрабіць прадметам сузіральнага даследавання таксама і псіхічнае ў яго чыстым выглядзе, а не ў псіхафізічным стане, закрыла тут доступ у сферу вялікай і бяспрыкладнай паводле сваіх наступстваў навукі, што ёсць, з аднаго боку, асноўнай умовай для сапраўды *навуковай псіхалогіі*, а з другога —

полем сапраўднай *крытыкі розуму.* Праклён першароднага натуралізму палягае таксама і ў тым, што ўсім нам так цяжка бачыць «сутнасці», «ідэі» або, дакладней (бо мы іх усё ж, так бы мовіць, увесь час бачым), спасцігаць іх у іх своеасаблівасці й не натуралізаваць іх. Сузіранне сутнасці не ўтрымлівае большых цяжкасцяў або «містычных» таямніц, чым успрыманне. Калі мы інтуітыўна спасцігаем «колер» з поўнай яснасцю, у яго поўнай дадзенасці, гэта робіцца сутнасцю; калі мы ў такім самым чыстым сузіранні, пераходзячы ад успрымання да ўспрымання, узвышаемся да той дадзенасці, якая ёсць «успрыманнем», успрыманнем у сабе: вось гэта саматоесная істота розных зменлівых асобнасцяў успрымання, — то мы сузіральна спасцігаем сутнасць успрымання. Дакуль сягае інтуіцыя, сузіральная свядомасць, датуль сягае таксама магчымасць, якая адпавядае «ідэацыі» (як я меў звычай выказвацца ў «Лагічных даследаваннях») або «сузіранню сутнасці». У той ступені, у якой інтуіцыя чыстая і не прадугледжвае ніякіх пераходных супольных меркаванняў (Mitmeinungen), успрыманая істота ёсць адэкватна ўспрыманаю, абсалютна дадзенаю. Такім чынам, абсяг панавання чыстай інтуіцыі таксама ахоплівае ўсю сферу, якую псіхолаг прыўлашчвае сабе як сферу «псіхічных феноменаў», паколькі ён бярэ іх выключна для сябе, у чыстай іманентнасці. Кожнаму непрадузятаму чалавеку відавочна, што «сутнасці», спасцігнутыя ў сутнасным сузіранні, могуць, прынамсі ў агульных рысах, быць фіксаваныя ўва ўстойлівых паняццях і гэтым адкрываюць магчымасць для ўстойлівых і свайго кшталту аб'ектыўна і абсалютна значных сцвярджэнняў. Самыя тонкія каляровыя адрозненні, апошнія нюансы, могуць не паддавацца такой фіксацыі; «колер» жа, у адрозненне ад

«гуку», выяўляе гэткае відавочнае адрозненне, што цяжка знайсці штосьці яшчэ больш відавочнае. І падобнымі ж абсалютна адрознымі, г. зн. якія дапускаюць фіксацыю, сутнасцямі ёсць не толькі сутнасці пачуццёвых «зместаў» і з'яў («бачных рэчаў», фантомаў і да т. п.), але не ў меншай ступені — таксама сутнасці ўсяго псіхічнага ў першасным сэнсе слова, сутнасці ўсіх «актаў» і станаў, якія адпавядаюць такім псіхічным фактам, як, напрыклад: успрыманне, фантазія, успамін, суджэнне, пачуццё, воля, разам з усімі іх незлічонымі разнавіднасцямі; выключаючы толькі апошнія «нюансы», прыналежныя да нявызначанага моманту «плыні», хоць даступная апісанню тыпізацыя праходжання мае таксама свае «ідэі», якія, зрабіўшыся сузіральна спасцігнутымі ды фіксаванымі, робяць магчымым абсалютнае пазнанне. Кожнае псіхалагічнае найменне, як тое ж успрыманне або воля, ёсць назвай якой-небудзь найшырэйшай сферы «аналізаў свядомасці», г. зн. даследаванняў сутнасці. Такім чынам гаворка ідзе пра такі абсяг, які паводле сваёй шырыні можа быць параўнаны толькі з прыродазнаўствам, — як бы гэта дзіўна ні гучала.

Вырашальнае значэнне мае той факт, што сутнаснае сузіранне не мае нічога агульнага з «досведам» у сэнсе ўспрымання, успамінаў або падобных да іх актаў і, акрамя таго, не мае нічога агульнага з эмпірычным абагульненнем, якое экзістэнцыяльна спалучае ў сваім сэнсе індывідуальнае існаванне асобнасцяў досведу (Erfahrungseinzelheiten). Сузіранне ахоплівае *сутнасць* як *сутнаснае быццё* і ні ў якім сэнсе не сузірае і не мяркуе *тут-быцця*. Згодна з гэтым, сузіранне сутнасці не ёсць пазнаннем matter of fact, не мае ў сабе ані подыху якога-небудзь сцверджання адносна індывідуальнага (прыкладам, натуральнага) існавання. Асно-

вай ці, дакладней, пачатковым актам сутнаснага сузірання, напрыклад, сузірання сутнасці ўспрымання, успаміну, суджэння і г. д., *можа* быць успрыманне якога-небудзь успрымання, успаміну, суджэння і г. д.; але ім можа быць таксама і простае, абы толькі «яснае», уяўленне, якое ў сутнасці ж не ёсць досведам, не спасцігае ніякага Тут-Быцця. Само разуменне сутнасці гэтым ніяк не закранаецца; яно сузіральнае *ў якасці* разумення сутнасці — і гэта зусім іншае сузіранне, чым досвед. Зразумела, што сутнасці могуць быць уяўнымі й, дапусцім, незразумела сімвалічна і памылкова меркавацца, — тады перад намі ўяўныя сутнасці, надзеленыя супярэчлівасцю, як паказвае пераход да сузіральнага разумення іх нязгоднасці; але і расплывістае пастуляванне існавання можа быць у дастатковай меры пацверджана праз адступленне да інтуіцыі ў вызначэнні сутнасці.

Кожнае суджэнне, якое дае адэкватны выраз ува ўстойлівых адэкватных паняццях таму, што належыць да сутнасці, таму, якім чынам сутнасці пэўнага кшталту або асаблівай разнавіднасці злучаюцца з пэўнымі іншымі сутнасцямі; якім чынам, напрыклад, злучаюцца паміж сабою «навочнае сузіранне» і «пустое суджэнне», «уяўленне» і «ўспрыманне», «паняцце» і «навочнае сузіранне» і г. д.; якім чынам яны з неабходнасцю «яднаюцца» на падставе такіх і гэткіх элементаў сутнасці: скажам, напрыклад, адпавядаюць адно аднаму, як «інтэнцыя» і «яе рэалізацыя», або якім чынам яны апынаюцца незлучальнымі або выклікаюць «усведамленне расчаравання», — кожнае такое суджэнне ёсць абсалютным, агульназначным пазнаннем і як суджэнне сутнаснае належыць да таго кшталту суджэнняў, якія было б недарэчным імкнуцца абгрунтаваць, пацвердзіць або абвергнуць праз досвед. Таму яно фіксуе ў сабе «relation of idea», пэўнае *apriori*

у тым праўдзівым сэнсе, які бачыўся ўжо Х'юму, але мусіў быць непазбежна перакручаны яго пазітывісцкім змяшаннем сутнасці з «idea» як процілегласцю «impression». Але нават яго скептыцызм тут не наважваецца быць паслядоўным да канца і сумнявацца ў самім гэтым пазнанні ў той меры, у якой ён яго бачыць. Калі б ягоны сэнсуалізм не зрабіў яго сляпым датычна ўсёй сферы інтэнцыйнасці «ўсведамлення чагосьці», калі б ён уключыў яе ў даследаванне сутнасці, ён не быў бы вялікім скептыкам, а стаў бы стваральнікам сапраўднай «пазітыўнай» тэорыі розуму. Усе тыя праблемы, якімі ён так апантана заняты ў Treatise[1] і якія штурхаюць яго ад памылкі да памылкі, праблемы, якія ён нават не ў змозе вымераць і слушна фармуляваць праз сваё стаўленне, — усе яны несумнеўна знаходзяцца ў кампетэнцыі фенаменалогіі. Сваё поўнае вырашэнне яны атрымліваюць у агульнасузіральным разуменні, якое не пакідае ўжо больш ніякага *сэнсоўнага* пытання, шляхам даследавання сутнасных сувязяў свядомых утварэнняў і карэлятыўных ім і істотным чынам ім супрыналежных уяўнасцяў. Так, напрыклад, выглядае глыбока важная праблема тоеснасці прадмета ў процілегласць множнасці атрыманых ад яго уражанняў, яго перцэпцый. І, сапраўды, стаіць пытанне пра тое, якім чынам множныя ўспрыманні, або таксама з'явы, прыводзяцца да таго, каб «уяўляць сабою» адзін і той самы прадмет так, каб ён быў *для сябе самога* і для свядомасці адзінства і тоеснасці, якія іх злучаюць, — тым самым гэтае пытанне можа быць вырашанае толькі фенаменалагічным даследаваннем сут-

[1] Відавочна, тут маецца на ўвазе самая вядомая праца Дэвіда Х'юма (Юма) «A Treatise of Human Nature» («Трактат аб чалавечай прыродзе», 1739–1740). — *Заўв. перакладчыка.*

насці (на што паказвае, вядома, само наша фармуляванне яго). Спрабаваць даць на гэтае пытанне па-эмпірычнаму прыродазнаўча-навуковы адказ — значыць не зразумець яго і пазбавіць сэнсу. Тое, што ўспрыманне, як і, наогул, любы досвед, ёсць успрыманнем менавіта гэтага, менавіта так арыентаванага, менавіта так афарбаванага, аформленага і г. д. прадмета, — гэта належыць да яго сутнасці, прычым усё роўна, як выглядае справа з «існаваннем» прадмета. І тое, што гэтае ўспрыманне змяшчаецца ў беспарапынны шэраг успрымання, але шэраг не адвольны, а такі, у якім «адзін і той самы прадмет выяўляе сябе ў паступова ўсё новым і новым выглядзе і г. д.», — гэта зноў-такі мае дачыненне выключна да сутнасці. Карацей кажучы, тут перад намі яшчэ вялізныя і не апрацаваныя ў літаратуры абсягі «аналізу свядомасці», прычым паняцце свядомасці, а таксама і паняцце псіхічнага, пакідаючы без увагі пытанне пра тое, наколькі яны прыдатныя, павінна быць распаўсюджанае настолькі, каб пазначаць сабою ўсё іманентнае і, такім чынам, усё свядома ўяўнае як такое і ўва ўсіх сэнсах. Праблемы паходжання, якія на працягу стагоддзяў гэтак шмат абмяркоўваліся, вызваленыя ад фальшывага натуралізму, які перакручвае іх, — гэта праблемы фенаменалагічныя. Так, прыкладам, выглядаюць праблемы паходжання «прасторавага ўяўлення», уяўлення часу, рэчаў, лікаў, «уяўленняў» аб прычыне і наступстве і г. д. І толькі тады, калі гэтыя чыстыя праблемы асэнсавана сфармуляваныя і вырашаныя, толькі тады іншыя эмпірычныя праблемы ўзнікнення падобных уяўленняў як з'яў чалавечай свядомасці атрымліваюць навуковы, зразумелы і прыдатны для іх вырашэння сэнс.

Гаворка пры гэтым ідзе пра тое, каб бачыць і лічыць наўсуцэль натуральным, што цалкам падобна да таго, як

можна непасрэдна чуць гук, можна сузіраць «сутнасць»: сутнасць «гуку», сутнасць «рэчавай з'явы», сутнасць «бачнай рэчы», сутнасць «вобразнага ўяўлення» і г. д. і, сузіраючы, рабіць сутнасныя суджэнні. З іншага боку, неабходна асцерагацца х'юмаўскага змяшання, змяшання фенаменалагічнага сузірання з «саманазіраннем», з унутраным досведам — карацей кажучы, з актамі, якія замест сутнасцяў пастулююць, хутчэй, адпаведныя ім індывідуальныя асаблівасці[1].

Чыстая фенаменалогія як навука, пакуль яна самастойная і не займаецца выкарыстаннем экзістэнцыяльнага пастулявання прыроды, можа быць толькі даследаваннем сутнасці, а не даследаваннем тут-быцця; любое «саманазіранне» і любое суджэнне, якое засноўваецца на такім «досведзе», знаходзіцца па-за яе межамі. Адзінкавае ў сваёй іманентнасці можа пастулявацца толькі як «вось тое, што там!» — вось гэтае ўспрыманне, якое сплывае прэч, успамін і да т. п. — і выяўляцца толькі ў дакладных паняццях сутнасці, абавязаных сваім паходжаннем аналізу сутнасці. Бо індывід хоць і не ёсць сутнасцю, але ўсё ж «мае» ў сабе сутнасць, якая можа

1 «Лагічныя даследаванні», якія, змяшчаючы ў сабе разрозненыя фрагменты сістэматычнай фенаменалогіі, і ўпершыню прысвечаныя аналізу сутнасці ў апісаным тут сэнсе, усё яшчэ няслушна разумеюцца пастаянна як спроба рэабілітацыі метаду саманазірання. Вядома, адказнасць за гэта часткова кладзецца на недастатковую характарыстыку метаду ўва «Уводзінах» да першага даследавання другога тома, а менавіта — на вызначэнне фенаменалогіі як апісальнай псіхалогіі. Неабходныя дадаткі дае ўжо мой трэці агляд нямецкай літаратуры па логіцы ў 1895–1899 гг. у IX томе выдання «Archiv für syst. Philosophie» (1903), с. 397–400. — *Заўв. аўтара.*

быць пра яго з відавочнай правамоцнасцю выказаная. Але вызначыць яго як індывіда, паказаць яму месца ў «свеце» індывідуальнага існавання такая простая субсумацыя, што цалкам зразумела, не мае магчымасці. Для яе адзінкавае застаецца вечным ἄπειρον[1]. З аб'ектыўнай значнасцю яна можа спазнаць толькі сутнасць і сутнасныя дачыненні й праз гэта здзейсніць усё і прытым здзейсніць канчаткова тое, што неабходна для выразнага разумення любога эмпірычнага пазнання і любога пазнання наогул, а менавіта: уразумець «паходжанне» ўсіх фармальна-лагічных, натуральна-лагічных і любых іншых кіроўных «прынцыпаў» ды ўсіх з гэтым шчыльна звязаных праблем карэлятыўнасці «быцця» (прыроднага, каштоўнаснага і г. д.) і «свядомасці»[2].

---

[1] Бясконцае, нявызначанае (*ст.-гр.*). Паняцце, уведзенае старагрэцкім філосафам Анаксімандрам.

[2] Тая пэўнасць, з якой я выступаю ў наш час, для якога фенаменалогія азначае ў найлепшым выпадку розныя спецыяльныя працы ды разнастайную карысную дробязную працу ў сферы саманазірання, а не сістэматычна-галоўную філасофскую дысцыпліну, што ёсць уваходнай брамай да сапраўднай метафізікі прыроды, духу і ідэй — вось жа, гэтая пэўнасць заснаваная на шматгадовых і бесперапынных даследаваннях, што пакладзеныя мною ў падмурак маіх гётынгенскіх лекцый, пачынаючы з 1901 года. Пры глыбокай функцыянальнай узаемасувязі ўсіх фенаменалагічных пластоў, а дзякуючы гэтаму і тых, што адносяцца да іх даследаванняў, гэтаксама як і пры бясконцых цяжкасцях, якімі напоўненае стварэнне чыстай методыкі, я не палічыў мэтазгодным апублікаваць яшчэ разрозненыя і ў пэўных пунктах сумнеўныя вынікі. Мяркую, што ўсебакова ўмацаваныя і сістэматычна згрупаваныя апошнім часам даследаванні па

Пяройдзем да псіхафізічнай пастаноўкі пытання. Тут «псіхічнае» з усёй *уласцівай яму* сутнасцю атрымлівае аднясенне да цела і да адзінства фізічнай прыроды: засвоенае ў іманентным сузіральным успрыманні і сутнасна спасцігнутае ў такой форме ўступае тут у сувязь з пачуццёва ўспрынятым і, такім чынам, з прыродай. Толькі праз *такое* аднясенне яно атрымлівае ўскосную прыродападобную аб'ектыўнасць, апасродкавана займае месца ў прыроднай прасторы і становіцца ў лінію прыроднага часу, які мы вымяраем пры дапамозе гадзіннікаў; эмпірычная «залежнасць» ад фізічнага дае ў пэўных, бліжэй нявызначаных, памерах магчымасць вызначыць псіхічнае як індывідуальнае быццё, інтэрсуб'ектыўна, і адначасова даследаваць на ўсё больш і больш шматлікіх прыкладах псіхафізічныя дачыненні. Гэта абсяг «псіхалогіі як прыродазнаўчай навукі», якая ёсць псіхалогіяй псіхафізічнаяй у сапраўдным сэнсе слова, і пры гэтым яна, вядома, эмпірычная.

Вядома, імкненне разглядаць псіхалогію, навуку аб «псіхічным», толькі як навуку аб «псіхічных феноменах» ды іх повязях з целам не можа не выклікаць ваганняў. *De facto* яна ўсё ж паўсюль кіруецца тымі першароднымі і непазбежнымі аб'ектывацыямі, карэлятам якіх ёсць эмпірычныя адзінствы чалавека і жывёлы, а з іншага боку — адзінства душы, асобы, або і характар, душэўны склад асобы. Між тым, дзеля дасягнення нашых мэтаў няма патрэбы займацца сутнасным аналізам гэтых утварэнняў адзінства і праблемай таго, як яны са свайго боку вызначаюць задачу псіхалогіі.

фенаменалогіі ды фенаменалагічнай крытыцы розуму мне ўдасца апублікаваць праз нейкі, не надта працяглы час. — *Заўв. аўтара.*

Тое, што гэтыя адзінствы прынцыпова адрозныя ад рэчавасцяў прыроды, якія ў сваёй сутнасці дадзеныя нам у адценнях з'яў, у той час як гэтага ніякім чынам няможна сцвярджаць пра такія адзінствы, адразу ж робіцца зразумелым. Толькі фундавальная аснова — «чалавечае цела», а не сам чалавек — ёсць адзінствам рэчавай з'явы: і такім, у кожным разе, не ёсць асоба, характар і да т. п. Усе гэткага кшталту адзінствы з відавочнасцю паказваюць нам на іманентнае адзінства жыцця кожнай плыні свядомасці і на марфалагічныя асаблівасці, якія адрозніваюць міжсобку такія розныя іманентныя адзінствы. Адпаведна гэтаму, таксама і любое псіхалагічнае пазнанне мусіць быць вернутае да падобных адзінстваў свядомасці і, такім чынам, да вывучэння *саміх феноменаў* і іх перапляценняў нават там, дзе яно першасна мае дачыненне з чалавечымі індывідуальнасцямі, характарамі, душэўным складам.

Наогул — і асабліва пасля ўсяго выкладзенага — наўрад ці можа быць цяжка і складана прызнаць з яснасцю і грунтоўнасцю тое, што ўжо было сказана вышэй, а менавіта што псіхафізічнае (г. зн. псіхалагічнае ў звычайным сэнсе) пазнанне *мае на ўвазе сутнаснае пазнанн*е псіхічнага і што спадзяванні даследаваць *сутнасць* успаміну, суджэння і да т. п. пры дапамозе псіхафізічных эксперыментаў і ненаўмысных унутраных успрыманняў або досведаў, з мэтаю *гэткім спосабам* дамагчыся стварэння дакладных паняццяў, адзіна здольных паведаміць навуковую каштоўнасць пазначэнню псіхічнага ў псіхафізічных сцверджаннях і самім гэтым апошнім, — што такія спадзяванні дарэшты недарэчныя.

Прынцыповай памылкай сучаснай псіхалогіі, якая замінае ёй стаць псіхалогіяй у праўдзівым і сапраўды навуко-

вым сэнсе гэтага слова, ёсць тое, што яна не ведае гэтага фенаменалагічнага метаду і не культывуе яго. Гістарычныя забабоны адхілілі яе ад таго, каб скарыстацца пачаткамі такога метаду, закладзенымі ў любым аналізе, скіраваным на высвятленне сутнасці паняццяў. З гэтым шчыльна звязана тое, што большасць псіхолагаў не зразумела ўжо створаных пачаткаў фенаменалогіі й нават часцяком лічыла даследаванне сутнасці, якое здзяйсняецца чыста інтуітыўна, метафізічна-схаластычнай субстракцыяй. А тое, што спасцігнутае і апісанае ў сузіральнай паставе, можа быць зразуметым і паўторна даследаваным толькі ў менавіта ў ёй.

Пасля ўсяго вышэйсказанага ўжо зразумела — і я маю падставу спадзявацца на хуткае прызнанне гэтага з боку шмат каго, — што сапраўды здавальняльная эмпірычная навука аб псіхічным можа толькі тады разабрацца ў прыродных уласцівасцях псіхічнага, калі псіхалогія будзе абапірацца на *сістэматычную* фенаменалогію — г. зн. калі сутнасныя ўтварэнні свядомасці ды яе іманентных карэлятаў, чыста інтуітыўна даследаваныя і фіксаваныя, вызначаць нормы для разумення навуковага сэнсу і зместу паняццяў усіх магчымых феноменаў — такім чынам, гэткіх паняццяў, з дапамогай якіх псіхолаг-эмпірыст выказвае само псіхічнае ў сваіх псіхафізічных суджэннях. Толькі сапраўды радыкальная і сістэматычная фенаменалогія, сфармуляваная не мімаходзь, не ў асобных рэфлексіях, а пры поўным засяроджванні на высокаскладаных і заблытаных праблемах свядомасці, і сфармуляваная цалкам вольным розумам, не асепленым аніякімі натуралістычнымі забабонамі, — толькі яна здольная даць нам *разуменне* «псіхічнага» і ў сферы індывідуальнай, і ў сферы грамадскай свядомасці. Адно тады велізарная эксперыментальная праца нашага часу, багацце сабраных

эмпірычных фактаў і збольшага цікавых заканамернасцяў прынясуць, дзякуючы ацэначнай крытыцы і псіхалагічнай інтэрпрэтацыі, сапраўдны плён. Тады можна будзе зноў пагадзіцца з тым, чаго ніяк нельга сказаць пра сучасную псіхалогію, а менавіта — што псіхалогія знаходзіцца да філасофіі ў блізкім, нават у найбліжэйшым стасунку. Тады таксама і парадокс антыпсіхалагізму, які палягае ў тым, што тэорыя пазнання не павінна быць псіхалагічнай тэорыяй, страціць усю сваю незвычайнасць, паколькі любая сапраўдная тэорыя пазнання неабходным чынам павінна абапірацца на фенаменалогію, якая, такім чынам, зробіцца агульным падмуркам любой філасофіі ды псіхалогіі. І, нарэшце, тады знікне любая магчымасць той уяўна філасофскай літаратуры, якая сёння так пышна квітнее і якая выкладае нам свае тэорыі пазнання, свае лагічныя тэорыі, этыкі, натурфіласофіі, педагогікі на прыродазнаўчай і першым чынам «эксперыментальна-псіхалагічнай аснове» з прэтэнзіяй на сур'ёзную навуковасць[1]. Сапраўды, гледзячы на гэтую літаратуру, можна толькі засмучацца з прычыны заняпаду свядомасці тых глыбакабяздонных

[1] У немалой ступені папулярнасці гэтай літаратуры спрыяе тая акалічнасць, што меркаванне наконт таго, што псіхалогія — і прытым, само сабой зразумела, «фундаментальная псіхалогія» — ёсць падмуркам навуковай філасофіі, зрабілася цвёрдай аксіёмай, прынамсі, у асяроддзі прыродазнаўчых груп на філасофскіх факультэтах, і гэтыя факультэты, саступаючы ціску прыродазнаўцаў, старанна імкнуцца ўскладаць філасофскую прафесуру на такіх даследчыкаў, якія, магчыма, і вельмі моцна вылучаюцца ў сваёй галіне, але да філасофіі маюць не больш унутранай схільнасці, чым, напрыклад, хіміі або фізікі. — *Заўв. аўтара.*

праблем і цяжкасцяў, якім найвялікшыя розумы чалавецтва аддалі свае жыццёвыя сілы; і, на жаль, з прычыны заняпаду адчування сапраўднай грунтоўнасці, якая ўсё ж выклікае ў нас пачуццё глыбокай павагі ў сферы самой эксперыментальнай псіхалогіі, нягледзячы на прынцыповыя хібы, уласцівыя ёй паводле нашага пераканання. Я цвёрда ўпэўнены, што гістарычная ацэнка гэтай літаратуры будзе з часам істотна больш рэзкаю, чым гістарычная ацэнка гэтак шмат дакаранай папулярнай філасофіі XVIII стагоддзя[1].

---

[1] У той час як я пісаў гэтую частку артыкула, мне выпадкова трапіўся пад руку выдатны рэферат «Пра сутнасць і значэнне пранікнення адчуваннем», надрукаваны доктарам М. Гайгерам (Мюнхен) у публікацыі «Bericht über den IV. Kongreß für experimentielle Psychologie in Innsbruck» («Справаздача аб IV Кангрэсе ў пытаннях эксперыментальнай псіхалогіі ў Інсбруку», Ляйпцыг, 1911). Аўтар у вельмі павучальнай форме імкнецца размежаваць і вылучыць чыста псіхалагічныя праблемы, якія пры папярэдніх спробах апісання і стварэння тэорыі адчування часткова выразна выяўляліся, часткова незразумелым чынам зрасталіся адна з адной, і падае спробы вырашэння гэтых праблем ды атрыманыя пры гэтым выніκі. Кангрэс, як гэта вынікае са справаздачы аб дыскусіі (с. 66), кепска аддзячыў яму за гэта. Пры гучным ухваленні прысутных фройляйн Марцін сказала наступнае: «Калі я ішла сюды, то чакала пачуць што-небудзь пра эксперыменты ў галіне пранікнення адчуваннем. Але што ж я, уласна кажучы, пачула? Старыя задаўненыя тэорыі. Ані слова пра эксперыменты ў гэтай галіне! Гэта ж нефіласофскае грамадства. Мне здавалася, што ўжо надышоў час, калі той, хто жадае падаць сюды такія тэорыі, мусіць паказаць, ці пацверджаныя яны эксперыментамі. У галіне эстэтыкі такія

У гэтым месцы мы пакідаем поле бітвы псіхалагічнага натуралізму. Магчыма, нам варта сказаць, што псіхалагізм, які выйшаў пачынаючы з часоў Лока на авансцэну, быў, уласна кажучы, толькі невыразнай формай, з якой павінна была выпрацавацца адзіна правамерная філасофская тэндэнцыя, скіраваная на фенаменалагічнае абгрунтаванне філасофіі. Да гэтага далучаецца тое, што фенаменалагічнае даследаванне, паколькі яно ёсць даследаваннем сутнасці, г. зн. апрыёрным у сапраўдным сэнсе гэтага слова, аддае належную даніну ўсім правамерным матывам апрыярызму. У кожным разе, наша крытыка павінна была выразна паказаць, што прызнанне натуралізму прынцыпова памылковай філасофіяй не азначае яшчэ адмовы ад ідэі дакладна навуковай філасофіі, «філасофіі знізу». Крытычнае размежаванне метаду псіхалагічнага і фенаменалагічнага паказвае ў іпастасі апошняга праўдзівы шлях да навуковай тэорыі розуму і гэтаксама да здавальняльнай псіхалогіі.

Згодна з нашым планам, зараз мы павінны перайсці да крытыкі гістарыцызму і да разгляду светапогляднай філасофіі.

---

эксперыменты ўжо зробленыя: як, напрыклад, эксперыменты Стрэтана над эстэтычным значэннем рухаў зрэнак вачэй або і мае даследаванні, датычныя гэтай тэорыі ўнутранага ўспрымання». Далей: спадар Марбэ «бачыць значэнне вучэння аб пранікненні адчуваннем у заахвочванні да эксперыментальных даследаванняў, якія, зрэшты, ужо распачатыя ў гэтай галіне. Метад прадстаўнікоў тэорыі пранікнення адчуваннем належыць да эксперыментальна-псіхалагічнага ў шмат якіх дачыненнях гэтак жа сама, як метад дасакратыка — да метаду сучаснага прыродазнаўства». Мне больш няма чаго дадаць ад сябе да гэтых фактаў. — *Заўв. аўтара.*

## *Гістарыцызм і светапоглядная філасофія*

Гістарыцызм займае сваю пазіцыю ў сферы фактаў эмпірычнага духоўнага жыцця і, мяркуючы апошняе абсалютным, без непасрэднай яго натуралізацыі (асабліва паколькі спецыфічнае пачуццё прыроды чужое гістарычнаму мысленню і не можа, у кожным разе, рабіць на яго агульнавызначальны ўплыў), ён запачаткоўвае жыццё рэлятывізму, вельмі роднаснага натуралістычнаму псіхалагізму і ўблытанага ў аналагічныя скептычныя цяжкасці. Нас цікавяць тут толькі асаблівасці гістарычнага скепсісу, з якім мы й пазнаёмімся бліжэй.

Любая духоўная адукацыя (мы разумеем гэтае слова ў самым шырокім сэнсе, які ахоплівае сабою грамадскія адзінствы ўсіх разнавіднасцяў: на найніжэйшай прыступцы адзінства самога індывіда, але, у той самы час, і любую культурную адукацыю) мае сваю ўнутраную структуру, сваю тыпізацыю, сваё дзіўнае багацце вонкавых і ўнутраных формаў, якія прарастаюць у плыні самога духоўнага жыцця, зноў змяняюцца і ў самой сваёй змене зноў выяўляюць структурныя і тыпалагічныя адрозненні. У сузіраным навакольным свеце аналагам гэтага ёсць для нас структура і тыпізацыя арганічнага працэсу. Там няма пастаянных відаў, няма адбудовы іх з устойлівых арганічных элементаў. Усё, што ўяўляецца ўстойлівым, знаходзіцца ў плыні развіцця. Калі мы ўжывёмся шляхам глыбокапранікальнай інтуіцыі ў адзінства духоўнага жыцця, мы будзем здольныя інтуітыўна намацаць дамінантныя ў ім матывацыі і, дзякуючы гэтаму, «спасцігнуць» таксама сутнасць і развіццё любой духоўнай адукацыі ў яе залежнасці ад духоўных матываў адзінства ды развіцця. Гэткім

самым чынам робіцца «зразумелым» і «спасціжным» для нас усё гістарычнае ў своеасаблівасці яго «быцця», якое ёсць якраз «духоўным быццём», адзінствам унутрана затрабаваных адзін для аднаго момантаў якога-небудзь сэнсу, а прытым і адзінствам асэнсаванай самаадукацыі і самаразвіцця, паводле ўнутранай матывацыі. Такім самым спосабам, значыць, могуць быць інтуітыўна даследаваныя мастацтва, рэлігія, норавы і да т. п., а гэтаксама ім блізкае і таксама выяўленае ў іх светасузіранне, якое звычайна называецца метафізікай або філасофіяй, калі яно прымае на сябе формы навукі ды выяўляе, падобна да навукі, прэтэнзію на аб'ектыўнае значэнне. Датычна такіх філасофій узнікае, такім чынам, вялізная задача даследаваць іх марфалагічную структуру, тыпізацыю, а таксама сувязі іх развіцця, і потым, шляхам глыбокага іх перажывання, давесці вызначальныя для іх сутнасці духоўныя матывацыі да гістарычнага разумення. Працы В. Дыльтэя, у т. л. яго нядаўна апублікаваны артыкул пра тыпы светапогляду, навочна паказваюць, якім чынам можна дамагчыся важных з гэтага гледзішча і сапраўды вартых здзіўлення вынікаў[1].

Дагэтуль гаворка ішла, вядома, пра гісторыю, а не пра гістарыцызм. Мы зразумеем хутчэй за ўсё матывы, якія падахвочваюць да гэтага, калі прасочым за некалькімі выказваннямі Дыльтэя. Мы чытаем: «Сярод прычын, якія даюць скептыцызму ўсё новае і новае сілкаванне, адной з найбольш сапраўдных ёсць анархія філасофскіх сістэм» (3). «Але нашмат глыбей за скептычныя высновы ад супярэчлівасці чалавечых меркаванняў сягаюць сумневы,

[1] Параўн. зборнік: Weltanschauung. Philosophie und Religion (у пераказах Дыльтэя і г. д.). Berlin, Reichel & Co., 1911.

якія прарастаюць на глебе сталага развіцця гістарычнай свядомасці» (4). «Тэорыя эвалюцыі [як прыродазнаўчая тэорыя эвалюцыі, пераплеценая з гістарычна-эвалюцыйным пазнаннем твораў культуры] неабходным чынам звязаная з пазнаннем рэлятыўнасці гістарычных формаў жыцця. Перад поглядам, які ахоплівае зямлю і ўсё мінулае, цьмянее абсалютная справядлівасць любой формы ўладкавання жыцця, рэлігіі ды філасофіі. І, такім чынам, станаўленне гістарычнай свядомасці яшчэ больш грунтоўна, чым агляд спрэчак паміж сістэмамі, разбурае веру ў агульназначнасць якой-кольвечы з філасофій, што спрабавалі пры дапамозе сувязі паняццяў абавязковым чынам выявіць сусветную сувязь быцця» (6).

У *фактычнай праўдзівасці* сказанага, відавочна, сумнявацца не выпадае. Але пытанне палягае ў тым, ці слушна гэта з гледзішча *прынцыповай агульнасці*. Вядома, светасузіранне і светасузіральная філасофія — гэта творы культуры, якія, у дадзеных гістарычных варунках больш матываваныя паводле іх духоўнага зместу, з'яўляюцца і знікаюць у плыні чалавечага развіцця. Тое ж самае, аднак, датычыцца дакладных навук. І што ж, хіба яны *таму* не маюць аб'ектыўнай значнасці? Самы скрайні гістарыцыст адкажа на гэта, імаверна, станоўча: ён прытым зверне ўвагу на змену навуковых поглядаў, на тое, як сёння прызнаваная за даказаную тэорыя заўтра разглядаецца як нічога не вартая; як адны называюць непахіснымі законамі тое, што іншыя называюць простымі гіпотэзамі, а трэція лічаць цьмянымі магчымасцямі, і г. д. Але хіба мы, у выніку такой няспыннай змены навуковых поглядаў, у сапраўднасці не мелі б права казаць пра навукі не толькі як пра творы культуры, але і як пра аб'ектыўныя адзінствы значнасці?

Лёгка ўбачыць, што гістарыцызм пры яго паслядоўным развіцці пераходзіць у скрайні скептычны суб'ектывізм. Ідэі праўды, тэорыі, навукі страцілі б тады, як і ўсе ідэі наогул, сваё абсалютнае значэнне. Тое, што ідэя мела б значнасць, азначала б тады тое, што яна ёсць фактычным духоўным творам, які прызнаецца значным і ў гэтай фактычнасці значэння вызначае сабою мысленне. У такім выпадку значнасці як такой або «ў сабе», якая яна ёсць, ёсць нават і тады, калі ніхто не можа яе рэалізаваць і ніякая гістарычная супольнасць ніколі не яе рэалізоўвала, — гэткай значнасці няма зусім. Няма яе, значыць, і для прынцыпу супярэчнасці ды ўсёй логікі, якая і без таго ў наш час знаходзіцца ў стане поўнай перабудовы. Тады магчымы такі канчатковы вынік, калі лагічныя прынцыпы непярэчання ператворацца ў сваю процілегласць. То тады ж усе тыя сцверджанні, якія мы цяпер выказваем, і нават тыя магчымасці, якія мы абмяркоўваем і прымаем да ўвагі як значныя, апынуліся б пазбаўленымі ўсялякага значэння. І гэтак далей. Няма ніякай патрэбы тут працягваць гэтае разважанне і паўтараць тое, што ўжо было сказана ў іншым месцы[1]. З нас будзе цалкам дастаткова згоды на тое, што, якія б цяжкасці ні ўяўлялі для яснага разумення стасункі паміж зменлівай значнасцю і значэннем аб'ектыўным, паміж навукай як культурнай з'явай і навукай як сістэмай значнай тэорыі — усё адно іх адрозненне і процілегласць павінны быць прызнаныя. Калі ж мы прымаем навуку як значную ідэю, то якую ж падставу тады мы маем не пагаджацца на падобнага кшталту распазнаванне гістарычна

[1] У першым томе маіх «Лагічных даследаванняў». — *Заўв. аўтара.*

значнага і аб'ектыўна значнага, увогуле пакідаючы без увагі, прынамсі, пытанне аб тым, можам мы ці не можам спасцігнуць яго «крытычна»? Гісторыя, наогул эмпірычная навука аб духу, не ў змозе сваімі сіламі нічога вырашыць ні пазітыўна, ні адмоўна адносна таго, ці трэба рабіць адрозненні паміж рэлігіяй як творам культуры й рэлігіяй як ідэяй, г. зн. значнай рэлігіяй; паміж мастацтвам як творам культуры й значным мастацтвам, паміж гістарычным і значным правам і, нарэшце, паміж гістарычнай і значнай філасофіяй, а потым і адносна таго, існуе ці не існуе паміж тымі і іншымі, выказваючыся па-платонаўску, стасунак ідэі ды яе прыцемненай фенаменальнай формы. І калі духоўныя ўтварэнні сапраўды могуць быць разгляданыя і абмяркоўваюцца з гледзішча падобнага кшталту процілегласцяў значнасці, то навуковае рашэнне датычна самога значэння і яго ідэальных нарматыўных прынцыпаў менш за ўсё можа быць справай эмпірычнай навукі. Бо і матэматык таксама не звернецца да гісторыі па веды адносна праўдзівасці матэматычных тэорый: яму не прыйдзе ў галаву ставіць у сувязь гістарычнае развіццё матэматычных уяўленняў і суджэнняў з пытаннем аб праўдзе. Як жа наогул, у такім выпадку, гісторык можа вырашаць пытанне аб праўдзівасці пэўных філасофскіх сістэм і нібы ўпершыню слушна меркаваць адносна магчымасці значнай у сабе філасофскай навукі? І што мог бы ён дадаць са свайго боку такога, што б умажлівіла пахіснуць веру філасофа ў яго ідэю, у чыстую сапраўдную філасофію? Той, хто адмаўляе якую-небудзь пэўную сістэму, а таксама і той, хто адмаўляе ідэальную магчымасць філасофскай сістэмы наогул, той павінен называць падставы. Гістарычныя факты развіцця і сам агульны факт своеасаблівага развіцця сістэм увогуле

могуць служыць падставамі — і падставамі дастатковымі. Але гістарычныя падставы здольныя здабываць з сябе толькі гістарычныя наступствы. Жаданне абгрунтаваць або адхіліць ідэі на падставе фактаў — гэта бязглуздзіца: *ex pumice aquam*[1], як цытаваў Кант[2].

Гісторыя не можа сказаць нічога сур'ёзнага ані супраць магчымасці абсалютнай значнасці наогул, ані супраць магчымасці абсалютнай, г. зн. навуковай, метафізікі ды іншай філасофіі, у прыватнасці. І нават сцверджанне, што да гэтага часу не існавала навуковай філасофіі, яна як гісторыя не мае здольнасці колькі-небудзь абгрунтаваць: яна можа гэта зрабіць толькі на падставе іншых пазнавальных крыніц; а гэтыя апошнія — відавочна, ужо філасофскія крыніцы. Бо зразумела, што і філасофская крытыка, наколькі яна ў сапраўднасці павінна прэтэндаваць на значнасць, ёсць філасофіяй і ў сваім сэнсе ўжо імплікуе

---

1 Дасלоўна: «як здабываць з пемзы ваду» (*лац.*). — *Заўв. перакладчыка.*

2 Дыльтэй у тым самым артыкуле і сапраўды гэтак жа адхіляе гістарычны скептыцызм; але я не разумею, якім чынам ён спадзяецца здабыць вырашальныя аргументы супраць скептыцызму з гэткага свайго павучальнага аналізу структуры ды тыпізацыі светапоглядаў. Бо, як гэта даведзена ў тэксце нашага артыкула, ані супраць чаго-небудзь, ані на карысць чаго-небудзь, што выказвае прэтэнзію на аб'ектыўнае значэнне, эмпірычная навука аб духу ўсё-такі не можа знайсці аргументы. Стан рэчаў змяняецца, і, відаць, гэта якраз і служыць унутраным матывам яго думак, калі эмпірычнае даследаванне, якое скіроўваецца на эмпірычнае разуменне, змешваецца з фенаменалагічным трактаваннем сутнасці. — *Заўв. аўтара.*

ідэальную магчымасць сістэматычнай філасофіі як дакладнай навукі. *Безумоўнае* сцвярджэнне хімерычнасці любой навуковай філасофіі на той падставе, што ўяўныя спробы тысячагоддзяў зрабілі імавернай унутраную немагчымасць такой філасофіі, скажонае не толькі таму, што лагічны вывад ад двух тысячагоддзяў вышэйшай культуры да бясконцай будучыні быў бы кепскай індукцыяй, але яно скажонае як абсалютная бязглуздзіца, як 2×2=5. І гэта ў адпаведнасці з вышэйпададзенай падставай: філасофская крытыка знаходзіць перад сабой нешта такое, што трэба адхіліць з аб'ектыўнай значнасцю; тады ёсць месца і для аб'ектыўназначнага абгрунтавання. Калі праблемы пастаўленыя «няслушна» ў пэўным сэнсе, то павінны існаваць магчымае выпраўленне ды непасрэдная іх пастаноўка. Паколькі крытыка паказвае, што гістарычна сфарміраваная філасофія карыстаецца блытанымі паняццямі, што яна апусцілася да змяшэння паняццяў і да няпраўдзівых высноў, то ў гэтым ужо несумненна маецца на ўвазе — калі толькі мы не хочам бязглуздзіцы — магчымасць (выяўляючыся ідэальна) усведамляць, асвятляць і адрозніваць паняцці і здзяйсняць у дадзенай сферы слушныя высновы, і г. д. Кожная справядлівая глыбокая крытыка ўжо сама стварае сродкі да далейшага даследавання, паказвае idealiter[1] сапраўдныя мэты ды шляхі й, гэткім чынам, аб'ектыўна значную навуку. У дадатак да ўсяго гэтага будзе натуральна сцвярджаць, што гістарычная нетрываласць якой-небудзь духоўнай адукацыі як факту не мае нічога агульнага з нетрываласцю ў сэнсе значнасці: гэта, як і ўсё да гэтага часу выкладзенае, датычыцца ўсіх сфер меркаванай значнасці.

1 Ідэальным чынам (*лац.*).

Што яшчэ можа ўводзіць гістарыцыста ў зман, дык гэта тая акалічнасць, што мы шляхам жывога пранікнення (Einleben) у гістарычна рэканструяванае духоўнае сталенне, у дамінантнае ў ім значэнне, а таксама ў прыналежныя сюды сувязі матывацыі не толькі спасцігаем яго ўнутраны сэнс, але можам вызначыць і яго адносную каштоўнасць . Калі мы ўяўна выпрабуем тыя перадумовы, якімі меўся распараджацца які-небудзь гістарычны філосаф, то, магчыма, мы будзем здольныя прызнаць адносную «паслядоўнасць» яго філасофіі, нават захапляцца ёю; з іншага боку, мы будзем здольныя прабачыць непаслядоўнасці зрухам сутнасці праблем і змяшэннямі, якія былі непазбежнымі пры тагачасным становішчы праблематыкі ды аналізу сэнсу. Мы можам тады прызнаць за вялікі чын дасягнутае вырашэнне навуковай задачы, прыналежнай сёння да таго разраду праблем, з якімі лёгка даў бы рады гімназіст. Тое ж самае датычыцца іншых галін. Але, з іншага боку, мы застаёмся, зразумела, пры тым меркаванні, што і прынцыпы такіх адносных адзнак ляжаць у ідэальных сферах і што гісторык, *які ацэньвае*, які імкнуўся больш чым да простага разумення развіцця, можа толькі меркаваць пра іх, але не абгрунтоўваць як гісторык. Норма матэматычнага знаходзіцца ў матэматыцы, норма лагічнага — у логіцы, норма этычнага — у этыцы, і г. д. Калі гісторык хоча таксама і ў ацэнках дзейнічаць навукова, ён мусіць менавіта ў гэтых дысцыплінах шукаць падставы й метады абгрунтавання. Калі ж з гэтага гледзішча не існуе зусім дакладна распрацаваных навук, тады ён робіць ацэнкі пад сваю адказнасць, а менавіта — як маральны або рэлігійны чалавек, але, у кожным разе, не як гісторык-навуковец.

Калі я, такім чынам, разглядаю гістарыцызм як тэорыяпазнаўчую памылку, якая праз свае супярэчлівыя наступ-

ствы павінна быць таксама, як і натуралізм, энергічна адкінутая, то я ўсё ж такі хацеў бы выразна падкрэсліць: пры ўсім гэтым я цалкам прызнаю велізарную каштоўнасць для філосафа «гісторыі» ў самым шырокім сэнсе. Для яго адкрыццё духу супольнасці (des Gemeingeistes) гэткае самае важнае, як адкрыццё прыроды. Больш за тое: заглыбленне ўва ўсеагульнае духоўнае жыццё дае філосафу больш першасны і таму больш фундаментальны матэрыял даследавання, чым заглыбленне ў прыроду. Бо імперыя фенаменалогіі як вучэння аб сутнасці распаўсюджваецца ад індывідуальнага духу адразу ж на ўсю сферу ўсеагульнага духу, і калі Дыльтэй з такой выразнасцю паказаў, што *псіхафізічная* псіхалогія не ёсць той галіною, якая б магла выступіць у якасці «падставы гуманітарных навук», то я са свайго боку сказаў бы, што абгрунтаваць *філасофію* духу здольнае толькі й выключна фенаменалагічнае вучэнне аб сутнасці.

Пяройдзем зараз да разгляду сэнсу і слушнасці светапогляднай філасофіі, каб пасля процipаставіць яе філасофіі як дакладнай навуцы. Светапоглядная філасофія Новага часу, як ужо было адзначана, ёсць спараджэннем гістарычнага скептыцызму. Звычайна гэты апошні спыняецца ў сваім скепсісе перад пазітыўнымі навукамі, якім ён праз сваю непаслядоўнасць, як і любы скептыцызм наогул, прыпісвае сапраўдную каштоўнасную значнасць. Светапоглядная філасофія, адпаведна гэтаму, разглядае ўсе асобныя навукі як скарбніцы аб'ектыўнай праўды; і паколькі яна бачыць сваю мэту ў тым, каб па меры магчымасці задаволіць нашу патрэбу ў завяршальным і аб'яднаўчым, усёахопным і ўсёспасцiжным пазнанні, яна разглядае ўсе асобныя навукі як свой падмурак. Яна, зважаючы на гэта, часам называе

сябе нават навуковай філасофіяй, а менавіта — філасофіяй, якая ўзводзіць свае будынкі на падмурку трывалых (feste) навук. Зрэшты, з прычыны таго, што слушна зразуметая навуковасць дысцыпліны змшчае ў сабе не толькі навуковасць падстаў, але таксама і навуковасць мэтавызначальных праблем, навуковых метадаў і, асабліва, пэўную лагічную гармонію паміж ключавымі праблемамі, з аднаго боку, і якраз гэтымі падмуркамі й метадамі — з другога, вызначэнне «навуковая філасофія» кажа нам яшчэ мала пра што. І ў сапраўднасці, яно прымаецца наогул не зусім сур'ёзна. Большасць светапоглядных філосафаў добра адчувае, што ў іх філасофіі з прэтэнзіяй на навуковае значэнне справа ідзе не надта добра, і шмат хто з іх адкрыта і сумленна прызнае, прынамсі, менш высокую ступень навуковасці за сваімі вынікамі. Тым не менш, яны вельмі высока ацэньваюць значэнне такога кшталту філасофіі, якая хоча быць больш светапоглядам, чым сусветнай навукай; шануюць тым вышэй, чым больш скептычна яны менавіта пад уплывам гістарыцызму выступаюць супраць любога імкнення да дакладнай філасофскай сусветнай навукі. Іх матывы, якія адначасова больш падрабязна вызначаюць таксама і сэнс светапогляднай філасофіі, прыблізна наступныя.

Кожная вялікая філасофія ёсць не толькі гістарычным фактам — яна валодае таксама ў развіцці духоўнага жыцця чалавецтва вялікай, нават адзінай свайго кшталту, тэлеалагічнай, функцыяй, а менавіта — функцыяй найвышэйшага ўзмацнення жыццёвага досведу, адукацыі ды мудрасці свайго часу. Спынімся на хвіліну на гэтых паняццях.

*Досвед* як асабістая духоўная ўласцівасць, набытая асобай (persönlicher Habitus), ёсць асадкам здзейсненых на

працягу жыцця актаў натуральнага, спраўджанага праз досвед стаўлення да яе. Ён сутнасна абумоўлены тым, у якой форме асоба — як гэтая адмысловая індывідуальнасць — дапускае матывацыю сваіх дзеянняў актамі свайго ўласнага досведу, а гэтаксама і тым, у якой форме яна дазваляе ўздзеянне на сябе з боку чужых і ўспадкаваных досведаў, што выяўляюцца ў прызнанні або адхіленні іх ёю. Што да актаў пазнання, якія пазначаюцца словам «досвед», то такімі могуць быць пазнанні любога натуральнага тутбыцця або простыя ўспрыманні ды іншыя акты непасрэдна-сузіральнага спазнання, або разумовыя акты, якія грунтуюцца на іх і якія адпавядаюць розным прыступкам лагічнай апрацоўкі й правамернасці. Але гэтага недастаткова. Мы маем у досведзе гэтак жа сама і творы мастацтва ды іншыя каштоўнасці прыгожага; яшчэ і этычныя каштоўнасці (прычым усё адно, дзякуючы нашым уласным этычным паводзінам або навочнаму высвятленню этычных паводзінаў іншых), а таксама практычна прыдатныя або тэхнічныя прылады. Карацей кажучы, мы атрымліваем не толькі тэарэтычныя, але і аксіялагічныя ды практычныя досведы. Аналіз паказвае, што апошнія сваім сузіральным падмуркам маюць каштоўнасна-ацэначнае перажыванне. І на гэтых доследах будуюцца досведныя веды вышэйшага, лагічнага рангу. Згодна з гэтым, усебакова дасведчаны чалавек, або, як мы таксама можам сказаць, *адукаваны*, валодае не толькі света-досведам, але і досведам рэлігійным, эстэтычным, этычным, палітычным, практычна-тэхнічным і г. д., або *адукаванасцю*. Мы ўжываем гэтае, зразумела, надзвычай зацяганае слова «адукаванасць», бо мы маем процілеглае яму слова «неадукаванасць», толькі ў дачыненні да рэлятыўна больш каштоўнасных формаў апісанай духоўнай уласцівасці.

Асабліва ж высокія каштоўнасныя формы абазначаюцца старамодным словам *мудрасць* (сусветная мудрасць, сусветная і жыццёвая мудрасць), а найчасцей — таксама ўпадабаным сёння тэрмінам: погляд на свет і жыццё, або папросту *светапогляд*.

Мы павінны будзем разглядаць мудрасць або светапогляд у гэтым сэнсе як істотны складнік тае яшчэ больш каштоўнай духоўнай уласцівасці чалавека, якая падаецца нам у ідэі дасканалай цноты й абазначае замацаваную ў навыку спраўнасць (habituelle Tüchtigkeit) у сферы ўсіх магчымых напрамкаў чалавечага стаўлення да пазнання, вызначэння каштоўнасцяў і жаданняў. Бо, натуральна, поруч з гэтай спраўнасцю ідзе цалкам развітая здольнасць рабіць разумныя суджэнні наконт прадметнасці такога стаўлення, навакольнага свету, каштоўнасцяў, дабра, учынкаў і г. д., інакш кажучы, здольнасць выразна абгрунтоўваць сваё стаўленне да таго, што ёсць. А гэта ўжо мае на ўвазе мудрасць і належыць да яе вышэйшых формаў.

Мудрасць або светапогляд у гэтым вызначаным сэнсе, хоць ён і ахоплівае сабою цэлае мноства тыпаў і каштоўнасных ступеняў, не ёсць простым дзеяннем канкрэтнай асобы, якая і без таго была б абстракцыяй (што не патрабуе далейшага абгрунтавання); яны належаць культурнаму грамадству і часу, і ў дачыненні да іх найбольш выяўленых формаў абсалютна мае сэнс казаць не толькі пра адукацыю ды светапогляд якога-небудзь асобнага індывіда, але пра адукаванасць і светапогляды часу. І гэта асабліва стасуецца да тых формаў, якія мы цяпер маем на ўвазе.

Фармуляванне ў думцы (die denkmäßige Fassung) унутрана багатай, але для сябе самой яшчэ цьмянай і неспасцігнутай мудрасці, якая жыве ў душы вялікай філасофскай

асобы, адкрывае магчымасць лагічнай апрацоўкі, а на больш высокай культурнай прыступцы — ужыванне пабудаванай на логіцы методыкі, якая выпрацавалася ў дакладных навуках. Само сабою зразумела, што ўвесь змест гэтых навук, якія процістаяць індывіду ў якасці значных патрабаванняў агульнага духу, належыць на гэтай прыступцы развіцця да фундаментальных падстаў паўнавартаснай адукацыі або фарміравання светапогляду. І калі жывыя, і таму надзеленыя велізарнай сілай, перакананні, адукацыйныя матывы часу атрымліваюць не толькі абстрактную фармулёўку, але і лагічнае развіццё ды любую іншую разумовую апрацоўку, а атрыманыя вынікі прыводзяцца, дзякуючы ўзаемадзеянню з новымі поглядамі і разуменнямі, да навуковага ўніфікавання і паслядоўнага завяршэння, то першапачаткова неспасцігнутая мудрасць адчувае надзвычайнае пашырэнне і ўзмацненне. Тады вырастае *светапоглядная філасофія*, якая дае ў сваіх вялікіх сістэмах на сёння найбольш дасканалы адказ на загадкі жыцця ды свету і як найлепшым спосабам рэагуе на тэарэтычныя, аксіялагічныя і практычныя няўзгодненасці жыцця, якія могуць толькі недасканалым чынам быць пераадоленыя досведам, мудрасцю ды звычайнымі поглядамі на свет і жыццё. У той самы час, духоўнае жыццё чалавецтва ідзе ўсё далей і далей, развіваецца разам з багаццем сваіх усё навейшых утварэнняў, сваіх новых духоўных змаганняў, новых досведаў, новых ацэнак і мэтавызначэнняў, з пашырэннем жыццёвага далягляду, да якога далучаюцца ўсе новыя духоўныя ўтварэнні, змяняюцца адукацыя, мудрасць і светапогляд, змяняецца філасофія, уздымаючыся да новых і новых вяршыняў.

Паколькі каштоўнасць светапогляднай філасофіі, а значыць і імкненне да такой філасофіі, абумоўліваецца перш за

ўсё каштоўнасцю мудрасці ды імкненнем да яе, то асобны разгляд мэты, якую яна ставіць перад сабою, наўрад ці патрэбны. Пры нашым шырокім ужыванні паняцця мудрасці яна ўяўляе сабой істотны складнік ідэалу той дасканалай рупнасці, якая дасяжная толькі пры наяўнасці той ці іншай формы жыцця чалавецтва; інакш кажучы, складнік адносна дасканалага канкрэтнага выяўлення ідэі *гуманнасці*. Такім чынам, зразумела, што гэтаксама як кожны павінен імкнуцца быць як найбольш усебакова дасканалай асобаю, спраўнай ува ўсіх асноўных галінах жыцця, якія, у сваю чаргу, адпавядаюць падставовым формам магчымых пунктаў погляду, — так і ў кожнай з гэтых галін быць як найбольш «дасведчаным», як найбольш «мудрым», а таму і як найбольш «любіць мудрасць». У сутнасці, кожны чалавек, што мае памкненні, непазбежна ёсць «філосафам» у самым першапачатковым сэнсе гэтага слова.

З натуральных разважанняў пра тое, які найлепшы шлях вядзе да высокай мэты гуманнасці й, гэткім чынам, да дасканалай мудрасці, як вядома, узнікла асаблівае вучэнне аб мастацтве, вучэнне аб дабрадзейным або спраўным чалавеку. Калі яно прытым, як гэта звычайна бывае, вызначаецца як вучэнне аб слушных учынках, то ад гэтага сутнасна нічога не мяняецца. Бо паслядоўна дасканалыя паводзіны, пра якія тут ідзе гаворка, зводзяцца да дасканалага практычнага характару, а гэты апошні мае на ўвазе дасканаласць паводзінаў з аксіялагічнага і разумовага пункту погляду. Свядомае імкненне да дасканаласці, у сваю чаргу, мае на ўвазе імкненне да ўсебаковай мудрасці. З матэрыяльнага гледзішча гэтая дысцыпліна адсылае асобу, якая імкнецца, да разнастайных груп каштоўнасцяў — у навуках, мастацтвах, рэлігіі і да т. п., — што прызнаюцца

кожным дзейным індывідам як панадсуб'ектныя і абавязковыя значнасці. Адной жа з найвышэйшых сярод гэтых каштоўнасцяў ёсць сама ідэя гэткай мудрасці й дасканалай спраўнасці. Зразумела, што і гэтае — то больш папулярнае, то больш навуковае — этычнае вучэнне аб мастацтве належыць да светапогляднай філасофіі, якая, са свайго боку, з усімі сваімі галінамі, у якіх яна вырасла ў грамадскай свядомасці свайго часу і цалкам пераканаўча выступае перад індывідуальнай свядомасцю як аб'ектыўная значнасць, павінна стаць надзвычай важнай адукацыйнай сілай, фокусам найкаштоўнейшых адукацыйных энергій для найбольш каштоўных асоб часу.

Пасля ўсяго таго, што мы сказалі на карысць светапогляднай філасофіі, можа падацца, нібыта нішто не ў змозе ўтрымаць нас ад *безумоўнай* неабходнасці імкнення да яе.

Нягледзячы на ўсё гэта, аднак, ёсць падставы ўсё ж такі сцвярджаць, што ў дачыненні да ідэі філасофіі павінны быць прынятыя да ўвагі іншыя, а *з пэўных пунктаў погляду* і больш высокія каштоўнасці, а менавіта каштоўнасці *філасофскай навукі*. Пры гэтым трэба падумаць вось над чым. Наша разважанне робіцца з вышыняў навуковай культуры нашага часу, якое ёсць эпохай дакладных навук, што сталіся аб'ектыўна магутнай сілай. Для сучаснай свядомасці ідэі адукацыі або светапогляду і навукі — зразуметыя як ідэі практычныя — дакладна размежаваліся; і яны будуць размежаваныя з гэтага часу і на ўсе часы. Мы можам праз гэта засмучацца, але мы павінны прызнаць гэта за сапраўдны факт, які непазбежна адпаведным чынам вызначае сабой нашы практычныя пункты погляду. Гістарычныя філасофіі, несумненна, былі філасофіямі светапогляднымі, бо сярод іх стваральнікаў панавала цяга

да мудрасці; аднак яны былі ў той жа ступені філасофіямі навуковымі, бо ў іх разам з тым жыла і мэта дакладнай навуковасці. Гэтыя два моманты або не былі зусім размежаваныя, або былі размежаваныя слаба. У практычным імкненні яны зліваліся ў адно і знаходзіліся ў канечных далячынях, як бы высока над апошнімі ні пачуваліся яны сваімі імклівымі розумамі. Гэткае становішча цалкам памянялася з вызначэннем пазачасавай universitas дакладных навук. Пакаленні за пакаленнямі з запалам працуюць над вялізным будынкам навукі й далучаюць да яго свае сціплыя цаглінкі-творы (Werkstücke), выразна ўсведамляючы пры гэтым, што будоўля гэтая бясконцая і яна ніколі й нідзе не дойдзе да свайго завяршэння. Светапогляд хоць і ўяўляе сабою «ідэю», але ён ёсць ідэяй мэты, якая ляжыць у канечным і якая павінна паводле самога свайго прынцыпу быць паступова ажыццёўленай у асобным жыцці; падобна як маральнасць, якая б страціла свой сэнс, калі б была ідэяй нейкага прынцыпова трансфінітнага бясконцага. «Ідэя» светапогляду, як гэта выразна вынікае са зробленага намі вышэй аналізу яе паняцця, мяняецца разам з часам. І, наадварот, «ідэя» навукі — пазачасавая, а гэта значыць, у дадзеным выпадку, не абмежаваная ніякай сувяззю з духам часу. З гэтымі адрозненнямі шчыльна звязаныя істотныя адрозненні ў практычных мэтаскіраванасцях. Нашы жыццёвыя мэты, наогул, маюць дваякі кшталт: адны — для часу, іншыя — для вечнасці; адны служаць нашаму ўласнаму ўдасканаленню і ўдасканаленню нашых сучаснікаў, іншыя — таксама і ўдасканаленню нашых нашчадкаў да самых аддаленых ад нас будучых пакаленняў. Навука ёсць найменнем абсалютных і пазачасавых каштоўнасцяў. Кожная з іх, адзін раз адкрытая, з гэтага моманту належыць да

каштоўнаснай скарбніцы ўсёй рэшты чалавецтва. Кожны навуковы прагрэс ёсць агульным здабыткам чалавецтва наогул і, зразумела, адразу ж вызначае сабой матэрыяльны змест ідэі адукацыі, мудрасці, светапогляду, а такім чынам — і светапогляднай філасофіі.

Вось жа, светапоглядная філасофія і навуковая філасофія размяжоўваюцца як дзве ідэі, у вядомым сэнсе звязаныя, але якія, у той самы час, не належыць змешваць. Пры гэтым трэба памятаць, што першая ідэя не ёсць датычна другой недасканалай рэалізацыяй у часе. Бо калі толькі наша разуменне слушнае, то да гэтага часу, наогул, яшчэ адсутнічае хоць якая рэалізацыя другой ідэі, г. зн. якая-небудзь філасофія, ужо сапраўды дзейсная як дакладная навука, якая-небудзь, хоць бы й недасканалая, «навуковая сістэма», што аб'ектыўна праявіла б сябе ў адзінстве духу даследчыцкай супольнасці нашага часу. З іншага боку, сусветныя філасофіі існавалі яшчэ тысячы гадоў таму. Гэтаксама можна сказаць, што рэалізацыі гэтых ідэй (маючы на ўвазе рэалізацыю і той, і другой) былі б павінны зблізіцца і перакрыжавацца адна з адной у бясконцасці, як дзве асімптоты, наколькі мы можам уявіць сабе бясконцасць навукі фіктыўна, як «бясконца далёкі пункт». Паняцце філасофіі было б трэба ў гэтым выпадку ўжываць адпаведна шырока — гэтак шырока, каб яно разам са спецыфічна-філасофскімі навукамі ахоплівала і ўсе асобныя навукі, пасля таго як яны былі б пераўтворанымі ў філасофію дзякуючы крытычна-разумоваму спасціжэнню і ацэньванню.

Калі мы паглядзім на абедзве размежаваныя ідэі як на змест жыццёвых мэтаў, то, у процілегласць светапогляднаму імкненню, паўстане магчымасць іншага навукова-філасофскага імкнення, якое, выразна ўсведамляючы, што

навука ніколі не можа быць завершаным творам асобнага чалавека, будзе прыкладаць усе свае намаганні дзеля таго, каб дапамагчы навуковай філасофіі аб'явіцца ў агульнай працы з аднадумцамі й паступова развіваць свае сілы. Важнай праблемай сучаснасці, побач з выразным размежаваннем, ёсць таксама рэлятыўная ацэнка гэтых мэтаў, а прытым таксама іх практычнай спалучальнасці.

Трэба ад самага пачатку пагадзіцца, што агульназначнае практычнае рашэнне на карысць той або іншай формы філасофствавання не можа быць прынятае з гледзішча індывідаў, якія гэтым займаюцца. Адны ёсць пераважна тэарэтыкамі, ад прыроды схільнымі й пакліканымі да дакладна навуковага даследавання, бо толькі тая сфера, якая іх прываблівае, і робіць магчымым такое даследаванне. Пры гэтым можа стацца, што цікавасць, і нават гарачая цікавасць, да гэтай галіны будзе вырастаць з патрэб духу, а менавіта — з патрэбы светагляду. У другіх, у эстэтычных і практычных натур (у мастакоў, тэолагаў, юрыстаў і г. д.) усё выглядае зусім інакш. Яны бачаць сваё пакліканне ў ажыццяўленні эстэтычных і практычных ідэалаў, г. зн. ідэалаў пазатэарэтычнай сферы. Мы далучаем сюды таксама тэолагаў, юрыстаў і, у шырокім сэнсе, даследнікаў тэхнікі ды пісьменнікаў, бо яны спрыяюць сваімі творамі не толькі чыстай тэорыі, але, перш за ўсё, імкнуцца зрабіць уплыў на практыку. Вядома, у самой жыццёвай рэчаіснасці гэтае адрозненне не гэткае выразнае; і акурат у той час, калі практычныя матывы ўладна выступаюць наперад, тэарэтычная натура можа паддацца з іх боку ўплыву мацнейшаму, чым тое дазваляе яе тэарэтычнае пакліканне. У гэтым палягае асабліва вялікая небяспека, што пагражае філасофіі нашага часу.

Але пытанне павінна быць пастаўлена не толькі з пункту погляду індывіда, але і з гледзішча чалавецтва ды гісторыі, бо мы задумваемся над тым, што значыць для развіцця культуры, для магчымасці паступовага здзяйснення адзінай ідэі чалавецтва — не чалавека *in individuo*, — і над тым, ці гэтае пытанне будзе вырашанае пераважна ў тым ці іншым сэнсе, інакш кажучы, што імкненне да адной формы філасофіі будзе цалкам панаваць у дадзены момант і праз гэта адамруць усе іншыя імкненні — прыкладам, імкненне да навуковай філасофіі. І гэта ж таксама — практычнае пытанне. Бо нашы гістарычныя ўплывы, а значыць, і нашы этычныя адказнасці, сягаюць да самых далёкіх абсягаў этычнага ідэалу, да таго пункту, які пазначаецца ідэяй развіцця чалавецтва.

Цалкам зразумела, якім чынам мусіла б вырашыцца пытанне для асобы з тэарэтычнымі схільнасцямі, *калі б* ужо меліся ў наяўнасці несумненныя пачаткі філасофскіх вучэнняў. Звернем наш позірк на іншыя навукі. Любая першародная матэматычная або прыродазнаўчая «мудрасць» ды вучэнне пра мудрасць страчваюць сваё права на існаванне ў той меры, у якой адпаведнае ім тэарэтычнае вучэнне атрымлівае аб'ектыўна значнае абгрунтаванне. Навука сказала сваё слова, і з гэтага моманту мудрасць павінна вучыцца ў яе. Прыроднанавуковае імкненне да мудрасці не было неправамерным папярэдне да тут-быцця дакладнай навукі, і заднім днём яно не можа быць дыскрэдытаванае для *свайго* часу. У плыннасці жыцця, маючы практычную патрэбнасць ацэньваць, чалавек не мог чакаць, аж пакуль праз тысячагоддзі сфарміруецца навука — як што нават дапускаць, што ён ужо наогул ведаў ідэю дакладнай навукі.

З іншага боку, кожная, нават самая канкрэтная навука, уяўляе сабою толькі абмежавана развітую тэарэтычную

сістэму, аточаную бясконцым даляглядам няздзейсненай яшчэ ў рэчаіснасці навукі. Што ж павінна быць сапраўднаю мэтай для гэтага далягляду: далейшая распрацоўка дакладнага вучэння або «погляд», «мудрасць»? Чалавек-тэарэтык, прыродазнавец паводле паклікання, не будзе тут вагацца з адказам. У тых пунктах, дзе навука прамаўляе сваё слова, калі нават гэта здарыцца праз стагоддзі, — ён будзе грэблівы да цьмяных «поглядаў». Яму здалося б навуковым грэхападзеннем *прапаноўваць* свабодную пабудову «поглядаў» на прыроду. І, несумненна, у гэтым ён адстойвае права будучага чалавецтва. Дакладныя навукі абавязаныя сваім значэннем і багатай энергічнасцю свайго паступовага развіцця найперш менавіта радыкалізму такога спосабу мыслення. Відавочна, кожны канкрэтны даследчык ставарае сабе «погляды»; ён глядзіць, сузіраючы, прадчуваючы і мяркуючы, па-за межы цвёрда абгрунтаванага, але толькі з метадычнымі намерамі: каб усталяваць новыя моманты дакладнай тэорыі. Такі пункт погляду не выключае таго, што сузіранне, досвед у данавуковым сэнсе хоць ужо і злучаецца з навуковымі вызначэннямі, але тым не менш выконвае важную ролю ў сферы прыродазнаўчай тэхнікі, што вельмі добра вядома і самому прыродазнаўцу. Тэхнічныя задачы патрабуюць свайго вырашэння: і дом, і машыны павінны быць пабудаваныя; няма магчымасці чакаць да таго часу, аж пакуль прыродазнаўства здолее даць дакладную справаздачу пра ўсё, што здзяйсняецца. Таму тэхнік як практык прымае іншыя рашэнні, чым тэарэтык-прыродазнаўца. Ад гэтага апошняга ён запазычвае вучэнне, а з жыцця бярэ «досвед». Не зусім так яно адбываецца з навуковай філасофіяй, і менавіта з той прычыны, што тут яшчэ не закладзеныя нават пачаткі навукова-даклад-

най тэорыі; гістарычна ўспадкаваная філасофія, якая замяняе яе сабою, ёсць, у найлепшым выпадку, навуковым паўфабрыкатам або незразумелай і бязладнай мешанінай светапогляду і тэарэтычнага пазнання. З іншага боку, мы й тут, на жаль, не можам чакаць. Філасофская нястача (die philosophische Not), як нястача светапогляду, падганяе нас. І яна робіцца ўсё мацнейшаю ў працэсе далейшага пашырэння межаў пазітыўных навук. Неймавернае багацце навукова «тлумачаных» фактаў, якімі апошнія нас абдорваюць, не можа дапамагчы нам, бо гэтыя факты прынцыпова ствараюць разам з усёю сукупнасцю навук новае вымярэнне загадак, вырашэнне якіх ёсць для нас жыццёва важным пытаннем. Прыродазнаўчыя навукі не разгадалі для нас ні ў адным асобным пункце загадкавасць актуальнай рэчаіснасці — той рэчаіснасці, у якой мы жывём, дзейнічаем і існуем. Агульная вера ў тое, што *гэта* — іх функцыя, што яны проста яшчэ недастаткова развітыя і што яны прынцыпова здольныя гэта зрабіць, разглядаецца больш празорлівымі людзьмі як забабоны. Неабходнае размежаванне прыродазнаўства і філасофіі як навукі, прынцыпова зусім інакш пабудаванай, якая — хоць і мае істотныя стасункі з прыродазнаўствам у пэўным абсягу — знаходзіцца на шляху да свайго здзяйснення і спасціжэння. Прыгадайма словы Лотцэ[1]: «Разлічыць ходу сусветнага жыцця не значыць зразумець яго». З гэтага пункту погляду становішча ў гуманітарных навуках не выглядае лепшым.

1 Тут, відавочна, маецца на ўвазе Герман Лотцэ (1817–1881), нямецкі медык і філосаф, адна з самых уплывовых постацяў у нямецкай акадэмічнай філасофіі XIX ст. — *Заўв. перакладчыка*.

«Зразумець» духоўнае жыццё чалавецтва — гэта, вядома, вялікая і цудоўная справа. Але, на жаль, і гэтае разуменне таксама не можа дапамагчы нам і не павінна змешвацца з разуменнем філасофскім, якое абавязана адкрыць для нас загадкі свету і жыцця.

Духоўная нястача нашага часу зрабілася напраўду нясцерпнаю. Калі б яшчэ наш спакой турбавала толькі тэарэтычная невыразнасць адносна сэнсу даследаваных навукамі аб прыродзе і духу «рэальнасцяў», а менавіта тое, наколькі імі спазнаецца быццё ў сваім канчатковым сэнсе, што такое гэтае «абсалютнае» быццё і ці пазнавальнае яно наогул. Але ж не: мы трываем самую радыкальную *жыццёвую нястачу*, такую нястачу, якая пашыраецца на ўсё наша жыццё. Кожны момант жыцця ёсць вызначэннем пункту погляду, кожны пункт погляду падпарадкоўваецца якой-небудзь павіннасці, якому-небудзь займанню пазіцыі што да значнасці або нязначнасці паводле меркаваных нормаў абсалютнага значэння. Пакуль гэтыя нормы былі недатыкальнымі, пакуль яны не былі парушанымі й высмеянымі праз скептыцызм, да таго часу *адзіным* жыццёвым пытаннем было пытанне наконт таго, якім чынам лепш за ўсё было ім адпавядаць. Але як жа быць цяпер, калі ўсе нормы разам і кожная паасобку аспрэчваюцца або па-эмпірычнаму скажаюцца і калі яны пазбаўленыя свайго ідэальнага значэння? Натуралісты й гістарыцысты змагаюцца за светапогляд, аднак і тыя, і другія з розных бакоў прыкладаюць свае намаганні да таго, каб ператлумачыць ідэі ў факты, а ўсю рэчаіснасць, усё жыццё, ператварыць у незразумелую безыдэйную мешаніну «фактаў». Усім ім уласцівыя забабоны фактычнасці. Цалкам зразумела, што мы не можам чакаць. Мы павінны заняць пазіцыю, мы

павінны спрабаваць знішчыць у разумным, хоць бы й ненавуковым, «паглядзе на свет » дысгармоніі нашага стаўлення да рэчаіснасці — да жыццёвай рэчаіснасці, якая мае для нас значэнне, у якой мы павінны мець значэнне. І калі светапоглядны філосаф нам шчодра дапамагае ў гэтым, ці маем мы адвагу не быць яму ўдзячнымі?

Як бы шмат праўды ні было ў толькі што прызнаным намі за істотнае, наколькі мала ні хацелі б мы пазбавіцца таго духоўнага ўзвышэння і ўзрушанасці, якія даюць нам старыя і новыя філасофіі, — трэба, з іншага боку, настойваць на тым, што мы павінны памятаць пра тую адказнасць, якую мы нясём на сабе перад чалавецтвам. Дзеля часу мы не павінны ахвяраваць вечнасцю; каб злагодзіць нашу патрэбу, мы не павінны перадаваць нашчадкам нашу нястачу як зусім непазбежнае зло. Нястача вырастае тут з навукі. Але толькі навука здольная канчаткова пераадолець нястачу, якая паходзіць з навукі. Паколькі скептычная крытыка з боку натуралістаў і гістарыцыстаў ператварае сапраўдную аб'ектыўную значнасць ува ўсіх сферах павіннасці ў бязглуздзіцу, паколькі невыразныя, няўзгодненыя — хоць і натуральным чынам спароджаныя — паняцці, рэфлексіі ды, у сувязі з гэтым, шматзначныя або несапраўдныя праблемы ўскладняюць разуменне рэчаіснасці ды магчымасць разумнага да яе стаўлення, паколькі адмысловы метадычны пункт погляду, які ўсё ж такі неабходны для шырокага класа навук, уведзены ў звычку, набывае няздольнасць да ператварэння ў іншыя пункты погляду, а з гэтымі забабонамі шчыльна звязаны прыгнятальны дух супярэчнасці ўспрымання свету, — то супраць гэткіх і падобнага кшталту праяў зла існуе толькі *адзін* гаючы сродак: навуковая крытыка плюс радыкальная,

якая пачынаецца ад самых нізоў, навука, угрунтаваная на цвёрдым падмурку і дзейсная паводле самага дакладнага метаду — філасофская навука, за якую мы тут выступаем. Светапогляды могуць спрачацца міжсобку, але толькі навука можа вырашаць, і менавіта яе рашэнне мае на сабе пячатку вечнасці.

Такім чынам, куды б ні скіроўвалася філасофія ў сваіх пераменах, несумненным застаецца тое, што яна не мае права адмаўляцца ад імкнення да дакладнай навуковасці, што, наадварот, яна як тэарэтычная навука павінна процістаўляць сябе практычнаму імкненню да светапогляду і цалкам свядома адмежавацца ад яго. Бо тут таксама павінны быць адкінутыя любыя спробы замірэння. Магчыма, што абаронцы новай светапогляднай філасофіі запярэчаць: заняткі ёю зусім не павінны сведчыць пра адмаўленне ад ідэі дакладнай навуковасці. Сапраўдны светапоглядны філосаф, маўляў, мае навыкі не толькі штосьці абгрунтоўваць, г. зн. не толькі прымае за ўстойлівы будаўнічы матэрыял усе здабыткі асобных дакладных навук, але ён карыстаецца таксама і навуковым метадам ды ахвотна выкарыстоўвае любую магчымасць дакладна навуковага развіцця філасофскіх праблем. Маўляў, толькі ў процілегласць метафізічнай нясмеласці і скептыцызму папярэдняй эпохі ён адважна рушыць па слядах самых высокіх метафізічных праблем, каб дасягнуць мэты светапогляду, які, паводле патрабаванняў часу, гарманічна задавальняў бы інтэлект і душу.

Паколькі пры гэтым маецца на ўвазе кампрамісны шлях дзеля таго, каб сцерці рысу, што падзяляе філасофію светапоглядную і філасофію навуковую, мы мусім засцерагчы супраць яго. Ён можа прывесці толькі да паслаблення на-

вуковага імкнення і спрыяць уяўна навуковай літаратуры, якой не хапае інтэлектуальнай сумленнасці. Тут не можа быць кампрамісу, як яго не можа быць у любой іншай навуцы. Нам няма чаго спадзявацца на тэарэтычныя вынікі, калі толькі светапоглядная цяга робіцца *ўсеўладнаю* ды сваімі навуковымі формамі ўводзіць у зман таксама і натуры, схільныя да тэарэтычнага мыслення. Там, дзе за тысячагоддзі вялікія навуковыя розумы, палка кіраваныя навуковым імкненнем, не дасягнулі ў філасофіі хоць бы часткова чыстага вучэння, але стварылі ўсё вялікае, зробленае імі, што праўда, у недасканалым выглядзе, усё ж адно пад уплывам гэтага імкнення, — якраз там сусветныя філосафы не павінны спадзявацца мімаходзь спрыяць поспеху філасофскай навукі і магчы канчаткова абгрунтаваць яе. Яны, якія ставяць сабе за мэту канечнае і якія хочуць мець сваю сістэму як мага раней, каб жыць у адпаведнасці з ёй, — да гэтага аніяк не пакліканыя. Тут трэба зрабіць толькі адно: светапоглядная філасофія павінна сама цалкам сумленна адмовіцца ад прэтэнзіі быць навукаю і, дзякуючы гэтаму, перастаць бянтэжыць розумы — што і напраўду супярэчыць яе чыстым намерам — ды запавольваць прагрэс навуковай філасофіі.

Яе ідэальнай мэтай заставаўся б чысты светапогляд, які паводле сутнасці сваёй не ёсць навукай. І тут яна не павінна дазволіць збіць сябе з тропу тым фанатызмам навуковасці, які ў наш час занадта распаўсюджаны й адпрэчвае ўсё тое, што не дапускае «навукова канкрэтнага» метаду — як «ненавуковае». Навука ёсць толькі адной сярод іншых аднолькава раўнапраўных каштоўнасцяў. Тое, што каштоўнасць светапогляду асабліва трывала стаіць на сваёй уласнай падставе, што светапогляд трэба трактаваць як habitus і ства-

рэнне асобнай асобы, а навуку — як стварэнне калектыўнай працы пакаленняў даследчыкаў, мы высветлілі для сябе вышэй. І падобна да таго, як і светапогляд, і навука маюць свае розныя крыніцы каштоўнасці, гэтак маюць яны й свае розныя функцыі ды свае розныя спосабы ўздзеяння і навучання. Светапоглядная філасофія вучыць гэтак жа сама, як вучыць мудрасць: асоба звяртаецца тут да асобы. Звяртацца з павучаннем у стылі *такой* філасофіі да шырокіх колаў грамадскасці павінен толькі той, хто пакліканы да гэтага сваёю выключнаю індывідуальнасцю і мудрасцю, або той, хто служыць вышэйшым практычным — рэлігійным, этычным, юрыдычным і да т. п. — інтарэсам. У той самы час, навука — безасабовая. Яе працаўнік мае патрэбу не ў мудрасці, а ў тэарэтычных здольнасцях. Яго ўклад узбагачае скарбніцу вечна значных рэчаў, якая павінна служыць дабрабыту чалавецтва. І, як мы ўжо бачылі вышэй, гэта мае выключнае значэнне для філасофскай навукі.

Толькі тады, калі ў свядомасці якога-небудзь часу ажыццявіцца поўнае размежаванне гэтых дзвюх філасофій — толькі тады можна будзе марыць пра тое, што філасофія набудзе форму і мову сапраўднай навукі й прызнае недасканаласцю тое, што было ў ёй столькі разоў узнятае да нябёсаў і служыла нават аб᾽ектам пераймання, а менавіта — глыбакадумнасць. Глыбакадумнасць ёсць знакам хаосу, які сапраўдная навука імкнецца ператварыць у космас, у просты, безумоўна ясны парадак. Сапраўдная навука не ведае глыбакадумнасці ў межах свайго сапраўднага вучэння. Кожная частка гатовай навукі ёсць пэўнай цэласнасцю ходаў думкі, сярод якіх кожны непасрэдна ясны й зусім не глыбакадумны. Глыбакадумнасць ёсць справай мудрасці; адцягненая зразумеласць і яснасць ёсць справай дакладнай

тэорыі.Ператварэнне спадзяванняў глыбакадумнасці ў выразныя рацыянальныя ўтварэнні — вось у чым палягае сутнасць працэсу новаўтварэння дакладных навук. Канкрэтныя навукі таксама мелі свой працяглы перыяд глыбакадумнасці; і падобна да таго, як яны ў перыяд Рэнесансу ў сваім змаганні ўзняліся ад глыбакадумнасці да навуковай яснасці, так і філасофія — я наважваюся спадзявацца — уздымецца да гэтай апошняй у тым змаганні, якое ідзе сёння. А дзеля гэтага патрэбная толькі сапраўдная дакладнасць мэты й вялікая воля, свядома скіраваная на мэту; воля, якая выкарыстоўвае ўсе, што ёсць у яе распараджэнні, навуковыя тэорыі. Наш час прынята называць часам занепаду. Я не згодзен прызнаць слушнасць такога папроку. Наўрад ці можна знайсці ў гісторыі такі перыяд, які прывёў бы ў рух столькі творчых сіл і дасягнуў бы такіх поспехаў. Мы можам не заўсёды ўхваляць мэты, мы можам таксама засмучацца, што ў больш спакойныя і поўныя мірнага ды больш прыемнага жыцця эпохі выраслі такія кветкі духоўнага жыцця, якіх мы не знаходзім цяпер і пра якія мы нават не можам марыць. І ўсё ж такі, як бы ні адштурхоўвала эстэтычнае пачуццё, якому так блізка адпавядае наіўнае хараство таго, што свабодна вырастае, таго, што мы ўсё зноў і зноў сцвярджаем у наш час нашаю воляй, — усё ж такі бясконца вялікія каштоўнасці знаходзяцца ў сферы волі, паколькі вялікая воля заўсёды мае перад сабою толькі сапраўдныя мэты. Было б, аднак, вельмі несправядліва прыпісваць нашаму часу імкненне да самага нізкага. Той, хто здольны абудзіць веру, хто здольны прымусіць зразумець веліч якой-небудзь мэты й натхніцца ёю, — той без вялікіх намаганняў знойдзе сілы, якія б рушылі ў гэтым кірунку. Я мяркую, што наш

час паводле свайго паклікання — вялікі час; адно што ён пакутуе на скептыцызм, які прывёў да распаду старыя нявысветленыя ідэалы. І таму менавіта ён пакутуе ад занадта слабога развіцця і нямогласці філасофіі, якая яшчэ недастаткова моцная, недастаткова навуковая, каб быць здольнаю пераадолець скептычны негатывізм (які называе сябе пазітывізмам) пры дапамозе сапраўднага пазітывізму. Наш час хоча верыць толькі ў «рэальнасці». І вось ягонай трывалай рэальнасцю ёсць навука; вось жа, філасофская навука — гэта тое, чаго найбольш бракуе ў наш час.

Але калі мы звяртаемся да гэтай вялікай мэты, тлумачачы сам сэнс нашага часу, то мы павінны выразна сказаць сабе і тое, што мы можам дасягнуць гэтага толькі адным шляхам, а менавіта — не прымаючы разам з радыкалізмам, які ёсць складнікам сутнасці сапраўднай філасофскай навукі, нічога папярэдне дадзенага, не дазваляючы аніякай традыцыі служыць пачаткам і не даючы ніякаму, хоць бы і найвялікшаму, імю асляпіць нас, але, наадварот, імкнучыся знайсці сапраўдныя пачаткі ў свабодным даследаванні саміх праблем, свабодна прытрымліваючыся вымаганняў, што з іх вынікаюць.

Вядома, мы маем патрэбу таксама і ў гісторыі. Зразумела, не дзеля таго, каб губляцца, як гісторык, у тых сувязях развіцця, у якіх узгадаваліся вялікія філасофіі, але дзеля таго, каб даць магчымасць ім самім уплываць на нас паводле іх своеасаблівага духоўнага зместу. І сапраўды, з гэтых гістарычных філасофій нам насустрач — калі толькі мы ўмеем сузіральна ўкараніцца ў іх, пракрасціся ў душу іх слоў і тэорый — моцнай плынню цячэ філасофскае *жыццё* з усім багаццем і сілай жыватворных матывацый. Аднак не праз філасофіі мы становімся філосафамі. Толькі

безнадзейныя спробы народзяцца з імкнення заставацца пры гістарычным, праяўляць сябе пры гэтым толькі ў гісторыка-крытычнай дзейнасці й дамагацца філасофскай навукі ў эклектычнай перапрацоўцы або ў анахраністычным адраджэнні. Штуршок да даследавання павінен *выходзіць не ад філасофіі, а ад рэчаў і праблем*. Бо філасофія паводле сваёй сутнасці ёсць навукай пра сапраўдныя пачаткі, пра вытокі, пра ῥιζώματα πάντων[1]. Навука пра радыкальнае павінна быць радыкальнаю — з любога гледзішча радыкальнаю, таксама і ў сваіх учынках. І перш за ўсё яна не павінна супакойвацца, аж пакуль не дасягне *сваіх* абсалютна ясных пачаткаў, г. зн. сваіх абсалютна ясных праблем, у самым сэнсе гэтых праблем прадвызначаных метадаў і найглыбейшага пласта выразна дадзеных рэчаў. Не варта толькі *ніколі* аддавацца радыкальнай беззабабоннасці й ад самага пачатку атаесамляць такія «рэчы» з эмпірычнымі «фактамі», г. зн. заплюшчваць вочы перад ідэямі, якія ўсё ж у вялікім абсягу абсалютна дадзеныя ў непасрэдным сузіранні. Мы яшчэ занадта паняволеныя тымі забабонамі, што паходзяць з Рэнесансу. Чалавеку, сапраўды вольнаму ад забабонаў, усё адно, адкуль паходзіць нейкае канкрэтнае сцверджанне: ад Канта або Тамаша Аквінскага, ад Дарвіна або Арыстотэля, ад Гельмгольца або Парацэльса. Няма патрэбы дамагацца ўсё бачыць на свае вочы — тут важна не адмаўляць убачанага пад ціскам забабонаў. З прычыны таго, што ў найбольш уплывовых навуках Новага часу, а менавіта ў матэматычна-фізічных, вялікая частка працы выконваецца паводле ненаўпроставых метадаў, мы занадта схільныя пераацэньваць ненаўпроставыя метады

[1] Карані ўсяго (*ст.-грэцк.*).

й недаацэньваць значэнне беспасярэдніх спасціжэнняў. Але філасофія ў сваёй навуковай працы, паводле самой сваёй сутнасці — паколькі яна скіроўваецца да апошніх пачаткаў — змушаная рухацца ў атмасферы непасрэднай інтуіцыі, і найвялікшым крокам, які павінен зрабіць наш час, ёсць прызнанне таго, што пры філасофскай у праўдзівым сэнсе слова інтуіцыі, пры *фенаменалагічным спасціжэнні* сутнасці адкрываюцца бясконцае поле працы ды такая навука, якая здольная атрымаць масу дакладных і вырашальных для *любой* далейшай філасофіі ведаў без якіх-кольвечы метадаў пасярэдняй сімвалізацыі й матэматызацыі, без апарату высноў і доказаў.

# ЭДМУНД ГУСЭРЛЬ

*Кароткая біябібліяграфічная даведка*

Эдмунд Густаў Альбрэхт Гусэрль (1859, Просніц / Просцеёў, Аўстрыйская імперыя, Маравія — 1938, Фрайбург-ім-Брайсгау, Германія) — аўстрыйска-нямецкі філосаф габрэйскага паходжання, заснавальнік фенаменалогіі і адмысловага метаду аналізу свядомасці, з дапамогай якога ён імкнуўся надаць філасофіі характар дакладнай навукі. Яго вучэнне мела і па-ранейшаму мае ўплыў амаль на ўсе філасофскія школы, што існуюць да сёння.

Эдмунд Гусэрль нарадзіўся 8 красавіка 1859 г. у сям'і гандляра жаночымі капелюшамі, яго хатняй мовай быў ідыш. Вучыўся ў венскай рэальнай вучэльні, закончыў гімназію ў Ольмюцы (цяпер Оламаўц, Чэхія). Вывучаў матэматыку і філасофію ва ўніверсітэтах Ляйпцыга (1876—78), Берліна (1878—81) і Вены (1884—86), дзе, сярод іншага, слухаў лекцыі матэматыка Карла Ваерштраса, філосафаў Вільгельма Вунта, Карла Штумпфа, Франца Брэнтана, прычым апошняга ён пазней назваў сваім галоўным настаўнікам. У 1886 г. Гусэрль прыняў пратэстанцкае веравызнанне. Выкладаў ува ўніверсітэтах Гале-Вітэнберга (1887—1901), Гётынгена (1901—16), Фрайбурга-ім-Брайсгау (1916—28). Быў ганаровым доктарам універсітэтаў Лондана, Парыжа, Прагі, Бостана, сябрам Гайдэльбергскай акадэміі навук, Амерыканскай акадэміі мастацтваў і навук і Брытанскай акадэміі. Выступаў з прыватнымі лекцыямі ў Парыжы, Лондане, Празе, Вене. Яго самымі знакамітымі вучнямі сталі Марцін Гайдэгер, а таксама Людвіг Ландгрэбэ і Яўген Фінк. Пасля прыходу да ўлады ў Германіі

нацыстаў Гусэрль сутыкнуўся з дыскрымінацыяй праз сваё габрэйскае паходжанне, у т. л. атрымаў забарону чытання лекцый і публікацыі новых прац; пры гэтым у 1933 г. ён адхіліў прапанову пераехаць у Каліфорнію (ЗША). У 1937 г. Эдмунд Гусэрль цяжка захварэў на плеўрыт. Памёр 27 красавіка 1938 г., неўзабаве пасля таго, як яму споўнілася 79 гадоў.

*Асноўныя працы*: «Пра паняцце ліку. Псіхалагічны аналіз» (1887), «Філасофія арыфметыкі» (1891), «Лагічныя даследаванні» (у 2-х тт., 1900), «Ідэі чыстай фенаменалогіі або фенаменалагічнай філасофіі» (1913), «Лекцыі па фенаменалогіі ўнутранай часавай свядомасці» (1928), «Фармальная і трансцэндэнтальная логіка» (1929), «Пасляслоўе да маіх "Ідэй чыстай фенаменалогіі або фенаменалагічнай філасофіі"» (1930), «Картэзіянскія разважанні» (1931), «Крызіс еўрапейскіх навук і трансцэндэнтальная фенаменалогія» (1936), «Досвед і суджэнне. Даследаванні фенаменалогіі логікі» (апубл. пасмяротна, 1939).

*Андрэй Бурлуцкі*[1]

# МЕСЦА І РОЛЯ ФІЛАСОФІІ Ў КАНТЭКСЦЕ ФЕНАМЕНАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАЎ ЭДМУНДА ГУСЭРЛЯ[2]

Заснавальнік фенаменалогіі Эдмунд Гусэрль (1859—1938) першапачаткова вызначае філасофію як «дакладную навуку», якая з моманту свайго ўзнікнення прэтэндуе на задавальненне самых высокіх тэарэтычных запытаў і тлумачэнне любых феноменаў аб'ектыўнай рэальнасці пры дапамозе «чыстых формаў розуму». Прэтэнзіі філасофіі стаць «дакладнай навукай», на думку навукоўца, не знайшлі рэалізацыі ні ў адной з гістарычных эпох з тае прычыны, што філасофія (практычна да XX стагоддзя) не здолела дакладна сфармуляваць даследчыя праблемы, вызначыць метады, абгрунтаваць тэорыі. Яна не ставіла перад сабою задачы, як гэта рабілі эмпірычныя навукі аб прыродзе і духу, і тым самым не змагла трансфармавацца ў дзейсную «дакладную навуку». Сутнасць філасофіі, якая не прэтэндавала на навуковасць, раскрыў Кант, калі сцвярджаў, што можна навучыцца філасофстваваць, але навучыцца філасофіі нельга.

---

1 Андрэй Бурлуцкі (нар. у 1968 г.) — кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры гісторыі рэлігіі ў Мытнай акадэміі Растова-на-Доне (Расійская Федэрацыя), сярод іншага даследчык філасофскай спадчыны Эдмунда Гусэрля. Артыкул публікуецца ў перакладзе на беларускую мову з ласкавай згоды аўтара.

2 Пераклад Лявона Баршчэўскага паводле: «*Философия права*». 2010. № 1(38). С. 70—74.

Гусэрль прызнае недасканаласць сучаснай яму філасофіі, якая, паводле яго меркавання, існуе толькі на ўзроўні «пунктаў погляду» і якая не валодае агульнай сістэмай ідэй, вучэнняў, метадаў. Філосаф актуалізуе шэраг пытанняў («Ці магчымая філасофія як дакладная навука?», «Чым наогул ёсць “дакладная навука”»?», «Ці магчымая філасофія як метадалогія навуковага пазнання?» і да т. п.) і заклікае здзейсніць «пераварот» у філасофіі, падобны да платонаўскага, дэкартаўскага, кантыянскага. У той самы час, Гусэрль крытыкуе філасофію Гегеля, якую ён абвінавачвае ў скажэнні сапраўдных памкненняў філасофіі быць навукай, паколькі «...яго сістэме не хапае філасофска-навуковай прыроды крытыкі розуму, якая ў першую чаргу робіць магчымай навуковасць філасофіі»[1].

Навуковая неўгрунтаванасць папярэдняй філасофіі абумоўлівае стварэнне дакладнай навуковай філасофіі, якая мае здольнасць адысці ад спекулятыўных разважанняў і прапануе новую канкрэтную метадалогію пазнання. На ролю навуковай філасофіі ў пачатку XX стагоддзя пачала прэтэндаваць фенаменалогія. Паводле задумы Гусэрля, фенаменалогія мусіла выйсці па-за межы нямецкай універсітэцкай філасофіі й як метадалагічная база легчы ў падмурак усіх сучасных навук аб свядомасці (фенаменалагічная псіхалогія, трансцэндэнтальная фенаменалогія) і быцці (універсальная анталогія).

Навуковую рэформу філасофіі Гусэрль прапануе пачаць з крытыкі, па-першае, натуралістычнай філасофіі, заснаванай на прынцыпе натуралізму, па-другое, філасофіі

[1] Гуссерль Э. *Философия как строгая наука* // Избранные труды. М., 2005. С. 190. (*Гл. с. 10 гэтага выдання*).

светапогляду, у падмурку якой ляжыць прынцып гістарыцызму. Філосаф паказвае, што натуралізм як гнасеалагічны прынцып узнік у выніку «адкрыцця прыроды», якая існуе ў адзінстве прасторава-часавага быцця паводле дакладных законаў прыроды, а гістарыцызм — з прычыны «адкрыцця гісторыі» ды абгрунтавання новых навук аб духу.

Адкрыццё прыроды й духу спрыяла фарміраванню спосабаў філасофствавання ў кантэксце пазнання цэласнага быцця. Аднак спроба ўжываць гэтыя спосабы «заўсёды і ўсюды» прывяла да абмежавання пазнання і адыходу філасофіі ад дакладнай навуковасці. «Менавіта ў той энергіі, — піша Гусэрль, — з якой натуралізм імкнецца рэалізаваць прынцып дакладных навуковых метадаў ува ўсіх сферах прыроды і духу, у тэорыі і на практыцы, і з якой ён імкнецца навукова — на яго думку, «менавіта навукова» — палягае яго заслуга і, у той жа час...»[1] галоўная праблема, г. зн. *натуралізацыя свядомасці*. Свядомасць, якая рэалізуецца ў рамках натуралізму, прапануе толькі адзін шлях — эмпірычны, у якім свет заўсёды ёсцьісным і спраўджваецца эксперыментальна.

Гусэрль абгрунтоўвае праблему філасофіі як «дакладнай навукі» ў метадалагічным вымярэнні сваіх даследаванняў. Таму ўжыванне прыродазнаўчай эксперыментальнай метадалогіі недастатковае дзеля разумення поўнага онталагічнага сэнсу навакольнага свету як у вонкавай (натуральнанавуковай) яго праяве, так і ўва ўнутранай (псіхалагічнай). Нават такая навука, як псіхалогія, што вывучае ўнутраныя перажывальныя «Я», на думку Гусэрля, не здольная вызваліцца

---

1 Гуссерль Э. *Философия как строгая наука* // Избранные труды. М., 2005. С. 194. (*Гл. с. 15 гэтага выдання*).

ад натуралізму з дапамогай толькі прыродазнаўчага досведу і «з нагоды фізічнай прыроды».

Гістарыцызм, як і натуралізм, мяркуе сябе толькі ў сферы фактаў эмпірычнага духоўнага жыцця. Ён «запачаткоўвае жыццё рэлятывізму, вельмі роднаснага натуралістычнаму псіхалагізму і ўблытанага ў аналагічныя скептычныя цяжкасці»[1]. Гусэрль паказвае, што гісторыя — гэта эмпірычная навука аб духу наогул, якая не здольная сваімі сіламі нічога вырашыць ані ў станоўчым, ані ў адмоўным плане. Гісторыя не можа вызначыць, напрыклад, адрозненні «...паміж рэлігіяй як творам культуры й рэлігіяй як ідэяй, г. зн. значнай рэлігіяй; паміж мастацтвам як творам культуры й значным мастацтвам, паміж гістарычным і значным правам і, нарэшце, паміж гістарычнай і значнай філасофіяй»[2]. Не заўважаючы такіх істотных адрозненняў, гісторыя не здольная бачыць дачыненні паміж ідэяй і фенаменальнай формай, якая сябе выяўляе.

Калі натуральная філасофія і філасофія светапоглядная не здольныя выявіць «першага паводле прыроды» і «першага для нас», ці магчыма пазнанне прадметаў і з'яў аб'ектыўнага свету ў сутнасным і фармальным адзінстве? Гусэрль адказвае станоўча, заклікаючы вярнуцца «назад да досведу, да сузірання сутнасці феноменаў», да метаду саманазірання. Дзеля гэтага, на яго думку, неабходна стварыць новую навуку аб свядомасці, прычым навуку, адрозную ад «прыродазнаўства свядомасці» (псіхалогіі), г. зн. *фенаменалогію свядомасці*.

---

1 Гуссерль Э. *Философия как строгая наука* // Избранные труды. М., 2005. С. 222. (*Гл. с. 58 гэтага выдання*).

2 Тамсама, с. 224. (*Гл. с. 62 гэтага выдання*).

Гусэрль мяркуе, што філасофія, выступаючы як «дакладная навука», магчымая як фенаменалогія і што адзіным і асноўным яе прадметам можа быць толькі свядомасць, а метадам яе даследавання — апісанне, або фенаменалагічная дэскрыпцыя. Дэскрыпцыя як неабходная ўмова фенаменалагічнага даследавання свядомасці вызначаецца шэрагам метадалагічных працэдур: рэдукцыяй (ачышчэнне свядомасці), інтэнцыяй (скіраванасць свядомасці на рэдукаваны прадмет з мэтай выяўлення яе сутнасці), дэскрыпцыяй (апісаннем) інтэнцыянальных дадзенасцяў. Дэскрыпцыю ўвогуле «можна характарызаваць і як поўную вызначанасць інтэнцыянальных прадметаў, і як аналітыку актаў, у якіх мяркуюцца інтэнцыянальныя дадзенасці, і як рэканструкцыю фенаменалагічнага метаду ў цэлым»[1].

Эдмунд Гусэрль звяртае ўвагу на тое, што філосаф не можа задавальвацца наіўным навуковым веданнем пра свет. Ён мусіць даследаваць сутнасць усіх прадметаў, з'яў, законаў прыроды. «Калі навука будуе тэорыі для сістэматычнага ажыццяўлення сваіх праблем, то філосаф пытаецца, у чым сутнасць тэорыі, што наогул робіць магчымым тэорыю і да т. п. Толькі філасофскае даследаванне дапаўняе навуковыя працы прыродазнаўца і матэматыка ды завяршае чыстае і сапраўднае тэарэтычнае пазнанне»[2]. Такім чынам, фенаменалогія прэтэндуе на пабудову «філасофіі як дакладнай навукі», або навуковай тэорыі навуковага пазнання. Яна прапануе новыя інструменты дзеля сістэматычнага пераа-

1 Серкова В. А. *Феноменологическая дескрипция*. СПб., 2003. С. 249.

2 Гуссерль Э. *Логические исследования*. СПб., 1907. Т. 1. С. 254.

сэнсавання ўсіх навук, у прыватнасці філасофіі, і асноўная яе мэта палягае ў тым, каб пабудаваць навуку аб навуцы, здольную выршыць галоўную гнасеалагічную праблему — праблему «аб'ектыўнасці пазнання».

Фенаменалогія Гусэрля — гэта новая філасофія, якая актуалізуе шэраг праблем, ідэй, метадалагічных і катэгарыяльных установак, даследчых тэндэнцый. Прыярытэтна прадметам фенаменалогіі выступае свядомасць (у адрозненне, напрыклад, ад класічнай філасофіі, што зрабіла прадметам свайго даследавання быццё), якой адводзіцца роля гнасеалагічнага падмурку. Філасофскае даследаванне, на думку Гусэрля, «павінна быць скіраванае на навуковае пазнанне сутнасці свядомасці, на тое, чым «ёсць» сама свядомасць ува ўсіх яе адрозных выяўленнях, у адпаведнасці са сваёй сутнасцю, але, у той жа час, скіраванае на тое, што гэта «значыць», а таксама на розныя спосабы, якімі яно — у адпаведнасці з прыродай гэтых выяўленняў… азначае штосьці прадметнае і, відавочна, «даказвае» гэта як «сапраўднае», «рэальна» бытнае»[1]. Не выпадкова гусэрлеўскую фенаменалогію называюць філасофіяй свядомасці.

Свядомасць, механізмы яе функцыянавання займаюць асаблівае месца ў філасофскай творчасці Гусэрля. Яна ўяўляецца стрыжнявой тэмай як у эйдычнай, так і ў трансцэндэнтальнай фенаменалогіі. Істотна адзначыць, што навуковец тлумачыць свядомасць не так, як яе разумелі Дэкарт і Кант. У адрозненне ад Дэкарта, Гусэрль не разглядаў свядомасць як субстанцыю, як нейкую «рэч» свету, уключаную ў казуальныя стасункі. Паводле Гусэрля,

---

1 Гуссерль Э. *Философия как строгая наука* // Избранные труды. М., 2005. С. 199. (*Гл. с. 22 гэтага выдання*).

свядомасць — гэта падстава суб'ектыўнага жыцця, у якой «канстытуюецца магчымы наяўны свет» праз спантаннасць інтэнцыянальных актаў, што адлюстроўваюць прадметы фізічнай або псіхічнай прыроды[1]. Свядомасць — гэта сфера сутнасных або апрыёрных («першых паводле прыроды») дачыненняў і меркаванняў, якія рэалізуюцца на ўзроўні суб'екта. Менавіта таму для фенаменалогіі важным ёсць пастулат, паводле якога свядомасць павінна даследавацца па-філасофску (на аснове суб'ектыўнага досведу), а не з дапамогай метадаў іншых навук.

У адрозненне ад Канта, які прытрымліваўся ідэі трансцэндэнтнага канструктывізму як спосабу функцыянавання свядомасці, Гусэрль не ёсць канструктывістам. Згодна з Кантам, пры фіксацыі якога-небудзь факту можна выявіць і выбудаваць групу пэўных чыннікаў як умоў яго магчымасці. Калі атрыманая канструкцыя ў цэлым утварае сістэму, якая дазваляе вывесці з яе дадзены факт, то ў межах трансцэндэнтальнага абгрунтавання яна можа лічыцца цалкам дакладнай. Паводле ж Гусэрля, у філасофскіх даследаваннях канструктывісцкая стратэгія свядомасці не можа быць дарэшты дакладнаю. У гэтым выпадку трэба кіравацца правілам звяртання да досведу. Звяртанне да досведу абумоўлівае філасофскую творчасць, заснаваную на аналізе дадзенасцяў досведу і фундаментальных, найбольш істотных схем і прынцыпаў функцыянавання свядомасці. Менавіта ў гэтым палягае сутнасць фенаменалагічнай метадалогіі, накіраванай не на тлумачэнні, а на апісанне і аналіз актаў свядомасці. Падчас фенаменалагічнага аналітычнага

---

1 Гуссерль Э. *Феноменология*. Статья в Британской энциклопедии // Логос. 1991. Вып. 1. С. 16.

апісання выяўляецца сутнасць з'яў, якія фіксуюцца ў нашым досведным жыцці.

Фенаменалагічная свядомасць адрозніваецца ад прыродазнаўчай і светасузіральнай свядомасці й зводзіцца да ідэі інтэнцыянальнасці, якую Гусэрль вызначаў як «скіраванасць на», г. зн. скіраванасць свядомасці на які-небудзь прадмет. Скіраванасць свядомасці на аналізаваны прадмет і выяўленне яго апрыёрнай сутнасці ёсць галоўнаю ўласцівасцю індывідуальнай свядомасці. Інтэнцыянальная характарыстыка аналізаванага прадмета ёсць носьбітам аб'ектыўнага сэнсу, сутнасным складнікам свядомасці індывіда.

Інтэнцыянальнасць як «скіраванасць на», або меркаванне прадметнасці, можа існаваць толькі пры ўсведамленні прадмета. Інтэнцыянальнасць фарміруе сэнсавую структуру свядомасці, не зрэдукаваную да псіхічных і фізічных сувязяў; існуе ў выглядзе адзінай структуры акту меркавання прадмета (*ноэзіс*) і яго прадметнага сэнсу (*ноэмы*), прычым апошні не залежыць ад існавання прадмета або ягонай дадзенасці.

Эдмунд Гусэрль, актуалізуючы свядомасць у фенаменалагічным разуменні, крытыкуе тэндэнцыю развіцця эксперыментальнай псіхалогіі, якая разглядала логіку як частку псіхалогіі. Гэтая тэндэнцыя зводзілася да псіхалагізму, які ў пачатку XX стагоддзя прэтэндаваў на ролю абсалютна дакладнай, заснаванай на эксперыменце і звязанай з тэорыяй логікі філасофскай метадалогіі. Навуковец мяркуе, што дакладную эмпірычную псіхалогію можна пабудаваць толькі ў межах фенаменалагічнай (эйдычнай) псіхалогіі, заснаванай на ўжыванні дэскрыптыўнага метаду. Фенаменалогію наогул Гусэрль разглядае як філасофскі метад, на падставе

якога і можа быць створаная фенаменалагічная псіхалогія (апрыёрная навука) і трансцэндэнтальная фенаменалогія (навука аб свядомасці ды разуменні сэнсаў быцця).

Такім чынам, дэскрыптыўная фенаменалагічная псіхалогія, або эйдычная фенаменалогія, — гэта новая з метадалагічнага гледзішча псіхалогія, якая адмаўляецца ад даследавання псіхічнага (у гэтым выпадку — псіхафізіялагічнага) як праявы фізічнага свету. Асноўная задача фенаменалагічнай псіхалогіі палягае ў выяўленні апрыёрных сутнасцяў усіх рэчаў і з'яў, г. зн. тых сутнасцяў, якія аб'ектыўна «першыя паводле прыроды» і якія суб'ектыўна выяўляюцца, пазнаюцца пры ўжыванні фенаменалагічнай метадалогіі.

У адрозненне ад фенаменалагічнай псіхалогіі, Гусэрль разглядае эксперыментальную псіхалогію ў межах вывучэння канкрэтнай сувязі натуральных прасторава-часавых дадзенасцяў, а прадмет яе даследавання зводзіць да суб'ектыўных перажыванняў (успрыманне, мысленне, адлюстраванне і да т. п.), г. зн. да прысутнасці ў свеце свядомасці ў выглядзе EGO.

Прадметам любой псіхалогіі, паводле Гусэрля, павінен быць суб'ект, які перажывае, надзелены свядомасцю, паколькі ён і ёсць паказчыкам наяўнасці свядомасці. Аднак тут важна паказаць, што фенаменалагічная псіхалогія — гэта чыстая псіхалогія, адрозная ад псіхалогіі як часткі антрапалогіі ды заалогіі, дзе чалавек і жывёла могуць перажываць на ўзроўні фізічнага свету, г. зн. псіхалогіі як часткі прыродазнаўства.

Фенаменалагічная, або чыстая, псіхалогія перш за ўсё грунтуецца на аналізе псіхалагічнага досведу, які з'яўляецца з дапамогай рэфлексіі, але часам у скажоным выглядзе (рэфлексія здзяйсняе любы досвед, у тым ліку

і на фізічным узроўні). Псіхічны досвед у межах фенаменалагічнай рэфлексіі засяроджвае ўвагу на суб'ектыўным досведзе (акце псіхічных перажыванняў). Тое, што з'яўляецца з дапамогай фенаменалагічнай рэфлексіі, незалежна, рэальнае яно ці не, ёсць феноменамі (плынямі розных з'яў-актаў) або «свядомасцю адносна» чагосьці. «Свядомасць адносна» чагосьці заўсёды інтэнцыянальная, г. зн. скіраваная на спасціжэнне апрыёрнай сутнасці феноменаў. Феномены, у сваю чаргу, — суадносныя са свядомасцю. Звычайная мова схоплівае гэтую суадноснасць у маўленчых зваротах: «я думаў пра нешта», «я спалохаўся чагосьці» і г. д.[1].

Гусэрль дапускае існаванне такой свядомасці, якая была б не звязаная з рэфлексіяй. Такая свядомасць, або падсвядомасць, штодзённая свядомасць на ўзроўні аўтаматызму і да т. п., не інтэнцыянальная, яна «ідэнтуецца», або ідэнтыфікуецца. Рэфлексія разумее «ідэнтаванасць» як іманентны працэс, уласцівы любому перажыванню, што рэалізуецца ў розных формах.

Толькі ўсведамленне якой-небудзь з'явы ў розных варыянтах яе выяўлення дазваляе спазнаць уласную інтэнцыянальную структуру феномена, якая ёсць сістэмай індывідуальных інтэнцый і інтэнцыянальна злучаных кампанентаў. Інтэнцыянальнае перажыванне, г. зн. успрыманне, адлюстраванне, асэнсаванне бесперапыннай варыянтнасці якога-небудзь выяўлення з'явы мяркуецца як яе існаванне, а назіранне за шматварыянтнаю «плынню» з'яў-актаў — як «свядомасць адносна» чагосьці. Інтэнцыянальнае перажы-

---

1 Гуссерль Э. *Феноменология*. Статья в Британской энциклопедии // Логос. 1991. Вып. 1. С. 12–13.

ванне, плынь свядомасці ёсць рэальнасцю феноменаў, якія фіксуюцца ў фенаменалагічным апісанні.

Адрозненне эксперыментальнай псіхалогіі ад чыстай або фенаменалагічнай псіхалогіі палягае ў даследчай задачы апошняй, якая зводзіцца да вывучэння формаў інтэнцыянальных перажыванняў у кантэксце рэдукцыі (ачышчэння) іх структур да першасных інтэнцый. Фенаменалагічная псіхалогія павінна найперш раскрываць рэдукаваныя інтэнцыі, з якіх складаецца рэальнае «жыццё грамадства», якое вызначаецца як сукупнасць досведу ўласнага «Я» і досведу іншых «Я» ў нашай свядомасці[1].

Фенаменалогія вывучае досвед свайго ўласнага «Я» і на яго падставе — досвед іншых «Я» (досвед грамадства). Аднак узнікае пытанне: ці можна дасягнуць унутранага (сукупнага) фенаменалагічнага досведу свайго «Я», які не супярэчыць досведу іншых «Я», і пры гэтым пазбегнуць вонкавага досведу эксперыментальнай псіхалогіі? Гусэрль паказвае, што псіхолаг усведамляе ўласны псіхалагічны досвед праз злучэнне яго з досведам «вонкавага жыцця», а фенаменолаг — праз інтэнцыянальны досвед «унутранага жыцця». Дзеля дасягнення чыстага досведу свайго «Я» фенаменолаг павінен практыкаваць *эпахэ́* — адмову ад суджэнняў, што датычацца аб'ектыўнага свету, які мяркуецца ў прыродазнаўчым поглядзе.

*Эпахэ* ёсць актам «узяцця свету ў дужкі», г. зн. выключэннем натуральнага, прыроднага свету «які ён ёсць» з поля зроку суб'екта і заменай яго светам, які «перажываецца — успрымаецца — узгадваецца — выяўляецца» праз

[1] Гуссерль Э. *Феноменология*. Статья в Британской энциклопедии // Логос. 1991. Вып. 1. С. 13–14.

суджэнні, думкі, ацэнкі. Пры выкарыстанні *эпахэ* свет (або яго частка) не з'яўляецца сам па сабе, ён набывае адмысловы фенаменалагічны апрыёрны сэнс.

Згодна з Гусэрлем, дасягненне сапраўднага, інтэнцыянальнага сэнсу свету магчымае праз ужыванне фенаменалагічнай рэдукцыі да феноменаў, што патрабуе рэалізацыі двух метадалагічных узроўняў: па-першае, выкарыстання *эпахэ*, па-другое, апісання, або дэскрыпцыі, феноменаў, якія ўжо не ёсць аб'ектамі , а «адзінкамі сэнсу». Фенаменалагічная дэскрыпцыя, у сваю чаргу, прадугледжвае апісанне акту перажывання, успрымання, асэнсавання (*ноэзіс* — мысленне) і акту апісання «таго, што перажытае», таго, што набыло сэнс (*ноэма* — сэнс).

Рэалізацыя фенаменалагічнага досведу пры «ўзяцці ў дужкі» аб'ектыўнага свету (*эпахэ*) і апісанні таго, што з'яўляецца потым (*ноэзіс*, *ноэма*), бачыцца адзіна слушным досведам («унутраным досведам» на ўзроўні эйдычнага бачання), які не мае аніякіх пазнаўчых межаў. Фенаменалагічная рэдукцыя, скіраваная на зразуменне апрыёрнай сутнасці феноменаў, ёсць інтэлектуальна інтуітыўным дасягненнем эйдасаў, без якіх феномен пазбаўлены сутнасных характарыстык і паўстае толькі як факт, прыклад. Гусэрль зазначае, што «дакуль сягае інтуіцыя, сузіральная свядомасць, датуль сягае таксама магчымасць, якая адпавядае "ідэацыі"... або "сузіранню сутнасці"»[1].

Фенаменалагічны досвед, заснаваны на фенаменалагічнай рэдукцыі, можа распаўсюджвацца з абсягу досведу ўласнага «Я» на абсягі досведу іншых «Я». Агульнасць фенаменалагічнага досведу ўласнага і іншых «Я» дазваляе дасягнуць

---

[1] Гуссерль Э. *Философия как строгая наука* // Избранные труды. М., 2005. С. 199. (*Гл. с. 45 гэтага выдання*).

фенаменалагічнага адзінства свету і выступае крытэрам існавання феноменаў. Шлях такога дасягнення ляжыць у рэдукаванні ўласнай індывідуальнай свядомасці і інтэрсуб'ектыўнай рэдукцыі, пад якой Гусэрль разумее агульнасць асоб, якія ўдзельнічаюць у інтэрсуб'ектыўным свядомым жыцці, а таксама падабенства ўспрымання шмат якіх «Я» паводле аднаго інтэнцыянальнага прадмета[1].

Філосаф звяртае ўвагу на тое, што магчымасць інтэрсуб'ектыўнай рэдукцыі абумоўлівае з'яўленне новай філасофіі, новай метадалогіі філасофскіх даследаванняў. Станаўленне такой філасофіі звязанае з пераходам ад фенаменалагічнай псіхалогіі да трансцэндэнтальнай фенаменалогіі, якая выкарыстоўвае трансцэндэнтальную рэдукцыю як працяг рэдукцыі псіхалагічнага досведу. Трансцэндэнтальная фенаменалогія рэдукуе псіхалагічна вычышчаную, эйдычную інтэрсуб'ектыўнасць да трансцэндэнтальнай інтэрсуб'ектыўнасці, г. зн. да такой універсальнай інтэрсуб'ектыўнасці, якая «канстытуюе свет».

Пры здзяйсненні *эпахэ* псіхалагічная інтэрсуб'ектыўнасць пераходзіць, трансфармуецца ў трансцэндэнтальную інтэрсуб'ектыўнасць, такую канкрэтную першааснову, «дзякуючы якой усё, што трансцэндуецца свядомасцю, у тым ліку і любая рэальнасць у свеце, набывае сэнс свайго існавання. Бо любое існаванне паводле самой сутнасці сваёй «адноснае» і абавязанае сваёй прыродаю адзінству інтэнцыі, якая, усталяваная паводле трансцэндэнтальных законаў, спараджае свядомасць з яе характарам веры й перакананняў»[2].

---

1 Гуссерль Э. *Феноменология*. Статья в Британской энциклопедии // Логос. 1991. Вып. 1. С. 14–16.

2 Тамсама, с. 19.

Такім чынам, фенаменалогія як дакладная філасофская навука, або навука аб канкрэтных феноменах, уласцівых суб'ектыўнасці й інтэрсуб'ектыўнасці, ёсць апрыёрнай навукаю пра ўсе магчымыя віды існавання. Прадмет фенаменалогіі ўніверсальны, паколькі няма такіх апрыёрных сутнасцяў, якія б не залежалі ад інтэнцыянальнага канструявання ды суб'ектыўнага выяўлення. Фенаменалагічная метадалогія закліканая вырашыць задачу апісання ўніверсуму апрыёрных сутнасцяў, якія рэалізуюцца пры дапамозе прывядзення ўсіх аб'ектыўнасцяў да іх трансцэндэнтальнага пачатку, што спасцігаецца ў трансцэндэнтальнай інтэрсуб'ектыўнасці.

Прэтэнзія фенаменалогіі на ролю ўніверсальнай філасофіі як навукі й новай метадалогіі пазнання, якая ахоплівае ўсю сукупнасць ведаў пра свет, яе прэтэнзія на пераварот у філасофіі знайшлі сваё адлюстраванне ў прадметным і метадалагічным пастулаце: пазнавальнасць фенаменальнага свету не мае межаў. Асноўная тэза фенаменалогіі зводзіцца да таго, што ўсе філасофскія праблемы маюць сваё месца ў межах фенаменалогіі, якая здольная выявіць у крыніцы трансцэндэнтальнага досведу, або эйдычнай інтуіцыі, істотныя характарыстыкі свету ды вылучыць спосабы іх спасціжэння. Значэнне «новай філасофіі» ў гэтым выпадку зводзіцца да актуалізацыі «новай метадалогіі», г. зн. фенаменалагічнага спасціжэння рознага кшталту сутнасцяў на падставе інтуіцыі, якая дазваляе пазбегнуць усялякіх спекулятыўных метадаў, а таксама непатрэбных спекулятыўных лагічных вывадаў і доказаў.

# СЛОЎНІК
# НАЙЧАСЦЕЙ УЖЫВАНЫХ ТЭРМІНАЎ І ВЫЗНАЧЭННЯЎ ФІЛАСОФІІ ГУСЭРЛЯ

**Abbild** *n* выява, адлюстраванне
**Abbildung** *f* ілюстрацыя; рэпрадукцыя
**Abbildungsbewusstsein** *n* адлюстравальная свядомасць
**Abgebildetes** *n* выяўленае
**Abgehobenheit** *f* выразнасць
**Abgeschattetes** *n* адцененае, вылучанае
**Abhängigkeiten** *pl* залежнасці
**Ablösbarkeit** *f* зменлівасць
**Abnormalität** *f* адхіленне ад нормы
**Abschattung** *f* нюанс; адцяненне
**Abschätzen** *n* ацэньванне
**Absolutes** *n* абсалютнае
**Absprechen** *n* адмаўленне
**Abstossung** *f* адштурхоўванне
**Abstrakta** *pl* абстрактныя вызначэнні
**Abstraktion** *f* абстракцыя
**Absurdität** *f* абсурд(насць)
**Abwandlung** *f* мадыфікацыя, варыяцыя
**Abweichungen** *pl* адхіленні, скажэнні
**Abwendungen** *pl* кружныя шляхі
**Achten** *n* зважанне
**Achtsamkeit** *f* уважлівасць
**Adäquation** *f* прыроўніванне
**Affektivität** *f* раздражняльнасць
**Affirmation** *f* пацверджанне, сцвярджэнне
**Akterlebnis** *n* перажыванне акту дзейнасці
**Aktimpressionen** *pl* уражанні ад акту дзейнасці
**Aktintention** *f* намер дзеяння
**Aktionen** *pl* дзеянні
**Aktivität** *f* дзейнасць
**Aktkorrelate** *pl* карэляты акту дзейнасці
**Aktmotivationen** *pl* матывацыі дзейнасці
**Aktnoemata** *pl* наэмы актаў дзейнасці
**Aktqualitäten** *pl* якасці акту дзейнасці
**Aktregungen** *pl* памкненні да дзейнасці
**Aktualisierung** *f* актуалізацыя, абнаўленне
**Aktualität** *f* актуальнасць
**Aktualitätsmodus** *m* модус актуальнасці
**Aktvollzug** *m* здзяйсненне акту дзейнасці

**Akzeptionen** *pl* акцэптацыі, пацвярджэнні згоды
**Allgemeines** *n* усеагульнае, універсальнае
**Allgemeinheit** *f* універсальнасць
**Allgemeinheitsbewusstsein** *n* свядомасць універсальнасці
**Allgemein-Menschliches** *n* агульначалавечае
**Allgemeinschaft** *f* універсальнасць
**Allheit** *f* усёбдымнасць; цэласнасць
**Allnatur** *f* усёабдымная прырода
**Alltagserfahrung** *f* досвед штодзённасці
**Alltagserkennen** *n* штодзённае (побытавае) пазнанне
**Alltagswelt** *f* штодзённы свет
**Allzeitlichkeit** *f* усечасавасць, універсальнасць
**Als(-)ob** *n* Нібыта, Нібы-існае
**an sich** як такі, сам у сабе; уласна
**Analogieschluss** *m* выснова паводле аналогіі
**Analogisierung** *f* аналагізацыя, стварэнне аналагу
**Analytisches** *n* аналітычнае
**Anderes** *n* іншае
**anderes ego, anderes Ich** другое Я
**Andersbestimmung** *f* інашае вызначэнне
**Anderssein** *n* іншабыццё
**Angemutetsein** *n* меркаванасць
**Angeschautes** *n* разгляданае
**apodiktisch** ападыктычны
**Äquivokation** *f* двухсэнсоўнасць
attentional атэнцыянальны
**Axiologie** *f* аксіялогія
**Bedingtheit** *f* абумоўленасць
**Begleittatsache** *f* спадарожны факт
**Begründbarkeit** *f* магчымасць абгрунтавання
**Beschaffenheit** *f* структура, будова
**Bewussthaben** *n* усведамленне сябе
**Bewusstsein** *n* свядомасць; усведамленне
**Bewusstseinsgegebenheiten** *pl* дадзенасці свядомасці
**Bewusstseinsgegenwart** *f* прысутнасць свядомасці
**bewusstseinsmäßig** свядомасна, усвядомлена
**Bewusstseinsvorkommnisse** *pl* праявы свядомасці
**Bezeichnetes** *n* (п)азначанае
**Beziehungen** *pl* дачыненні
**Bezogenheit** *f* суаднесенасць
**Correlatum, Korrelatum** *n* карэлят
**Dasein** *n* тут-быццё
**Daseinsthesis** *f* тэза тут-быцця
**Definitheit** *f* вызначанасць
**Denkakte** *pl* мысленчыя акты

**Denken** *n* мысленне
**Denkenergie** *f* інтэлектуальная энергія
**Denkgegenständlichkeit** *f* прадметнасць думкі
**Denkgesetze** *pl* мысленчыя законы
**denkmäßig** мысленны, у думках
**Denkphänomen** *n* феномен мыслення
**deskriptiv** дэскрыптыўны, апісальны
**Dies** *n* Гэта(е)
**Diesheit** *f* стан Гэтага, гэтавасць
**Dignität** *f* годнасць
**Dimension** *f* вымярэнне
**Ding** *n* рэч
**Ding** *n* **an sich** рэч-у-сабе
**Ding** *n* **selbst** самасная рэч
**Dinganschauung** *f* сузіранне рэчы
**Dingapperzeption** *f* аперцэпцыя рэчы
**Dingauffassung** *f* успрыманне рэчы
**Dinglichkeit** *f* рэчавасць
**Ding-überhaupt** *n* рэч-наогул
**Dingzusammenhang** *m* повязь рэчаў
**Disposition** *f* склад, стан
**Ding-Sinn** *m* рэчавы сэнс
**Dingwelt** *f* матэрыяльны свет, свет рэчаў
**Doppelauffassung** *f* падвойнае ўспрыманне
**Doxa** *f* вера (у боскую рэчаіснасць)
**doxisch** звязаны з верай
**Dunkelheit** *f* цьмянасць
**Ego** *n* *гл.* Ich
**Egologie** *f* эгалогія
**Eidetik** *f* эйдэтызм
**eidetisch** эйдэтычны
**Eidos** *n* эйдас
**Eigenheit** *f* (свое)асаблівасць
**Eigenschaft** *f* уласцівасць
**Eigensein** *n* уласнае быццё
**Eigenwesen** *n* уласная існасць
**Einbildung** *f* уяўленне
**Einfühlung** *f* пранікненне адчуваннем
**Einsehen** *n* уразуменне
**Einsicht** *f* разважанне, меркаванне
**Einstellung** *f* погляд, арыентацыя, стаўленне
**Empfängliches** *n* успрымальнае
**Empfindnis** *n* непасрэднае ўспрыманне
**Empfindsamkeit** *f* тонкая ўспрымальнасць, чуллівасць
**Empfindungsmonismus** *m* манізм успрыманняў
**empirisch** эмпірычны, спраўджаны досведам
**Empirismus** *m* эмпірызм
**Endliches** *n* канечнае, концае
**Energetismus** *m* энергетызм
**Epoché** *f* эпахэ, адмова (устрыманне) ад суджэння

**Erfahren** *n* пазнаванне
**Erfahrung** *f* досвед
**erfahrungs-** эмпірычны, доведны
**erfahrungslogisch** кіраваны логікай досведу
**erfahrungsmäßig** згодны з доведам, адпаведны досведу
**Erfahrungstatsachen** *pl* факты досведу
**Erfahrungsurteil** *m* эмпірычнае суджэнне
**Erfahrungswissenschaft** *f* эмпірычная навука
**Erfahrungszusammenhang** *m* ланцужок досведу
**Erfassen** *n* працэс спасціжэння
**Erfassung** *f* спасціжэнне
**Erfüllung** *f* здзяйсненне, выкананне
**Erinnertes** *n* узгаданае
**Erinnerung** *f* успамін
**Erkenntnis** *f* пазнанне
**Erkenntnisakt** *m* акт пазнання
**Erkenntnisphänomen** *n* феномен пазнання
**Erkenntnisstufe** *f* ступень пазнання
**Erkenntnistheorie** *f* тэорыя пазнання; гнасеалогія; эпістэмалогія
**Erkenntnistrieb** *m* імкненне да пазнання, прага пазнання
**Erlebnis** *n* перажыванне
**Erlebnisstrom** *m* плынь перажыванняў
**Erscheinen** *n* з'яўленне
**Erscheinendes** *n* тое, што з'яўляецца
**Erscheinung** *f* з'ява
**erstes Sein** *n* першабыццё
**Erwartetes** *n* чаканае
**Essenz** *f* галоўная сутнасць
**ethisch** этычны
**Ethos** *n* этас, духоўны склад; маральнае аблічча
**Etwas** *n* Нешта
**Evidenz** *f* відавочнасць; неабвержнасць
**exakt** канкрэтны; тэарэтычны, фундаментальны
**exakte Wissenschaft** *f* прыватная (канкрэтная, спецыяльная) навука
**Existenz** *f* існаванне; экзістэнцыя
**existenzial** экзістэнцыяльны
**Existenzialsetzung** *f* экзістэнцыяльны пастулат
**Explikation** *f* растлумачэнне
**explizit** эксплiцытны
**Extension** *f* пашырэнне
**Fähigkeit** *f* здольнасць
**Faktizität** *f* фактычнасць, доказальнасць
**Faktum** *n* *гл.* Tatsache
**Fehlwirkung** *f* фальшывае ўздзеянне
**formallogisch** фармальна-лагічны

**Fremderfahrung** *f* досвед чужога
**Fremdes** *n* чужое, чужасць
**Ganzes** *n* сукупнасць; цэлае
**Gattung** *f* разнавіднасць; род; гатунак
**Gebrauchsobjekt** *n* прадмет ужытку
**Gefallen** *n* прыемнасць; прыхільнасць
**Gegebenheit** *f* дадзенасць
**Gegebenheitsbewußtsein** *n* свядомасць дадзенасці
**Gegebensein** *n гл.* Gegebenheit
**Gegenstand** *m* прадмет, аб'ект
**Gegenständliches** *n* прадметнае
**Gegenstand-überhaupt** *m* прадмет-наогул
**Gegenüber** *n* процілегласць
**Gegenwart** *f* сучаснасць
**gegenwärtigend** самавыяўляльны
**Gegenwärtiges** *n* існае цяпер, сучаснае
**Geglaubtes** *n* прынятае на веру
**Gehen** *n* знікненне, сыход
**Geist** *m* дух
**Geisteswelt** *f* свет сацыяльных суб'ектаў
**Geisteswissenschaften** *pl* гуманітарныя навукі, гуманістыка
**Geltung** *f* вартасць, значнасць
**Geltungswert** *m* вартасць сапраўднасці
**Gemeinschaft** *f* супольнасць
**Gemeintes** *n* падразумяванае
**Gemüt** *n* душа; характар, нораў
**Gemütsakt** *m* эмацыйнае дзеянне
**Gemütserlebnis** *n* душэўнае перажыванне
**Genesis** *f* генезіс, паходжанне
**Genosse** *m* таварыш, кампаньён
**Gesamtzustand** *m* агульны стан; усеагульнае становішча
**Geschichte** *f* гісторыя
**Gesetzlichkeit** *f* законы; законнасць
**Gesinnung** *f* спосаб мыслення, склад думак
**Gespenst** *n* прывід, здань
**Gestalt** *f* фігура; форма, кшталт
**Gewertetes** *n* каштоўнасна ацэненае
**Gewissheit** *f* упэўненасць, пэўнасць
**Gewohnheit** *f* звычка
**Glauben** *m* вера
**Glaubensgewissheit** *f* пэўнасць веры
**Gültigkeit** *f* сапраўднасць; дзейснасць
**Gutes** *n* добрае; дабро
**Habitualität** *f* сталы характар, звыкласць
**Habitus** *m* навык; аблічча
**Handeln** *n* дзеянне; дзейнасць
**Hegelianismus** *m* гегельянства
**Hier und Jetzt** тут-і-цяпер

**Hineinschauen** *n* сузіральнае пранікненне
**Hintergrund** *m* тло, задні план, заплечча
**Historizismus** *m* гістарыцызм
**Hof** *m* арэол, німб
**Horizont** *m* (бачны) абсяг, далягляд, гарызонт
**hyletisch** хілетычны, матэрыяльны
**Ich** *n* «я», «эга»
**Icherlebnis** *n* «я» як перажыванне
**Ichheit** *f* Я, уласная асоба
**ichlich** засяроджаны на «я», суб'ектыўны
**Ich-Mensch** *m* эгаіст
**Ichsubjekt** *n* я-суб'ект
**Idealität** *f* ідэальнасць
**Ideation** *f* ідэацыя
**Idee** *f* ідэя
**Identifiziertes** *n* ідэнтыфікаванае
**Identität** *f* ідэнтычнасць, тоеснасць; асоба
**immanent** іманентны
**Immanenz** *f* іманентнасць
**Impression** *f* (першаснае) уражанне
**Individualität** *f* індывідуальнасць
**Individuation** *f* індывідуацыя
**Individuelles** *n* індывідуальнае
**Individuum** *n* індывід(уум)
**Inhalt** *m* змест; змесціва
**Intention** *f* намер; інтэнцыя
**intentional** інтэнцыянальны
**Intentionalität** *f* інтэнцыянальнасць
**Intersubjektivität** *f* інтэрсуб'ектыўнасць
**Intuition** *f* інтуіцыя
**Irrealität** *f* ірэальнасць
**Kategorie** *f* катэгорыя
**Kausalität** *f* каўзальнасць, прычыннасць,
**Klarheit** *f* выразнасць, яснасць
**Klärung** *f* удакладненне; высвятленне
**Kolligieren** *n* складанне, збіранне
**Kommen** *n* узнікненне, прыход
**Kommunikation** *f* зносіны, камунікацыя
**Komprehension** *f* разуменне; кемлівасць
**Konkretum** *n* канкрэтнае паняцце
**Konstitution** *f* утварэнне; будова
**konstitutiv** складовы; асноўны
**Körper** *m* цела
**Körperwelt** *f* цялесны свет
**Kulturgestaltung** *f* твор культуры
**Kulturwelt** *f* культурны свет
**Kunstwerk** *n* твор мастацтва
**Lebenswelt** *f* жыццёвае асяроддзе
**Lehrgebäude** *n* тэарэтычна-філасофская пабудова

**Lehrgehalt** *m* тэарэтычны змест
**Lehrsystem** *n* тэарэтычная сістэма
**Leib** *m гл.* Kцrper
**Leitfaden** *m* праводная нітка
**Logik** *f* логіка
**logisch** лагічны, прыналежны да логікі
**Logos** *m* Логас
**Lokalisation** *f* лакалізацыя, месцазнаходжанне
**Mannigfaltigkeit** *f* разнастайнасць
**Materialität** *f* матэрыяльнасць
**Materie** *f* матэрыя
**materiell** матэрыяльны
**Medium** *n* сродак; спосаб
**Meinen** *n* выказванне меркавання
**Meinung** *f* меркаванне, думка
**Menge** *f* мноства, маса
**Menschenauffassung** *f* успрыманне (трактаванне) чалавека
**Menschen-Ich** *n* чалавечае Я
**Menschheit** *f* чалавецтва
**Metaphysik** *f* метафізіка
**Methode** *f* метад
**Mitbedeutung** *f* пабочнае значэнне, канатацыя
**Modi der Aufmerksamkeit** *pl* модусы ўвагі
**Modifikation** *f* мадыфікацыя
**Möglichkeit** *f* магчымасць
**Möglichkeitsbewusstsein** *n* свядомасць магчымасці
**Möglichsein** *n* магчымае быццё
**Monade** *f* манада
**Motivation** *f* матывацыя
**mundan** зямны; свецкі
**Nachher** *n* быццё пасля
**Natur** *f* прырода; натура
**Naturalisierung** *f* апрыроджванне, натуралізаванне
**Naturalismus** *m* натуралізм
**Naturalist** *m* (навуковец-) прыродазнаўца
**naturalistisch** натуралісцкі; натуралістычны
**Naturbeziehung** *f* дачыненне з прыродай
**Naturgesetze** *pl* законы прыроды
**Naturforscher** *f* даследчык прыроды; *гл. тс.* Naturalist
**Naturkausalität** *f* натуральная прычыннасць
**natürlich** натуральны; прыродны
**Naturobjekt** *n* прыродны аб'ект
**Naturwissenschaft** *f* прыродазнаўчая навука
**naturwissenschaftlich** прыродазнаўча-навуковы
**Naturzusammenhang** *m* цэласнасць прыроды
**Nebenmenschen** *pl* людзі вакол нас
**Negation** *f* адмаўленне

**Neutralisierung** *f* нейтралізацыя
**Neutralität** *f* нейтральнасць
**Nicht-Ich** *n* Не-я
**Nichtsein** *n* нябыт
**Noema** *n* ноэма
**noematisch** наэматычны
**Noese** *f*, **Noesis** *f* ноэзіс
**noetisch** наэтычны
**Normalität** *f* нармальнасць
**Notwendigkeit** *f* неабходнасць
**Objekt** *n* аб'ект, прадмет
**objektiv** аб'ектыўны
**Objektivation** *f* аб'ектывацыя
**Objektivist** *m* аб'ектывіст
**Objektivität** *f* аб'ектыўнасць
**Ontologie** *f* анталогія
**ontologisch** анталагічны
**organisch** арганічны
**Orientierung** *f* арыентацыя; арыентаванне
**Originalsphäre** *f* арыгінальная сфера
**originär** першапачатковы, спрадвечны
**Paradoxie** *f* парадаксальнасць
**passiv** пасіўны
**Passivität** *f* пасіўнасць
**Person** *f* асоба
**personal** асабісты, персанальны; асабовы
**Personalität** *f* *гл.* Persönlichkeit
**Personenverband** *m* хаўрус асоб
**Persönlichkeit** *f* асоба, індывідуальнасць
**perzeptiv** перцэптыўны
**Phänomen** *n* феномен
**Phänomenologie** *f* фенаменалогія
**phänomenologisch** фенаменалагічны
**Phantasie** *f* фантазія; уяўленне
**Phantasiertes** *n* створанае фантазіяй
**Phantom** *n* фантом, прывід
**Philosophieren** *n* філасофстванне
**philosophisch** філасофскі
**Phoronomie** *f* форанамія, кінематыка
**physikalisch** фізічны, які адносіцца да фізікі
**physisch** фізічны, рэчыўны
**Physisches** *n* фізічнае
**physiopsychisch** фізіяпсіхічны
**Physizismus** *m* фізіцызм
**Polarisierung** *f* палярызацыя
**Polarität** *f* палярнасць
**polythetisch** політэтычны
**Position** *f* становішча
**positional** пазіцыянальны
**positiv** пазітыўны, станоўчы
**Positivismus** *m* пазітывізм
**Positivität** *f* пазітыўнасць
**Potentialität** *f* патэнцыяльнасць
**potentiell** патэнцыяльны
**Prädikat** *n* прэдыкат
**prädikativ** прэдыкатыўны
**Prädizieren** *n* прапаведаванне
**Pragmatismus** *m* прагматызм
**Praktik** *f* практычная ўжытковасць; практычныя веды

**Prämisse** *f* першапастулат; перадумова
**Praxis** *f* практыка
**Predigt** *f* казань, пропаведзь
**primär** першасны
**primordi(n)al** першародны
**prinzipiell** прынцыповы
**Protention** *f* пратэнцыя, інтэнцыя свядомасці
**psychisch** псіхічны
**Psychisches** *n* псіхічнае
**psychophysisch** псіхафізічны
**psychologisch** псіхалагічны
**Psychologismus** *m* псіхалагізм
**Qualität** *f* якасць
**qualitativ** якасны
**quantitativ** колькасны
**rational** рацыянальны
**Rationalität** *f* рацыянальнасць
**Raum** *m* прастора
**Raumding** *n* рэч у прасторы
**Raumdinglichkeit** *f* прасторава-рэчавасць
**Raumgestalt** *f* прасторавая фігура
**Raumkörperlichkeit** *f* прасторавая цялеснасць
**räumlich** прасторавы
**Räumlichkeit** *f* прасторавасць
**räumlich-zeitlich** прасторава-часавы
**Raumvorstellung** *f* прасторавае ўяўленне
**Raumwelt** *f* прасторавы свет
**real** рэальны, сапраўдны
**Reales** *n* рэальнае
**Realität** *f* рэальнасць
**real-kausal** рэальна-прычынны
**Rechtsausweisung** *f* выказванне правамоцнасці
**Reduktion** *f* рэдукцыя
**reduziert** рэдукаваны
**reell** *гл.* real
**reflektiv** рэфлексійны
**Reflexion** *f* рэфлексія, роздум
**Regel** *f* правіла; закон
**Regelung** *f* рэгуляванне, упарадкаванне
**Region** *f* абсяг, сфера
**regional** прасторава-абмежаваны; мясцовы
**reines Ich** *n* чыстае Я
**Reiz** *m* стымул; прывабнасць
**Relation** *f* адносіны
**relativ** адносны, рэлятыўны
**Relativismus** *m* рэлятывізм
**Relativität** рэлятыўнасць, адноснасць
**religiös** рэлігійны
**Reproduktion** *f* узнаўленне, рэпрадукаванне
**reproduktiv** рэпрадуктыўны
**Retention** *f* рэтэнцыя, першасная памяць (якая ўтрымлівае мінулае ў цяперашнім)
**Rückbeziehung** *f* зваротнае дачыненне
**Sache** *f* *гл.* Ding
**sachhaltig** матэрыяльна-канкрэтны

**Sachverhalt** *m* стан рэчаў
**Satz** *m* сказ, выказванне, палажэнне
**Schein** *m* ілюзія, уява
**Schema** *n* схема, мадэль, шаблон
**schematisch** схематычны
**Schicht** *f* слой, праслойка; эшалон
**schlicht** беспасярэдні, просты
**Schluss** *m* заключэнне
**Schönes** *n* прыгожае
**Schönheit** *f* прыгажосць
**Seele** *f* душа
**Seelenleben** *n* псіхічнае жыццё
**seelisch** псіхічны
**Seelisches** *n* псіхічнае
**Sehding** *n* бачная рэч
**Sehen** *n* бачанне; зрок
**Seiendes** *n* бытнае
**Sein** *n* быццё, бытнасць
**Seinscharakter** *m* характар быцця
**Seinsgeltung** *f* вартасць быцця
**Seinsglaube** *m* вера ў быццё
**Seinsmodalität** *f* мадальнасць быцця
**Seinsmodi** *pl* спосабы быцця
**Seinsphänomen** *n* феномен быцця
**Seinsregionen** *pl* абсягі быцця
**Seinssetzung** *f* пастуляванне быцця
**sekundär** другасны
**Selbstauslegung** *f* самавыяўленне
**Selbstbeobachtung** *f* інтраспекцыя
**Selbstbesinnung** *f* самарэфлексія
**Selbsteigenheit** *f* уласная самасць
**Selbsterfahrung** *f* самаўсведамленне
**Selbstgegebenheit** *f* самададзенасць
**Selbstkonstitution** *f* самастанаўленне
**Selbstwahrnehmung** *f* самаўспрыманне
**Sensualismus** *m* сэнсуалізм
**sensuell** сэнсуальны
**Setzung** *f* прызнанне наяўнасці; пастулат
**Sich-Bilden** *n* самастанаўленне
**Sich-Umbilden** *n* саматрансфармацыя
**signitiv** сігнітыўны
**Sinn** *m* сэнс; пачуццё
**Sinnending** *n* сэнсавая рэч
**Sinnengegenstand** *m* сэнсавы аб’ект
**Sinneseinheit** *f* сэнсавая адзінка
**Sinneskern** *m* сэнсавае ядро
**Sinnesorgan** *n* орган пачуццяў
**Sinnessphäre** *f* сфера пачуццяў
**Sinngebung** *f* наданне сэнсу
**sinnlich** пачуццёвы
**Sinnlichkeit** *f* пачуццёвасць
**Sitte** *f* звычай; мараль; паводзіны
**skeptisch** скептычны

**Skeptizismus** *m* скептыцызм
**Solipsismus** *m* саліпсізм
**solipsistisch** саліпсісцкі
**Sollen** *n* павіннасць, абавязак
**sozial** сацыяльны, грамадскі
**Sozialität** *f* сацыяльнасць
**soziologisch** сацыялагічны
**Sphäre** *f* сфера, абсяг, галіна
**spontan** спантан(іч)ны
**Spontaneität** *f* спантан(іч)насць
**Stellungnahme** *f* гледзішча, пазіцыя
**Stoff** *m* матэрыял
**Stoffliches** *n* матэрыяльнае, субстанцыянальнае
**Streben** *n* імкненне
**strenge Wissenschaft** *f* дакладная навука
**Stufe** *f* ступень
**Subjekt** *n* суб'ект
**subjektiv** суб'ектыўны
**Substantialität** *f* субстанцыяльнасць
**substantiell** субстанцыяльны
**Substanz** *f* субстанцыя; рэчыва
**symbolisch** сімвалічны
**syntaktisch** сінтаксічны
**Synthese** *f*, **Synthesis** *f* сінтэз; абагульненне
**synthetisch** сінтэтычны
**System** *n* сістэма
**Tätigkeit** *f* дзейнасць
**Tatsache** *f* факт
**Tatsachenwissenschaft** *f* фактalогія
**teleologisch** тэлеалагічны
**Temporalisation** *f*, **Temporalisierung** *f* тэмпаралізацыя
**thematisch** тэматычны
**theoretisch** тэарэтычны
**Theorie** *f* тэорыя, вучэнне
**These** *f*, **Thesis** *f* тэза, тэзіс
**thetisch** тэтычны
**Tiefsinn** *m* глыбакадумнасць
**Tier** *n* жывёла
**tierisch** жывёльны
**Ton** *m* тон, гук, гучанне
**total** суцэльны
**transient** пераходны, часовы, нетрывалы
**transzendent** трансцэндэнтны
**transzendental** трансцэндэнтальны
**Transzendenz** *f* трансцэндэнтнасць
**Tun** *n* спосаб дзеянняў; паводзіны
**Typik** *f* тыпалогія
**typisch** тыповы
**Typisches** *n* тыповае
**Typus** *m* тып
**Umgebung** *f* навакольнае атачэнне
**Umstände** *pl* абставіны
**Umwelt** *f* навакольны свет
**umweltlich** прыналежны да навакольнага свету
**Unbestimmtheit** *f* нявызначанасць
**Unendlichkeit** *f* бясконцасць

**universal, universell** універсальны
**Unklarheit** *f* няяснасць
**unmittelbar** непасрэдны
**Unsinn** *m* бяссэнсіца, бязглуздзіца
**Unstimmigkeit** *f* неадпаведнасць, супярэчнасць, антыномія
**Untergrund** *m* падгрунце, падмурак
**Unterlage** *f* падстава, аснова
**Unterschicht** *f* ніжні слой
**Unterschiedenes** *n* адрознае
**Unveränderung** *f* адсутнасць змянення
**Unvernunft** *f* неразумнасць
**Unwissenschaftlichkeit** *f* ненавуковасць
**Urdoxa** *f*, **Urglaube** *m* першасная вера
**Urpräsenz** *f* першапрысутнасць
**Ursprung** *m* паходжанне
**ursprünglich** першапачатковы; першабытны
**Urstiftung** *f* першастварэнне
**Urteil** *m* суджэнне
**Urteilen** *n* вынясенне суджэння
**Urteilserlebnis** *n* досвед суджэння
**vage** няпэўны, цьмяны
**Veränderliche** *f* пераменная
**Veränderung** *f* змяненне
**Verbindung** *f* злучэнне
**verborgen** прыхаваны, схаваны
**Vergangenheit** *f* мінулае
**Vergegenständlichung** *f* апрадмечванне
**vergegenwärtigend** (выразна) уяўляльны
**Vergegenständlichung** *f* (выразнае) уяўленне
**Vergehen** *n* знікненне, адміранне
**Vergemeinschaftung** *f* далучэнне да супольнасці
**Verhalten** *n* паводзіны; стаўленне
**Verhältnis** *n* стасунак
**Verkehr** *m* зносіны
**Vermeinen** *n* уяўнасць
**Vermeintes** *n* уяўнае
**Vermögen** *n* здольнасць
**Vermutetes** *n* меркаванае
**Vernunftbewusstsein** *n* рацыянальная свядомасць
**Vernunftcharakter** *m* рацыянальны характар
**Vernunfteinsicht** *f* рацыянальнае разуменне
**vernünftig** разумны, рацыянальны
**Vernünftiges** *n* разумнае, рацыянальнае
**Vernunftkritik** *f* крытыка розуму
**Vernunftmotivation** *f* рацыянальная матывацыя
**Vernunftsetzung** *f* рацыянальная пазіцыя

**Verselbstständigung** *f* незалежнае адасабленне
**Verständnis** *n* разуменне
**Verworrenheit** *f* збянтэжанасць
**Vielheit** *f* мноства
**visuell** візуальны
**Vollkommenheit** *f* дасканаласць
**vollzogen** здзейснены
**Vorerinnerung** *f* папярэдні напамін; ментальнае прадбачанне
**vorgegeben** зададзены, дадзены ад пачатку
**Vorgegebenheit** *f* зададзенасць
**Vorgegenwärtiges** *n* існае перад тым
**Vorgestelltes** *n* паказанае, выяўленае
**Vorher** *n* папярэдняе
**Vorkommnis** *n* з'ява, праява; падзея
**Vorstellung** *f* уяўленне
**Vorurteil** *m* перадузятасць
**Vorurteile** *pl* забабоны
**Vorurteilslosigkeit** *f* адсутнасць забабонаў
**vorwissenschaftlich** данавуковы
**Wahres** *n* праўдзівае
**wahrgenommen** успрыманы
**Wahrgenommenes** *n* успрынятае
**wahrhaft** праўдзівы
**Wahrheit** *f* праўда, ісціна
**Wahrnehmen** *n* працэс успрымання
**Wahrnehmung** *f* перцэпцыя, успрыманне
**Wahrnehmungsfeld** *n* поле ўспрымання
**Wahrnehmungssinn** *m* сэнс успрымання
**Wahrscheinlichkeit** *f* верагоднасць; імавернасць
**wechselnd** зменлівы
**Wechselverständigung** *f* узаемаразуменне
**Wechselverständnis** *n* узаемнае паразуменне
**Weisheit** *f* мудрасць
**Welt** *f* свет
**Weltall** *m* Сусвет
**Weltanschauung** *f* светапогляд
**Weltanschauungsphilosophie** *f* светапоглядная філасофія
**Welterfahrung** *f* сусветны досвед
**Weltzusammenhang** *m* сусветная сувязь быцця
**Wertbewusstsein** *n* каштоўнасная свядомасць
**Werte** *pl* каштоўнасці
**Werten** *n* каштоўнасная ацэнка
**wertend** ацэньвальны
**Wertheit** *f* каштоўнасны характар
**Wertobjekt** *n* вартасны аб'ект
**Wesen** *n* сутнасць, існасць; істота
**Wesenhaftigkeit** *f* істотнасць
**Wesenlosigkeit** *f* неістотнасць
**Wesensallgemeinheit** *f* сутнасная (эйдэтычная) універсальнасць

**Wesensanalyse** *f* аналіз сутнасці
**Wesensanschauung** *f* сутнасны погляд
**Wesenserkenntnis** *n* сутнаснае пазнанне
**Wesenserfassung** *f* спасціжэнне сутнасці
**Wesenserschauung** *f* *гл.* Wesensanschauung
**Wesensforschung** *f* даследаванне сутнасці
**Wesensnotwendigkeit** *f* сутнасная неабходнасць
**Wesensschauung** *f* *гл.* Wesensanschauung
**Wesensurteil** *m* сутнаснае суджэнне
**Wesenszusammenhang** *m* сутнасны кантэкст
**Widersinn** *m*, **Widersinnigkeit** *f* недарэчнасць, бязглуздзіца
**Wiedererinnerung** *f* паўторны ўспамін
**Wiederspruchslosigkeit** *f* непярэчанне
**Willen** *m* воля
**Willenssphäre** *f* сфера волі
**wirklich** сапраўдны; сапраўды
**Wirklichkeit** *f* рэчаіснасць, рэальнасць
**Wissen** *n* веданне
**wissenschaftlich** навуковы
**Wissenschaftlichkeit** *f* навуковасць
**Wissenschaftstrieb** *m* імкненне да навуковага пазнання
**Wollen** *n* хаценне
**wollend** валявы
**Wortlaut** *m* дакладны тэкст
**Zeichen** *n* знак
**Zeit** *f* час
**Zeitbewusstsein** *n* часавая свядомасць
**zeitlich** часавы
**zeitlich bestimmbar** вызначальны ў часе
**Zeitlichkeit** *f* тэмпаральнасць
**Zufälligkeit** *f* выпадковасць
**Zukunft** *f* будучыня
**Zustand** *m* стан
**Zuständlichkeit** *f* адпаведнасць пэўнаму стану
**Zuwendung** *f* скіраванне (увагі), зварот
**Zweifel** *m* сумнеў

*Склаў Л. Баршчэўскі*

# ЗМЕСТ

Філасофія як дакладная навука .................................. 5

Эдмунд Гусэрль. *Кароткая біябібліяграфічная даведка* ....................................................................88

*Андрэй Бурлуцкі*. Месца і роля філасофіі ў кантэксце фенаменалагічных доследаў Эдмунда Гусэрля ................................................90

Слоўнік найчасцей ужываных тэрмінаў і вызначэнняў філасофіі Гусэрля. *Склаў Л. Баршчэўскі* .........................................104

**Гусэрль, Э.**

Г96 Філасофія як дакладная навука / Эдмунд Гусэрль ; пер. з нямецкай Л. Баршчэўскага. — Мінск : УП «Энцыклапедыкс», 2023. — 120 с. — (Галерэя чалавечай думкі).

ISBN 978-985-7247-63-9.

Заснавальнік фенаменалогіі, аўстрыйска-нямецкі філосаф габрэйскага паходжання Эдмунд Гусэрль (1859—1938) першапачаткова вызначае філасофію як «дакладную навуку», якая з моманту свайго ўзнікнення прэтэндуе на задавальненне самых высокіх тэарэтычных запытаў і тлумачэнне любых феноменаў аб'ектыўнай рэальнасці пры дапамозе «чыстых формаў розуму». Ён тлумачыць, чаму прэтэнзіі філасофіі стаць «дакладнай навукай» аж да XX ст. не былі рэалізаваныя, і спрабуе дакладна сфармуляваць даследчыя праблемы, вызначыць метады, абгрунтаваць падмуркі тэорыі.

У якасці пасляслоўя да працы Гусэрля змешчаны артыкул сучаснага расійскага даследчыка гісторыі філасофіі Андрэя Бурлуцкага. У канцы кнігі таксама падаюцца падрыхтаваныя перакладчыкам кароткая біябібліяграфічная даведка пра аўтара працы і «Слоўнік найчасцей ужываных тэрмінаў і вызначэнняў філасофіі Гусэрля».

Адрасуецца ўсім, хто цікавіцца класічнай філасофіяй.

**ББК 87.5(4Гем)**
**УДК 123**

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Серыя «Галерэя чалавечай думкі»

**Гусэрль,** Э.

**ФІЛАСОФІЯ ЯК ДАКЛАДНАЯ НАВУКА**

Адказны за выпуск *Ігар Чакалаў*

12+

Падпісана ўдрук 26.07.2023. Фармат 84×108 $^1/_{32}$.
Папера афсетная. Друк рызаграфічны.
Ул.-выд. арк. 4,45. Ум. друк. арк. 6,30.
Наклад 55 асобнікаў. Заказ № 809.

УП «Энцыклапедыкс».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/266 ад 3.04.2014.
Вул. Кульман 21-Б, офіс 108, 220030, Мінск.

Вытворчае даччынае ўнітарнае прадпрыемства
«Друкарня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 2/18 ад 26.11.2013.
Пл. Свабоды, 23-103, 220030, г. Минск.